**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

*Установа адукацыі*
*“Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”*

Витебский государственный технологический университет

***В.Я. Бездзель***

# ДЗЕЦІ НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1941 – 1944)

Пад навуковай рэдакцыяй У.К. Коршука

**Віцебск**
**2013**

УДК 94(476)−53.2”1941 – 1944”(043)
ББК 63.3(2)622
Б 39

**Рэцэнзенты:**

Дулаў А. М., загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. П.М. Машэрава”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

Грэбень Я. А., загадчык кафедры філасофіі і гісторыі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

Рэкамендавана да выдання рэдакцыйна-выдавецкім саветам УА «ВДТУ», пратакол № 1 ад 14.02.2013.

**Бездзель, В. Я.**

**Б 39** Дзеці на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941 – 1944) : манаграфія / В. Я. Бездзель. – Віцебск : УА “ВДТУ”, 2013. – 157 с.

ISBN 978-985-481-298-4

Манаграфія прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. Аўтар комплексна разглядае нацысцкую палітыку генацыду дзіцячага насельніцтва Беларусі, ажыццяўленне германізацыі падрастаючага пакалення, прыцягненне яго да выканання працоўнай павіннасці, а таксама вываз на прымусовую працу ў Германію. Выразна паказана ўзаемасувязь мерапрыемстваў акупантаў у сацыяльнай сферы і месца дзяцей ў акупаваным грамадстве, змяненне статуса дзіцяці, яго хуткае сталенне. Адлюстраваны і другі бок жыцця дзяцей пад акупацыяй: іх дапамога дарослым у антыфашысцкай барацьбе, побыт у лагерах для грамадзянскага насельніцтва і партызанскіх зонах.

Для навукоўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў гуманітарных факультэтаў ВНУ, а таксама ўсіх, хто цікавіцца беларускай гісторыяй.

**УДК 94(476)−53.2”1941 – 1944”(043)**
**ББК 63.3(2)622**

**ISBN 978-985-481-298-4**

© Бездзель В. Я., 2013
© УА «ВДТУ», 2013

Витебский государственный технологический университет

## Змест

**Спіс скарачэнняў** 4

**Уводзіны** 5

**Раздзел 1.** Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія даследавання 8
1.1 Гістарыяграфія праблемы 8
1.2 Агляд крыніц 18
1.3 Метадалогія даследавання 21

**Раздзел 2.** Палітыка германскіх улад у адносінах да дзяцей на акупаванай тэрыторыі Беларусі 23
2.1 Асноўныя накірункі палітыкі нацыстаў у дачыненні да дзяцей 23
2.2 Мерапрыемствы акупантаў у сацыяльнай і працоўнай сферах і іх наступствы для падрастаючага пакалення 35
2.3 Дзіцячыя дамы, сады, яслі ва ўмовах акупацыі 58

**Раздзел 3.** Удзел дзяцей у антыфашысцкай барацьбе 74
3.1 Выратаванне і выхаванне дзяцей партызанамі і падпольшчыкамі 74
3.2 Накірункі і формы барацьбы дзяцей 88

**Заключэнне** 107

**Спіс выкарыстаных крыніц** 110

**Дадатак** 136

Витебский государственный технологический университет

## Спіс скарачэнняў

БГТО – Будь готов к труду и обороне
БНС – Беларуская народная самапомач
БПС – Беларуская самапомач
БШПР – Беларускі штаб партызанскага руху
ГАБ – Генеральная акруга Беларусь
ГКБ – Генеральны камісарыят Беларусі
г.н. – год нараджэння
ГСО – Готов к санитарной обороне
ГТО – Готов к труду и обороне
н.г. – навучальны год
НАРБ – Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь
ПВХО – противовоздушная химическая оборона
СБМ – Саюз беларускай моладзі
ЦК КП(б)Б – Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі
ЦК ЛКСМБ – Цэнтральны камітэт Ленінскага камуністычнага саюзу моладзі Беларусі

Витебский государственный технологический университет

## Уводзіны

Вялікая Айчынная вайна ўвайшла ў гісторыю беларускага народа як небывалы па жорсткасці, трагізму і гераізму перыяд барацьбы. Яна закранула кожную беларускую сям'ю, кожнага чалавека, незалежна ад полу і ўзросту. Па гэтай прычыне падзеі 1941 – 1945 гг. займаюць значнае месца ў калектыўнай памяці беларускага народа.

Ваенная праблематыка не губляе сваёй актуальнасці, тым больш, што шэраг праблем і аспектаў гісторыі Беларусі 1941 – 1945 гг. застаюцца недастаткова распрацаванымі і вывучанымі. Традыцыйна, яшчэ з савецкіх часоў, у першую чаргу асвятляліся партызанская і падпольная барацьба ў германскім тыле, праблемы, звязаныя з паказам жорсткасці акупацыйнага рэжыму, палітыкай генацыду, эксплуатацыяй гаспадаркі і рэсурсаў Беларусі, рабаваннем каштоўнасцей. Шмат публікацый было прысвечана ходу ваенных дзеянняў, аналізу наступальных аперацый Чырвонай Арміі.

На працягу доўгага часу за рамкамі гістарычных даследаванняў заставаліся праблемы жыццядзейнасці асобных груп грамадства ва ўмовах акупацыі, уздзеяння экстрэмальнага становішча вайны на гэтыя групы, іх роля ў барацьбе з ворагам. Змена метадалагічных парадыгмаў у канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг., пашырэнне доступу да архіўных матэрыялаў дазволілі прыступіць да разгляду новых, раней закрытых тэм Вялікай Айчыннай вайны. Вывучэнне гісторыі асобных сацыяльных груп і ацэнка іх месца ў перамозе над фашызмам далі магчымасць больш аб'ектыўна разгледзець ролю моладзі, інтэлігенцыі, жанчын у сацыяльна-эканамічных, ваенна-палітычных працэсах на тэрыторыі Беларусі. Тэндэнцыя да "ачалавечвання" гісторыі вайны садзейнічала звяртанню да ўспрыняцця падзей акупацыі на індывідуальна-асабістым узроўні прадстаўнікоў розных груп грамадства.

Антрапалагічны паварот ў гістарычнай навуцы даў магчымасць навукоўцам пераасэнсаваць традыцыйны падыход да некаторых тэм Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку да тэмы "дзеці і вайна", якая разглядалася ў савецкай гістарыяграфіі пераважна ў кантэксце гераічнай барацьбы савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Разам з тым, менавіта ў гістарычных працах таго перыяду быў паказаны масавы характар дзіцячага супраціўлення, аналагаў якому ў гісторыі да гэтага часу не было.

Сучасная беларуская гістарыяграфія надае адпаведную ўвагу вывучэнню функцыянавання дзіцячых устаноў на акупаванай тэрыторыі Беларусі, становішча ў іх дзяцей, палітыцы анямечвання ў сферы адукацыі, знішчэння падрастаючага пакалення нацыстамі. Аднак адсутнічаюць працы, у якіх бы аналізаваліся накірункі палітыкі гітлераўцаў у адносінах да дзяцей і іх практычная рэалізацыя, наступствы для падрастаючага пакалення тых мерапрыемстваў, якія

Витебский государственный технологический университет

праводзіліся акупацыйнымі ўладамі ў сацыяльнай, працоўнай сферах, пытанні нараджальнасці і смяротнасці дзяцей, дзейнасць партызан і падпольшчыкаў па захаванні жыцця дзяцей у складаных умовах вайны.

Разгляд працэсаў ранняга сталення дзяцей, сацыялізацыі ў дарослае грамадства дазваляе ўбачыць не толькі гераічны бок жыцця дзяцей, але і вялікую трагедыю. Разам з дарослымі яны вымушаны былі змагацца за ўласнае выжыванне, хаця ні псіхалагічна, ні фізічна не былі да гэтага падрыхтаваны. Як сведчаць псіхолагі, новаўтварэнні, якія закладваюцца ў перыяд дзяцінства, маюць нязменнае значэнне для далейшага развіцця здольнасцей і фарміравання асобы. З вайны "выйшлі" людзі, у якіх не было дзяцінства, у многіх і юнацтва, людзі з падарваным фізічным і псіхічным здароўем.

Дэталёвае і комплекснае даследаванне становішча дзяцей ва ўмовах фашысцкай агрэсіі з'яўляецца актуальным, паколькі з тэрыторыі Беларусі паспелі вывезці ў тыл каля 15 % дзяцей да 16 гадоў. Астатнія былі вымушаны разам з дарослымі пераносіць усе цяжкасці акупацыі. Рэалізацыя германскімі ўладамі, мясцовай дапаможнай адміністрацыяй, калабарантамі палітыкі германізацыі і вынішчэння дзяцей розных узростаў і нацыянальнасцей, якую прыкрывалі лозунгамі "вызвалення СССР і БССР ад бальшавізму", дазваляе гаварыць пра іх непасрэдную адказнасць за невыносныя умовы жыцця дзяцей, за разбураныя сем'і, за маштаб генацыду беларускага насельніцтва. Аналіз асноўных напрамкаў дзейнасці германскіх фашыстаў у дачыненні да падрастаючага пакалення дазваляе гаварыць пра наяўнасць спецыяльнай праграмы анямечвання славянскіх, у тым ліку беларускіх дзяцей як на акупаваных землях, так і ў Германіі. Выкарыстанне гітлераўцамі спецыяльнага тэрміна "бандэн кіндэр" падкрэслівае існаванне для акупантаў дадатковай праблемы ў выглядзе падрастаючага пакалення, што патрабавала правядзення спецыяльнай палітыкі, якая рэгламентавала б розныя сферы яго жыцця. Становішча дзяцей у гады Вялікай Айчыннай вайны характарызавалася іх уключанасцю ў барацьбу з ворагам, што было нечаканым фактам для саміх акупантаў. Дапамога дзяцей партызанам і падпольшчыкам садзейнічала дасягненню Перамогі СССР над агрэсарам.

У даследаванні тэмы намі выкарыстаны пэўныя тэрміны, і, каб пазбегнуць разыходжанняў у іх разуменні, патлумачым асноўныя з іх.

**Дзеці** (юрыд.) – асобы, якія не дасягнулі паўналецця [27, с. 95].

**Дзяцінства** – этап развіцця чалавека, які папярэднічае перыяду "даросласці" [27, с. 108]. У педагогіцы і псіхалогіі няма агульнапрызнанай тэорыі аб узроставых межах дзяцінства. Тым не менш, адной з найбольш распаўсюджаных з'яўляецца градацыя перыядаў дзяцінства на падставе тыпу дзейнасці дзяцей: перыяд немаўляцтва (ад нараджэння да 1 года), ранняе дзяцінства (ад 1 да 3



Витебский государственный технологический университет

гадоў), дашкольны (ад 3 да 6 – 7 гадоў), малодшы школьны (ад 6 – 7 да 11 – 12 гадоў), падлеткавы (ад 11 – 12 да 15 гадоў) і старэйшы школьны ўзрост (ад 15 да 17 гадоў) [157, с. 34].

Такім чынам, абапіраючыся на дадзеную класіфікацыю, вызначым узроставыя межы разглядаемай сацыяльнай групы з улікам спецыфікі гістарычнага даследавання: пад дзецьмі мы будзем мець на ўвазе асоб, пачынаючы з 1927 года нараджэння. Гэта значыць, што на момант вызвалення тэрыторыі Беларусі ў 1944 г. ім было не больш за 16 – 17 гадоў. Асобы 1926 г.н. і старэйшыя за іх складаюць наступную ўзроставую групу – моладзь. У гісторыі Вялікай Айчыннай вайны яны з'яўляліся прадстаўнікамі франтавога пакалення (ваявалі ў радах Чырвонай Арміі), асновай партызанскага і падпольнага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Пры напісанні манаграфіі аўтар ставіў сваёй мэтай раскрыццё асноўных накірункаў і наступстваў нацысцкай палітыкі ў адносінах да падрастаючага пакалення, вызначэнне месца дзіцячага супраціўлення ў народнай антыфашысцкай барацьбе.

Для дасягнення пастаўленай мэты вырашаліся наступныя задачы:

1. Акрэсліць асноўныя накірункі палітыкі нацыстаў у дачыненні да дзяцей, выявіць іх практычную рэалізацыю.
2. Прааналізаваць мерапрыемствы акупацыйных улад у сацыяльнай і працоўнай сферах і іх наступствы для падрастаючага пакалення.
3. Раскрыць прызначэнне і функцыі дзіцячых устаноў, што дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі.
4. Паказаць дзейнасць партыйных і камсамольскіх органаў, партызан па захаванні жыцця дзяцей, іх забеспячэнні, выхаванні.
5. Вызначыць ролю дзяцей у партызанскай і падпольнай барацьбе, накірункі і формы ўдзелу дзяцей у супраціўленні.

**Аб'ект** даследавання – гісторыя Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (1941 – 1944 гг.). **Прадмет** даследавання – становішча дзяцей на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Витебский государственный технологический университет

## Раздзел 1. Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія даследавання

### 1.1 Гістарыяграфія праблемы

Літаратуру па гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку і па пытаннях становішча дзяцей, іх барацьбы на акупаванай тэрыторыі, можна аднесці да двух храналагічных перыядаў: савецкага (артыкулы і манаграфіі ад перыяду вайны і да ўтварэння Рэспублікі Беларусь) і сучаснага (літаратура, выдадзеная пасля ўтварэння суверэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь). Такі падзел абумоўлены характэрнымі для кожнага перыяду метадалагічнымі прынцыпамі, якіх прытрымліваліся даследчыкі. Абвяшчэнне незалежнай Беларусі, адыход ад безальтэрнатыўнай трактоўкі гістарычнага працэсу, пранікненне у гістарычную навуку новых метадалагічных падыходаў адкрылі новыя магчымасці ў вывучэнні падзей 1941 – 1945 гг.

Збор і назапашванне фактычнага матэрыялу па гісторыі вайны пачаліся непасрэдна ў ходзе ваенных дзеянняў. На старонках перыядычнага друку змяшчаліся дакументы, паведамленні пра зверствы фашыстаў на акупаваных савецкіх тэрыторыях, поспехі партызан і Чырвонай Арміі, акты, складзеныя па фактах распраў над насельніцтвам, у тым ліку і над дзецьмі. Працай па зборы дакументаў кіравала Надзвычайная дзяржаўная камісія па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў і прычыненых імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР, створаная паводле Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 лістапада 1942 г. Часткова гэтыя дакументы былі апублікаваны ў 1943 г. у зборніку “Нічога не забудзем, нічога не даруем. Дакументы аб зверствах нямецкіх акупантаў на Беларусі”, які і сёння з’яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі вайны. У ім змешчаны акты з указаннем месц фізічнага знішчэння людзей, колькасці забітых [258].

Газетныя публікацыі насілі перш за ўсё прапагандысцкі характар. Іх асноўнай мэтай была мабілізацыя насельніцтва на барацьбу з ворагам. У шэрагу публікацый падобнага тыпу асвятляліся адукацыйная палітыка нацыстаў, выкрываліся яе сапраўдныя мэты (анямечванне беларускіх дзяцей), прыводзіліся звесткі аб рабоце савецкіх школ у тыле ворага [28; 286].

Пытанні ўдзелу дзяцей у антыфашысцкай барацьбе ўскосна закраналіся ў зборніках “Моладзь у баях за Радзіму”, “Молодежь Белоруссии борется”, дзе падкрэслівалася прыналежнасць старэйшых школьнікаў і моладзі да камсамольскай арганізацыі, адданасць Радзіме і партыі [174; 125]. Дадзеныя выданні, падрыхтаваныя ЦК КП(б)Б, рассылаліся па партызанскіх атрадах і прызначаліся для распаведу пра



Витебский государственный технологический университет

подзвігі камсамольцаў і падняцця баявога духу змагароў. У іх змяшчалася інфармацыя пра барацьбу дзяцей на тэрыторыі Беларусі.

Такім чынам, у ваенныя гады вялася праца па зборы факталагічнага матэрыялу, дакументаў, што пазней сталі базай для правядзення навуковых даследаванняў па пытаннях акупацыі і супраціўлення на тэрыторыі Беларусі.

У якасці самастойнай тэма "дзеці і вайна" выступала пры зборы ўспамінаў удзельнікаў вайны з наступнай іх літаратурнай апрацоўкай. Менавіта ў сувязі з гэтым зацікавіліся і ўспамінамі дзяцей як сведкаў падзей 1941 – 1945 гг. 3 красавіка 1946 г. у газеце "Піянер Беларусі" быў надрукаваны ліст піянераў адной з мінскіх школ, у якім яны звярталіся да ўсіх школьнікаў рэспублікі з прапановай напісаць калектыўную кнігу пра ўдзел беларускіх дзяцей у Вялікай Айчыннай вайне. Сабраны матэрыял – амаль 400 апавяданняў – выйшаў зборнікам "Ніколі не забудзем: раcказы беларускіх дзяцей аб днях Вялікай Айчыннай вайны" [257]. Асноўная ўвага ў кнізе надавалася гераічнай барацьбе дзяцей з ворагам, мужнасць у час допытаў і катаванняў. Малыя актыўна выкарыстоўвалі такія словы, як "гад", "фрыц", "мярзотнік", "акупант" і г.д., што характарызавала ўплыў пазіцыі дарослых на ўспрыняцце дзецьмі ваенных падзей, а таксама глыбіню трагедыі і гора, якія прынесла вайна ў іх жыццё. Уласна ўспаміны накладваліся ў дзіцячай свядомасці на маральныя нормы савецкага грамадства, уяўленні дарослых. Гэта кніга на працягу існавання СССР перавыдавалася 8 разоў, што сведчыць пра яе значнасць у справе выхавання падрастаючага пакалення.

У 1940-ых – пачатку 1950-ых гг. працягвалася назапашванне дакументальнага матэрыялу. Так, вынікам працы Надзвычайнай камісіі стаў зборнік дакументаў пра злачынствы нацыстаў [302]. Апрацоўка гэтых дакументаў дазволіла даследчыкам удакладніць агульную карціну страт, панесеных краінай. Звесткі камісіі дапоўнілі матэрыялы судовых працэсаў над вінаватымі ў злачынствах, што праходзілі па ўсёй тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ў 1946 г. у Мінску [309]. У іх змяшчаліся прызнанні акупантаў у зверствах над мірным насельніцтвам, у тым ліку і над дзецьмі. Упершыню была агучана агульная лічба людскіх стратаў беларусаў – 2 млн. 200 тыс. чалавек, 396 тыс. вывезеных на прымусовыя работы. З'явіліся асобныя публікацыі, у якіх аналізавалася школьная палітыка як акупантаў, так і савецкага боку [316; 301; 169], рабіліся першыя спробы пастаноўкі праблемы, была пашырана гістарыяграфічная і крыніцазнаўчая базы даследавання.

У другой палове 50-ых гг. XX ст. убачылі свет навуковыя працы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якія характарызаваліся больш высокім навуковым ўзроўнем, пашыранай базай крыніц і, адначасова, тэндэнцыяй да паказу кіруючай ролі камуністычнай партыі ў



Витебский государственный технологический университет

арганізацыі падпольнага і партызанскага руху, дасягненні перамогі над фашыстамі. Так, П.П. Ліпіла ў сваёй працы ўпершыню ўвёў у навуковы ўжытак лічбавы і фактычны матэрыял, які сведчыў пра эвакуацыю чалавечых і матэрыяльных рэсурсаў з тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і дзіцячых устаноў, іх размяшчэнне ў савецкім тыле [163]. У яго даследаванні некалькі старонак прысвечана гераічнай барацьбе піянераў супраць захопнікаў на прыкладзе подзвігаў М. Казея, К. Гойшыка і інш. Гэтыя звесткі аўтар выкарыстаў для паказу ўсенароднага характару барацьбы беларускага народа. Разам з тым, інфармацыя мела апісальны характар.

У кнізе былога інструктара ЦК ЛКСМБ Р.Ц. Аблавай, якая прымала непасрэдны ўдзел у супраціўленні, на падставе разнастайнага фактalaгічнага матэрыялу быў паказаны працэс зараджэння і развіцця маладзёжнага руху, апісана баявая дзейнасць моладзі [1]. Як і ў папярэднім даследаванні, дзіцячае супраціўленне разглядалася на прыкладзе дзейнасці асобных піянераў. Тым не менш, аўтарка канстатавала факт удзелу дзяцей і падлеткаў у партыйным, камсамольскім падполлі, паказала ролю камсамола ў кіраўніцтве падпольнымі піянерскімі арганізацыямі, такімі, да прыкладу, як "Піянерскі тайнік". Названыя работы П.П. Ліпілы і Р.Ц. Аблавай вызначылі агульны накірунак, у кантэксце якога на працягу наступных дваццаці гадоў разглядалася дзіцячая праблематыка: гераічная барацьба дзяцей пад кіраўніцтвам партыі і камсамола як арганізатараў партызанскага і падпольнага руху. Значэнне гэтых работ заключаецца ў тым, што сталі вядомы факты дзейнасці асобных піянераў-патрыётаў, былі названы іх імёны – тым самым была закладзена база для далейшага вывучэння ўдзелу дзяцей у антыфашысцкай барацьбе.

60 – 80-я гады XX ст. у савецкай гістарыяграфіі вызначыліся сапраўдным прарывам па колькасці навуковай і навукова-папулярнай літаратуры, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне. Адбылося далейшае пашырэнне праблематыкі, павышэнне якаснага ўзроўню даследаванняў. Пацвярджэннем гэтага стаў выхад абагульняльных прац. Літаратуру, у якой у той ці іншай ступені закранaлася дзіцячая праблематыка, можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Да першай групы адносяцца работы, прысвечаныя непасрэдна тэме "дзеці і вайна" – супраціўленне піянераў і школьнікаў акупантам, адукацыйная палітыка нацыстаў, мерапрыемствы партызан і падпольшчыкаў па супрацьдзеянні палітыцы анямечвання, гісторыя дзетдамоў. Другая група – гэта навуковыя працы абагульняльнага характару, у якіх разглядаліся праблемы генацыду насельніцтва, акупацыйны рэжым і яго наступствы, партызанская і падпольная барацьба. Гэтыя працы цікавыя тым, што ў іх ёсць звесткі пра асобныя аспекты жыцця дзяцей пад акупацыяй, як правіла, удзел у

Витебский государственный технологический университет

антыфашысцкай барацьбе і знішчэнне дзяцей як асновы беларускай нацыі.

Першая група даследаванняў прадстаўлена працамі як навуковага, так і навукова-папулярнага характару. Сярод першых неабходна вылучыць кандыдацкую дысертацыю П.М. Кобрынца “Школа, учитель и учащиеся Белоруссии в период Великой Отечественной войны (1941 – 1945 гг.)” [143]. Асноўнай тэмай шэрагу яго навуковых прац, у тым ліку і дысертацыйнай, стаў патрыятызм навучэнцаў і настаўнікаў у гады вайны. Вытокі масавага ўдзелу вучняў у антыфашысцкай барацьбе аўтар бачыць у даваенным выхаванні дзяцей, якое грунтавалася на прынцыпах уключанасці піянераў у грамадскае жыццё, узаемападтрымкі і калектывізму.

У 1980-ых гг. пашыраецца дыяпазон вывучэння дзіцячай і маладзёжнай праблематыкі. Вынікам стала калектыўная праца С.А. Умрэйкі, А.І. Залескага і П.М. Кобрынца “Патриотизм учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фашистских оккупантов” [315]. Выкарыстоўваючы архіўныя матэрыялы, аўтары не толькі дастаткова поўна раскрылі змест адукацыйнай палітыкі акупантаў у Беларусі, але і значную ўвагу надалі пытанням дзіцячага супраціўлення, стварэння і дзейнасці падпольных піянерскіх атрадаў, змаганню асобных піянераў. У навуковы ўжытак быў уведзены малавядомы матэрыял пра тайнае навучанне дзяцей па савецкіх падручніках і праграмах у населеных пунктах, якія кантраляваліся акупантамі. Аўтары падкрэслівалі, што большасць вучняў і настаўнікаў у гады вайны займалі патрыятычную пазіцыю, выступалі супраць захопнікаў, змагаліся ў партызанскіх атрадах і падпольных групах. Даследчыкі прааналізавалі навучальны працэс і пазашкольную працу з дзецьмі ў партызанскіх зонах, вызначылі іх асноўныя задачы і прынцыпы.

Праблему заснавання савецкіх школ у тыле ворага і вызначальную ролю камсамольскіх арганізацый у гэтым працэсе разгледзелі ў сваёй працы Я.К.Новік і У.І. Навіцкі [259]. Аўтары закранулі такія аспекты, як навучанне дзяцей у партызанскіх зонах, тайнае навучанне, праца піянерскай арганізацыі, падкрэслілі іх важнае значэнне ў жыцці падлеткаў у гады вайны.

У работах, прысвечаных гісторыі піянерскай арганізацыі Беларусі [41; 129; 273], у тым ліку і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, разглядаецца ўзброеная і няўзброеная барацьба дзяцей супраць акупантаў, стварэнне, дзейнасць і лёс падпольных піянерскіх атрадаў. Аўтары выкарыстalі багаты фактaлагічны матэрыял пра подзвігі піянераў, якія сведчылі пра іх маральна-валявыя якасці. Работы прызначаліся ў першую чаргу для выхаваўчых мэт, матэрыял выкладаўся ў публіцыстычным стылі. Выхаваўчым мэтам адпавядалі



Витебский государственный технологический университет

такія зборнікі навукова-папулярнага характару, як “Дзеці-героі”, “Піянеры-героі” [53; 291].

У работах па вывучэнні дзейнасці падполля ў асобных рэгіёнах Беларусі супраціўленне дзяцей разглядалася ў кантэксце агульнанароднай барацьбы. Разам з тым, аўтары ўводзілі ў навуковы ўжытак новыя імёны, назапашвалі матэрыял па гісторыі кожнай вобласці [292; 287; 266].

Як бачым, у 1960-я – 1980-я гады ў асвятленні дзіцячай праблематыкі пераважала тэма гераічнай антыфашысцкай барацьбы. За гэты перыяд было выдадзена 38 найменняў кніг, прысвечаных разглядаемай праблеме. З агульнай колькасці ў кнігах 16 найменняў разглядаюцца подзвігі асобных піянераў (напрыклад, М. Казея, Л. Герасіменка, Н. Багданавай і інш.), кнігі яшчэ 13 найменняў – гэта зборнікі апавяданняў публіцыстычнага характару пра гераізм беларускіх дзяцей-піянераў і іх дапамогу партызанам і падпольшчыкам [Падлічана па: 9].

Некаторая колькасць публікацый была прысвечана працоўнаму подзвігу дзяцей у савецкім тыле, а таксама выхаванню ў армейскіх часцях, так званым “сынам палкоў” [29; 39; 267]. Гераізацыя тэмы прасочвалася нават у назвах работ, дзе выкарыстоўвалася адпаведная лексіка: “гаўрошы”, “па сігналу трывогі”, “малыя героі вялікай вайны”. Акцэнт рабіўся на патрыятызме падрастаючага пакалення, і тым самым выцясняліся на другі план пакуты, страта бацькоў, трагедыя дзіцячага насельніцтва ў гады вайны. Паступова ў свядомасці пасляваеннага беларускага грамадства фарміраваліся гераічныя ўяўленні пра Беларусь як “краіну-партызанку”, абагулены вобраз піянера-змагара, які знайшоў сваё ўвасабленне ў подзвігу Марата Казея.

Выйшлі ў свет тэматычныя зборнікі пра подзвігі піянераў у розных рэгіёнах Беларусі [45; 318; 323], аўтары якіх, ужо пасталелыя “дзеці вайны”, займаліся пошукам невядомых герояў, што прынялі ўдзел у барацьбе з фашызмам. Да гэтай групы работ можна аднесці і дакументальныя аповесці пра змаганне дзяцей у падполлі [310]. Напісаныя ў форме нарысаў, такія работы карысталіся папулярнасцю сярод чытачоў.

У гэты перыяд з’явілася тэндэнцыя да вывучэння гісторыі асобных дзіцячых устаноў, што засталіся на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Адным з першых гэта пытанне ўзняў В.Д. Кармазін, які зацікавіўся Дамачаўскім дзетдомам, знішчаным гітлераўцамі ў 1942 г. [139; 140]. Такім чынам, можна адзначыць пашырэнне праблематыкі ў вывучэнні тэмы “дзеці і вайна”, але гэтым работам бракавала навуковасці і крыніцазнаўчай базы.

У навуковай літаратуры 1960 – 1980-ых гг., якая складала другую групу, яскрава вызначыліся некалькі прыярытэтных накірункаў



Витебский государственный технологический университет

даследаванняў: партызанская і падпольная барацьба, акупацыйны рэжым і яго наступствы для краіны. Для работ, прысвечаных руху супраціўлення, характэрны паказ вядучай ролі камуністычнай партыі як ідэйнага арганізатара барацьбы [161; 271], дзейнасць камсамола па стварэнні ўмоў і рэалізацыі тайнага навучання дзяцей, ідэалагічная работа сярод іх [272]. У шэрагу прац асвятляліся праблемы забеспячэння партызанскага руху, жыццядзейнасці насельніцтва ў партызанскіх зонах, іх функцыянаванне [124; 325]. Важнай з'явай у беларускай гістарыяграфіі стала доктарская дысертацыя В.Ф. Раманоўскага "Немецко-фашистская оккупационная политика и ее крах в Белоруссии", у якой на аснове значнага факталагічнага матэрыялу аўтар паспрабаваў ахарактарызаваць усе праявы акупацыйнага рэжыму: генацыд насельніцтва, функцыянаванне канцлагераў, эканамічную палітыку, дзейнасць мясцовай адміністрацыі [297].

Значны фактычны матэрыял пра становішча дзяцей прадстаўлены ў калектыўных абагульняльных працах, падрыхтаваных Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, Інстытутам гісторыі АН БССР [32; 33; 34; 35; 36; 37; 38; 43; 178], якія з'яўляліся цэнтрамі па арганізацыі даследаванняў і вывучэнні гісторыі вайны. Работы вызначаліся грунтоўнасцю і з'явіліся спробай комплекснага разгляду акупацыйнага рэжыму і антыфашысцкай барацьбы на аснове архіўных крыніц. Яны ўтрымліваюць пэўную інфармацыю пра мэты і задачы палітыкі нацыстаў у адносінах да падрастаючага пакалення, перш за ўсё ў галіне адукацыі, факты знішчэння дзяцей у канцлагерах і час карных экспедыцый.

Змены ў грамадска-палітычным жыцці другой паловы 1980-ых гг., "перабудова" закранулі і гістарычную навуку. Даследчыкі звярнуліся да не закранаемых раней аспектаў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, імкнучыся паказаць унутраны свет чалавека. Так, С. Алексіевіч засяродзіла ўвагу на адчуваннях непаўналетніх сведкаў акупацыі [3]. Трэба ўлічваць, што запіс успамінаў ажыццяўляўся са слоў ўжо не дзяцей, а дарослых людзей, якія ў вайну знаходзіліся ва ўзросце ад 5 да 14 гадоў. За гэты час некаторыя падзеі забыліся ці ўяўляліся па-іншаму, на чалавека паўздзейнічалі ідэалогія, стэрэатыпы грамадства, адбылося пераасэнсаванне падзей пад уплывам набытага вопыту. Прасочваецца і пазіцыя самога аўтара, у якога пры інтэрв'юіраванні былі свае мэты і задачы: засяродзіць увагу на тым, чаго не паказвалі ў савецкіх зборніках ўспамінаў (дзіцячыя перажыванні, цяжкасці, жаданне выжыць, нечаканасць вайны і г.д.). Аналізуючы матэрыял, можна прасачыць, які лёс быў наканаваны фашыстамі падрастаючаму пакаленню (выкарыстанне ў якасці рабочай сілы, як матэрыял для медыцынскіх вопытаў, вываз у Германію), а таксама дзіцячае супраціўленне,

Витебский государственный технологический университет

рэканструяваць некаторыя аспекты штодзённага жыцця дзяцей на акупаванай тэрыторыі.

У канцы 1980-ых гг. убачыла свет кніга “Дети военной поры”, якая ўяўляе сабой збор журналісцкіх артыкулаў публіцыстычнага характару розных аўтараў, што зацікавіліся тэмай аднаўлення страчаных роднасных сувязяў, у першую чаргу пошуку дзецьмі бацькоў і наадварот [51]. Не абышлі ўвагай аўтары і тэму гераічнай барацьбы дзяцей супраць захопнікаў. Успаміны дзяцей выступаюць не ў якасці самастойнага тэксту, а падаюцца аўтарамі як цытаты. Асоба сведкі вайны бачыцца праз пазіцыю карэспандэнта, яго ідэю, мастацкую задуму твора.

Аналіз літаратуры па дзіцячай праблематыцы дазваляе выдзеліць наступныя характэрныя рысы савецкай гістарыяграфіі:

1. Даследаванні будаваліся з улікам асаблівасцей Беларусі як “партызанскай рэспублікі”. Прадметам многіх манаграфій і дысертацый станавілася роля Кампартыі ў арганізацыі партызанскай і падпольнай барацьбы ў тыле ворага, гераічны ўдзел камсамола ў супраціўленні [322, с. 26]. Найбольшае асвятленне атрымала тэма гераізму дзяцей, якія актыўна дапамагалі партызанам і падпольшчыкам. Многае было зроблена па выяўленні матэрыялаў пра дзяцей-герояў, паказу масавага характару дзіцячага руху.

2. Аўтарамі амаль не закраналіся праблемы выжывання дзяцей як на акупаванай тэрыторыі, так і прымусова вывезеных за межы Беларусі. У пасляваенны час, пасля рэпатрыяцыі, да многіх з іх адносіліся з недаверам. Фактычна ўсё жыццё такія дзеці насілі кляймо падазронасці. Пытанні, звязаныя з остарбайтарамі, увогуле не ўздымаліся ў савецкай гістарыяграфіі, адпаведна не звярталіся і да вывучэння лёсаў дзяцей-остарбайтараў.

3. У савецкай гістарыяграфіі не ставілася пытанне пра вызначэнне колькасці загінуўшых на тэрыторыі Беларусі за час акупацыі дзяцей і тых, хто знаходзіўся ў дзіцячых дамах, колькасці дзяцей-остарбайтараў.

Якасна новы этап у гістарыяграфіі пачаўся на мяжы 80-90-ых гадоў XX ст. і быў звязаны з адыходам ад класавай трактоўкі гістарычнага мінулага, пранікненнем у беларускую навуку новых метадалагічных накірункаў. Такія падзеі абумовілі з’яўленне ў навуковым ужытку недаступных раней крыніц, пашырэнне тэматыкі даследаванняў, у тым ліку і за кошт тых тэм, якія былі “закрытымі” для гісторыкаў. Паварот да антрапалагізацыі гістарычнай навукі спрыяў вывучэнню ролі асобных сацыяльных груп у падзеях 1941 – 1944 гг., але комплекснага даследавання становішча дзяцей ва ўмовах германскай акупацыі, іх удзелу ў руху супраціўлення праведзена не было. Аднак некаторыя аспекты знайшлі сваё адлюстраванне ў кантэксце аналізу асобных пытанняў гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



Витебский государственный технологический университет

З’явіліся артыкулы, прысвечаныя менавіта дзіцячай праблематыцы. Гэтае пытанне ў шэрагу публікацый разгледзелі А.І. Котаў, Л.А. Осіпава [147; 148; 149; 270]. Аўтары паспрабавалі акрэсліць уплыў акупацыйнай палітыкі на дзяцей, паказаць складанасць становішча, у якім яны апынуліся ўжо ў самым пачатку вайны, нечалавечыя ўмовы, створаныя нацыстамі, іх барацьбу і гераізм. Але ў рамках некалькіх публікацый цалкам асвятліць разглядаемую праблему было немагчыма. Гісторыю дзіцячых дамоў, іх стан і забеспячэнне выхаванцаў прааналізаваў У.П. Паўлаў [285]. Даследчык выкарыстаў не толькі архіўныя крыніцы і матэрыялы друку, але і ўспаміны сведкаў, што надало рабоце грунтоўнасць і эмацыянальнасць. Аналізу адукацыйнай палітыкі акупантаў на беларускіх землях прысвечана дысертацыйнае даследаванне і манаграфія М.Г. Жылінскага [120; 121]. Становішча дзяцей пад акупацыяй разглядалася аўтарам у кантэксце мерапрыемстваў па германізацыі, іх наступстваў для дзяцей, а таксама ідэалагічнай барацьбы партызан і падпольшчыкаў за падрастаючае пакаленне. Трагічны лёс дзяцей, якія ўдзельнічалі ў абароне Брэсцкай крэпасці, прасачыла А.А. Грабёнкіна. Пералічаныя працы істотна дапаўняюць звесткі па тэме “дзеці і вайна”.

З літаратуры навукова-публіцыстычнага жанру хацелася б адзначыць кнігу ўспамінаў М. Кузняцова, былога малалетняга вязня, выхаванца дзетдома “Дразды” [155]. Праца стала спробай аўтара асэнсаваць тое, што з ім адбылося з пазіцыі не толькі сведкі, але і доктара-псіхіятра. Многія аспекты штодзённага жыцця выхаванцаў дзетдома аналізуюцца з прафесійнага пункту гледжання. Такая пазіцыя дазволіла даследчыку зразумець змены, што адбыліся ў псіхалогіі дзяцей пад уздзеяннем траўматычных фактараў: вайны, голаду, абыякавасці дарослых, страты бацькоў [154].

Раскрыццю праблемы садзейнічалі работы, прысвечаныя даследаванню дзейнасці асобных груп грамадства ва ўмовах германскай акупацыі. Прадметам даследавання А.А. Кавалені сталі маладзёжныя саюзы, створаныя акупантамі, барацьба моладзі супраць агрэсара [130; 131; 132; 133; 134]. Аўтар падкрэслівае агульнасць мэт і задач фашысцкай палітыкі ў адносінах да дзяцей і моладзі: германізацыя і генацыд, прыводзіць статыстычныя дадзеныя пра ўдзел дзяцей у СБМ, партызанскім руху, агучвае колькасць дзяцей, забітых за гады акупацыі. Выкарыстанне шматлікіх архіўных дакументаў і матэрыялаў перыядычнага друку дазволіла аўтару паказаць складанасць становішча, у якім апынулася моладзь.

У манаграфіі У.І. Кузьменкі аналізуецца становішча інтэлігенцыі пад акупацыяй, палітыка германскіх фашыстаў па прыцягненні гэтай групы да супрацоўніцтва, удзел розных яе прадстаўнікоў у антыфашысцкай барацьбе. Праца ўяўляе сабой спробу разгледзець

Витебский государственный технологический университет

удзел у вайне інтэлігенцыі Беларусі як адзінай сацыяльнай групы. Некаторыя праявы акупацыйнай палітыкі, а таксама разнастайнасць форм барацьбы з агрэсарам дазволіла выявіць пэўныя заканамернасці пры вывучэнні становішча дзяцей ва ўмовах германскага акупацыйнага рэжыму.

У заканамернай сувязі з дзіцячай праблематыкай знаходзіцца жаночая, паколькі менавіта жанчыны ў асноўным клапаціліся пра дзяцей на акупаванай тэрыторыі Беларусі. У дысертацыі І.У. Нікалаевай пра месца і ролю жанчын у ваенна-палітычных, сацыяльна-эканамічных працэсах на акупаванай тэрыторыі Беларусі заслугоўвае ўвагі матэрыял пра ўзаемадачыненні немцаў з беларускімі жанчынамі, сацыяльнае манеўрыраванне акупацыйных улад, вынікам якога стала адкрыццё дзіцячых садкоў з мэтай вызвалення працоўных рук дарослых [256]. Даследаванне вызначаецца грунтоўнасцю і навуковай значнасцю.

На сучасным этапе ў сувязі з рассакрэчваннем фондаў архіваў акупацыйнага перыяду з’явіліся працы, прысвечаныя асобным рэгіёнам Беларусі, у прыватнасці, заходняму і паўднёваму. Звесткі пра спецыфіку сацыяльнага становішча яўрэйскіх дзяцей утрымліваюцца ў работах Я.С. Розэнблата, І.Э. Яленскай [298; 114; 115]. Пытанні халакосту, удзелу яўрэйскага насельніцтва, у тым ліку дзяцей, у змаганні супраць ворага, дзейнасці германскіх служб бяспекі па стварэнні школ для падрыхтоўкі дыверсантаў вывучаў Э.Р. Іофе [126, 127].

Некаторыя аспекты палітыкі германскіх улад у дачыненні да дзіцячага насельніцтва Беларусі закраналіся пры разглядзе асобных праблем акупацыйнага рэжыму. Факты працоўнага выкарыстання дзяцей і вываз за межы краіны былі асветлены ў рабоце Я.А. Грэбеня [48]; барацьба нямецкай і савецкай прапаганды за падрастаючае пакаленне паказана ў даследаваннях Г.А. Болсун [26], А.А. Мігуновай [171, 172]. Навуковаму асэнсаванню становішча дзяцей ва ўмовах акупацыі садзейнічалі працы па гісторыі Беларусі перыяду вайны такіх даследчыкаў, як У.К. Коршук, А.М. Літвін, С.Я. Новікаў, А.В. Бяляеў, І.Ю. Сервачынскі, С.У. Жумар і інш. [146; 156; 164; 259; 23; 303; 119].

Цяжка пераацаніць значэнне ўнікальнага шматтомнага выдання гісторыка-дакументальных хронік раёнаў і гарадоў Беларусі “Памяць”. У кожнай кнізе ёсць раздзел, прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, усталяванню акупацыйнага рэжыму, зараджэнню і разгортванню падпольнага і партызанскага руху. Гэтыя матэрыялы, а таксама архіўныя дакументы па канкрэтным рэгіёне ўяўляюць цікавасць для даследчыка.

Значную ўвагу распрацоўцы пытанняў нацысцкага акупацыйнага рэжыму ўдзяляюць расійскія гісторыкі, якія актыўна працуюць у рэчышчы новых метадалагічных накірункаў: сацыяльнай, вуснай гісторыі, ваенна-гістарычнай антрапалогіі. У шэрагу артыкулаў і прац



Витебский государственный технологический университет

раскрываюцца ўзаемадачыненні акупацыйных уладных структур і грамадства, праблемы ўспрыняцця вайны і акупацыі насельніцтвам, пытанні рэалізацыі мерапрыемстваў акупантаў у розных сферах жыцця [30; 116; 117; 144; 150]. Неабходна адзначыць, што наступствы фашысцкай палітыкі для насельніцтва акупаваных тэрыторый РСФСР у многім былі падобнымі да тых, якія перажылі жыхары Беларусі.

Разам з айчыннымі гісторыкамі пэўны ўклад у асвятленне праблем гісторыі вайны і становішча дзяцей унеслі нямецкія гісторыкі Н. Мюлер, Х. Ленхард, Б. К'яры, К. Герлах, У. Гартэншлегер [176; 162; 159; 329; 328]. Імі разглядаюцца пытанні прыцягнення дзяцей да прымусовых работ, вывазу ў Германію, выжывання ва ўмовах татальнай вайны. Асобна хацелася б выдзеліць працу Б. К'яры "Штодзённасць за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941 – 1944 г.)", у якой дзіцячай праблематыцы прысвечана асобная глава. Аўтар прыходзіць да высновы, што беларускім дзецям выпаў жахлівы лёс, у іх вайной было "ўкрадзена дзяцінства". Паўсядзённае жыццё дзяцей у сям'і і ў дзіцячых установах у перыяд акупацыі – гэта барацьба за ўласнае існаванне, прысутнасць гвалту і страху, ранняе сталенне дзяцей.

Удзел падрастаючага пакалення ў СБМ, прычыны стварэння гэтай арганізацыі вывучаў польскі даследчык Ю. Туронак [314]. Скарыстаўшы новыя архіўныя дакументы, аўтар паспрабаваў паказаць працэдуру стварэння СБМ, ролю гэтай арганізацыі ў вярбоўцы моладзі на працу і ваенна-дапаможную службу ў Германіі, ацаніць паспяховасць метадаў ідэйнага выхавання і рэальныя вынікі ў выглядзе стаўлення арганізаванай моладзі да беларускай нацыянальнай ідэі.

Цікавымі для гісторыкаў з'яўляюцца працы беларускіх эмігрантаў [40; 177; 324], якія ў большасці прысвечаны праблемам адукацыйных працэсаў на акупаванай тэрыторыі пад патранажам германскіх улад, а таксама месцу СБМ сярод калабарацыяніснкіх арганізацый.

Аналіз літаратуры дазваляе канстатаваць, што і да 1990-ых гг., і на сучасным этапе, тэма "дзеці і вайна" атрымала фрагментарнае асвятленне. Пастаўленая праблема не набыла самастойнага статусу ў даследаваннях, хаця асобныя яе аспекты і былі закрануты ў працах беларускіх навукоўцаў. Далейшага разгляду і вывучэння патрабуюць пытанні рэалізацыі палітыкі акупацыйных улад у дачыненні да дзяцей, выкарыстання іх на прымусовых работах, падрыхтоўкі дыверсантаў з ліку беспрытульных і дзетдомаўцаў, прызначэння і забеспячэння дзіцячых установаў, пытанні, звязаныя з медыцынскім абслугоўваннем дзяцей, вызначэннем форм барацьбы дзяцей супраць фашыстаў, дзейнасцю партызан і падпольшчыкаў па выратаванні, выхаванні дзяцей.

Витебский государственный технологический университет

## 1.2 Агляд крыніц

Пры напісанні манаграфіі былі выкарыстаны як архіўныя, так і апублікаваныя крыніцы. Аснову даследавання склалі матэрыялы з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, абласных архіваў, матэрыялы перыядычнага друку, успаміны з фондаў БДМГВАВ і апублікаваныя ўспаміны.

Увесь комплекс крыніц мэтазгодна падзяліць на дзве групы паводле іх паходжання: савецкія і акупацыйныя. Група крыніц савецкага паходжання ўключае дакументальныя матэрыялы ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, БШПР, падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый, партызанскіх атрадаў; апублікаваныя зборнікі дакументаў; мемуары ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Група крыніц акупацыйнага паходжання – дакументальныя матэрыялы адзінак кіравання захопленымі тэрыторыямі, БНС, перыядычны друк. Дакументальныя крыніцы абедзвюх груп у сваю чаргу падзяляюцца на дырэктыўна-распарадчую, справаздачную дакументацыю, дакументацыю аператыўна-інфармацыйнага характару.

Дырэктыўна-распарадчая дакументацыя савецкага паходжання прадстаўлена загадамі, пастановамі БШПР, ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, накіраванымі на арганізацыю і вызначэнне асноўных задач антыфашысцкай барацьбы, распараджэннямі падпольных абкамаў, гаркамаў, райкамаў, партызанскага камандавання па рэалізацыі пастаноў партыі. У справаздачнай дакументацыі падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, партызанскага камандавання ёсць звесткі пра выратаванне дзяцей партызанамі і падпольшчыкамі, удзел дзяцей у антыфашысцкай барацьбе, іх навучанне і выхаванне ў школах партызанскіх зон. Статыстычныя матэрыялы пра полаўзроставую структуру партызанскіх атрадаў, колькасць ўзнагароджаных, загінуўшых партызан і падпольшчыкаў даюць магчымасць вызначыць асаблівасці і характэрныя рысы ўдзелу дзяцей у антыфашысцкай барацьбе.

Большасць дакументаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны знаходзіцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Яны аб’яднаны ў 900 фондаў, што налічваюць больш за 22 тыс. спраў. Для даследавання вызначанай тэмы вывучаліся дакументы аб дзейнасці Інспектарыята беларускіх школ (ф. 371), якому на працягу акупацыі падпарадкоўваліся ўсе дзіцячыя ўстановы на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь. У 277 справах утрымліваецца каштоўная інфармацыя пра становішча дзіцячых дамоў і выхаванцаў у іх, бытавое абслугоўванне, прычыны стварэння новых дзіцячых устаноў, задачы адукацыйнай палітыкі, якая праводзілася германскімі ўладамі. У перапісцы Генеральнага камісарыята Беларусі з акруговымі і павятовымі інспектарамі, дырэктарамі дзетдамоў ёсць інфармацыя пра



Витебский государственный технологический университет

сапраўднае становішча дзяцей, цяжкасці матэрыяльнага характару, з якімі сутыкнуліся ўсе дзіцячыя ўстановы, асвятляюцца пытанні ўнутранага распарадку ва ўстановах.

Значная частка матэрыялаў знаходзіцца ў фондзе ГКБ (ф. 370). Дакументы прадстаўлены пратаколамі пасяджэнняў акупацыйнай адміністрацыі, інструкцыямі рэйхскамісарыята "Остланд", прызначанымі для рэгламентацыі грамадскага жыцця насельніцтва ГАБ. У шматлікіх справах асвятляюцца пытанні арганізацыі працоўных адносін, уцягванне ў іх дзяцей, ідэалагічнай работы з імі.

Фонды БНС (ф. 381, 384, 401, 402) раскрываюць задачы, структуру, дзейнасць гэтай арганізацыі і яе аддзелаў на тэрыторыі ГАБ. Некаторая колькасць спраў прысвечана пытанням апекі БНС над дзіцячымі ўстановамі, беспрытульнымі дзецьмі, школьнікамі, памеры матэрыяльнай дапамогі, ступень удзелу гэтай арганізацыі ў грамадскім жыцці насельніцтва акругі, спробы наладзіць сацыяльную дапамогу дзецям, дабрачынную дзейнасць.

Звесткі пра эвакуацыю дзіцячых устаноў у савецкі тыл, зараджэнне партызанскага і падпольнага руху і ўдзеле у ім дзяцей утрымліваюць матэрыялы ЦК КП(б)Б (ф. 4-п). Аднак і сярод іх прысутнічае акрэсленая колькасць крыніц, якія асвятляюць мерапрыемствы акупацыйных ўлад у сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сферах.

Каштоўны матэрыял утрымліваюць дакументы акупацыйных і ваенных органаў, перакладзеныя на рускую мову (ф. 1440, 510). Тут ёсць інфармацыя пра рэпрэсіўныя меры супраць дзяцей партызан, дзяцей-удзельнікаў антыфашысцкай барацьбы ці западозраных у сувязях з патрыётамі, дзяцей, захопленых пры правядзенні карных аперацый. Усе яны абазначаны спецыяльным тэрмінам "бандэр кіндэр". Для іх былі распрацаваны асобыя мерапрыемствы па перавыхаванні, прыцягненні да прымусовых работ, вывазу за межы краіны.

Дакументы пра разгортванне партызанскага руху, яго задачы ў барацьбе з фашыстамі, дзейнасць падпольных арганізацый прадстаўлены адпаведна ў фондах БШПР (ф. 1450) і ЦК ЛКСМБ (ф. 63). У першым знаходзяцца матэрыялы па гісторыі стварэння партызанскіх брыгад і атрадаў (воп. 4), у якіх ёсць статыстычныя дадзеныя пра ўзроставы склад атрадаў, звесткі пра ўдзел падлеткаў у барацьбе, подзвігі юных байцоў партызанскіх фарміраванняў. Фонд ЦК ЛКСМБ, а таксама фонды падпольных камсамольскіх арганізацый па Брэсцкай (ф. 1378), Беластоцкай (ф. 1377), Баранавіцкай (ф.1375), Гомельскай (ф. 1381), Віцебскай (ф. 1380), Палескай (ф. 1385), Мінскай (ф. 1386) абласцях, утрымліваюць інфармацыю пра разгортванне падпольнага руху, пра першачарговыя задачы камсамола ў антыфашысцкай барацьбе, у тым ліку па захаванні жыцця дзяцей, іх навучанні, пра



Витебский государственный технологический университет

функцыі, якія выконвалі падлеткі ў падпольных групах. Справаздачы, лісты, дакладныя запіскі характарызуюць агульны стан і асноўныя накірункі работы сярод дзяцей, арганізацыю савецкіх школ на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

У якасці крыніц па тэме даследавання былі выкарыстаны матэрыялы зборнікаў дакументаў па гісторыі вайны, выдадзеных як у савецкі перыяд [293; 294; 304; 306; 261 – 264], так і на сучасным этапе. У сувязі з рассакрэчваннем фондаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны цікавасць для даследчыкаў уяўляюць зборнікі, прысвечаныя праблемам прымусовага вывазу на работы ў Германію [21; 22], асобным перыядам вайны [15; 269], трагедыі яўрэяў [312; 327], генацыду мясцовага насельніцтва [268; 307]. Дакументы, змешчаныя ў іх, паглыбляюць разуменне сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў, што адбываліся ў гады акупацыі на тэрыторыі Беларусі.

Асобнага разгляду патрабуе мемуарная літаратура, якая прадстаўлена як успамінамі “дзяцей вайны”, “сыноў палкоў” [5; 6; 52; 160; 175; 288; 300], так і ўспамінамі партыйных кіраўнікоў, партызан, падпольшчыкаў [31; 167; 168; 284; 296; 317]. Фактычны матэрыял сведчыць пра патрыятызм насельніцтва, яго самаахвярнасць, нянавісць да захопнікаў. Успаміны ўдзельнікаў барацьбы ў тыле ворага расказваюць не толькі пра стварэнне падпольных арганізацый, партызанскіх атрадаў, але і пра канкрэтных людзей, у тым ліку дзяцей, што прымалі ўдзел у супраціўленні, пра выконваемыя імі функцыі і абавязкі, аперацыі па выратаванні дзяцей; перадаюць пачуццёвае ўспрыняцце падзей, складаныя працэсы сталення дзяцей, фарміравання іх светапогляду. Многія аўтары ў сваіх успамінах карысталіся архіўнымі матэрыяламі і змаглі пераканаўча перадаць ход падзей, у прыватнасці, далі каштоўныя звесткі пра навучанне ў партызанскіх зонах, дзейнасць камсамольскіх арганізацый у гэтым працэсе. Нельга ігнараваць успаміны тых людзей, што супрацоўнічалі з акупантамі [265].

Распараджэнні ГКБ, рэйхскамісарыята “Остланд”, ваеннага камандавання ў тылавым раёне групы армій “Цэнтр”, якія рэгламентавалі палітычную, сацыяльна-эканамічную, культурную сферы грамадства, устанаўлівалі крымінальную адказнасць за ўдзел у супраціўленні і падтрымку партызан і падпольшчыкаў, адносяцца да дырэктыўна-распарадчай дакументацыі.

Справаздачы, протаколы пасяджэнняў мясцовай дапаможнай адміністрацыі, калабарацыяністскіх арганізацый, якія складаюць комплекс справаздачнай дакументацыі, змяшчаюць інфармацыю пра дзейнасць БНС па аказанні матэрыяльнай дапамогі маламаёмасным грамадзянам, дзіцячым установам, уладкаванні беспрытульных, Інспектарыята беларускіх школ і адпаведных аддзелаў камісарыятаў

Витебский государственный технологический университет

(генеральнага, акруговых, гарадскіх) і ўпраў (гарадскіх, раённых, валасных) па наладжванні школьнай справы, рэгламентацыі працы медыцынскіх установаў, па вырашэнні іншых сацыяльных пытанняў. З матэрыялаў аператыўна-інфармацыйнай дакументацыі цікавасць уяўляюць перш за ўсё статыстычныя звесткі пра колькасць школ, вучняў, выхаванцаў дзіцячых дамоў, нараджальнасць і смяротнасць сярод насельніцтва акупаваных тэрыторый. Разам з тым, неабходна крытычна успрымаць інфармацыю, што ўтрымліваецца ў акупацыйных архіўных дакументах. Перш за ўсё гэта тычыцца статыстычных матэрыялаў, справаздач мясцовай адміністрацыі па сацыяльных пытаннях, забеспячэнні дзіцячых установаў, дадзеныя якіх маглі завышацца ці, наадварот, заніжацца ў залежнасці ад сітуацыі.

Важнай крыніцай пры напісанні працы з’яўляўся акупацыйны перыядычны друк. Артыкулы “Менскай газэты” (“Беларуская газэта” з лютага 1942 г.), газеты “Новы шлях”, якая выходзіла ў Віцебску, акупацыйных часопісаў “Беларуская школа”, “Школьнік”, “Юнацкі покліч”, “Вучэбны лісток”, “Дзённік загадаў” характарызуюцца тэндэнцыйнасцю ў асвятленні жыцця дзяцей у СССР. Разам з тым, нягледзячы на іх прапагандысцкае прызначэнне, увагі заслугоўваюць абвесткі пра пошук дзяцей, дадзеныя аб нараджальнасці і смяротнасці, матэрыялы пра дзейнасць БНС у вырашэнні сацыяльных пытанняў, СБМ.

### 1.3 Метадалогія даследавання

Метадалагічную аснову манаграфіі складаюць навуковыя прынцыпы, катэгорыі і метады навуковага пазнання. Для атрымання вынікаў даследавання аўтар зыходзіў з прынцыпаў гістарызму, аб’ектыўнасці і сістэмнасці. Былі выкарыстаны наступныя агульналагічныя метады: метад аналізу (становішча дзяцей ва ўмовах акупацыйнага рэжыму было абумоўлена асноўнымі накірункамі і мерапрыемствамі нацыстаў у сацыяльнай і працоўнай сферах, уцягнатасцю падрастаючага пакалення ў барацьбу супраць ворага), індукцыі (пераход ад разрозненых фактаў, што былі выяўлены ў архіўных дакументах, успамінах, матэрыялах друку, да абагульненняў дазволіў выявіць агульную карціну жыцця дзяцей ва ўмовах акупацыі), параўнання (не ўсе дзеці на акупаванай тэрыторыі Беларусі знаходзіліся ў аднолькавых умовах існавання. У многім іх становішча вызначалася этнічнай прыналежнасцю, узростам дзяцей, наяўнасцю бацькоў, іх месцам працы і адносінамі да новай улады. Зыходзячы з гэтага, вызначаліся і сацыяльныя мерапрыемствы для дзяцей фольксдойчэ, калабарантаў, дзяцей, бацькі якіх нідзе не працавалі, беспрытульных); агульнанавуковыя метады: гістарычны (сацыяльная група “дзеці” разглядалася ў канкрэтных гістарычных умовах германскага



Витебский государственный технологический университет

акупацыйнага рэжыму, сацыяльнага манеўрыравання германскіх улад, якое непасрэдна залежала ад падзей на фронце, з улікам масавасці дзіцячага руху супраціўлення), лагічны (дазволіў выявіць прычыны ўключэння дзяцей у антыфашысцкую барацьбу. Паколькі вайна цалкам змяніла жыццё на акупаваных землях дарослых і дзяцей, то штуршком да ўдзелу ў антыфашысцкай барацьбе стала палітыка генацыду і германізацыі, якую праводзілі акупацыйныя ўлады. Супраціўленне агрэсару стала адметнай рысай "ваеннага" пакалення дзяцей, што былі аб'яднаны агульнай памяццю і адчуваннем зробленага ўкладу ў Перамогу), узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага (у працэсе даследавання былі выдзелены характэрныя рысы для разглядаемай сацыяльнай групы, што ўзніклі пад уплывам вайны: адбылося ранняе сталенне дзяцей і хуткая сацыялізацыя ў дарослае грамадства); спецыяльныя гістарычныя метады: гісторыка-генетычны (падрастаючае пакаленне разглядалася ў экстрэмальных умовах вайны і акупацыі, у абставінах барацьбы за выжыванне), гісторыка-параўнальны (для разумення становішча дзяцей на акупаванай тэрыторыі Беларусі былі разгледжаны некаторыя праявы палітыкі нацыстаў у адносінах да такіх сацыяльных груп, як жанчыны, моладзь, выяўлена падабенства ў іх формах), гісторыка-тыпалагічны (рэалізоўваўся пры класіфікацыі дзіцячых устаноў, якая грунтавалася на вызначаных гітлераўцамі мэтах і задачах, што ставіліся і вырашаліся імі ў ходзе вайны).

Витебский государственный технологический университет

## Раздзел 2. Палітыка германскіх улад у адносінах да дзяцей на акупаванай тэрыторыі Беларусі

### 2.1 Асноўныя накірункі палітыкі нацыстаў у дачыненні да дзяцей

22 чэрвеня 1941 г. Германія пачала вайну з СССР. Мэты ваеннай кампаніі на Усходзе былі загадзя распрацаваны нацыстамі. Яны насілі акрэслены характар палітыкі генацыду. 30 сакавіка 1941 г. на пасяджэнні вышэйшага каманднага саставу вермахта А. Гітлер дэкларараваў, што ў вайне супраць Савецкага Саюза барацьба будзе весціся “на знішчэнне” і што гэта будзе “вынішчальная вайна ў поўным сэнсе гэтага слова”. Агульную стратэгію паводзін нямецкіх войск пацвердзіў А. Розэнберг за некалькі дзён да нападу, заявіўшы, што “одной из главных целей вторжения является захват путем грабежа продовольствия и сырья, необходимых для немецкой военной машины, независимо от ужасных последствий, которые такой грабеж должен вызвать. Выполнение этих планов должно будет иметь своим результатом голодную смерть миллионов из-за отсутствия пищи” [262, с. 557]. Асновай для правядзення такой палітыкі стала распрацаваная А. Гітлерам тэорыя “неабходнай жыццёвай прасторы” для нямецкага народа, пашырэнне геаграфічных межаў Германіі за кошт усходніх тэрыторый Чэхіі, Польшчы і СССР, тэорыя аб “расавай переваге” нямецкай нацыі над іншымі народамі, у пералік якіх уваходзілі і ўсходнія славяне.

Такія дакументы, як “Генеральны план “Ост”, план “Барбароса”, “Дванаццаць запаведзяў паводзін немцаў на ўсходзе і іх абыходжання з рускімі”, “Аб ваеннай падсуднасці ў раёне “Барбароса” і аб асобых паўнамоцтвах войск” надавалі расправам над мірнымі жыхарамі характар дзяржаўнай палітыкі, якая распаўсюджвалася на ўсіх, незалежна ад полу і ўзросту. Дзеці і падлеткі не былі абаронены ад тэрору германскай арміі, што пацвярджаецца шэрагам фактаў. Так, ужо ў першыя дні вайны загінула трое дзяцей Дамачаўскага дзетдома Брэсцкай вобласці; у перыяд з 19 ліпеня па 31 жніўня 1941 г. гітлераўцы правялі першую карную экспедыцыю “Прыпяцкая дрыгва”, у час якой Г. Гімлер патрабаваў знішчаць усіх непаўнавартасных у расавых, фізічных і нацыянальных адносінах [138, с. 11]. Загінула 13 тысяч 788 чалавек.

Акупанты не захавалі тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі, кіруючыся прынцыпам “падзяляй і ўладарнічай”. 17 ліпеня указам А. Гітлера было створана Міністэрства па справах акупаваных усходніх абласцей на чале з А. Розэнбергам. Яму падпарадкоўваліся 4 імперскія камісарыяты, у адзін з якіх – Остланд – уваходзіла і частка тэрыторыі Беларусі (62 са 192 даваенных раёнаў рэспублікі). На чале генеральнай

Витебский государственный технологический университет

акругі Беларусь стаяў генеральны камісар (верасень 1941 – верасень 1943 – В. Кубэ, верасень 1943 г. – ліпень 1944 – К. фон Готберг). Тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, амаль усёй Гомельскай, усходнія раёны Мінскай і некалькі раёнаў Палескай абласцей былі ўключаны ў тылавы раён групы армій "Цэнтр". Паўднёвыя раёны Брэсцкай, Палескай і Пінскай абласцей з абласнымі цэнтрамі Брэст, Мазыр і Пінск, частка раёнаў Гомельскай вобласці былі далучаны да рэйхскамісарыята "Украіна". Беластоцкую, паўночныя раёны Брэсцкай, частку Баранавіцкай абласцей гітлераўцы ўключылі ў склад Усходняй Прусіі, паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці – у склад Генеральнай акругі Літва. Уведзенае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне павінна было перашкодзіць любым спробам гуртавання насельніцтва і садзейнічаць выспяванню канфліктаў на нацыянальнай глебе, міжэтнічных непаразуменняў.

Акрамя запланаванага тэрору, такія дакументы, як план "Ост", "Зялёная папка", "Карычневая папка", дырэктывы па "асобай кампетэнцыі СС", распрацаваныя Г. Гімлерам, уяўлялі сабой праграму паэтапнай эксплуатацыі, каланізацыі і германізацыі тэрыторыі СССР [8, с. 78]. Прадугледжвалася, што насельніцтва будзе падвергнута адбору: выберуць найбольш прыгодных ў расавых адносінах, якіх затым асімілююць пераселеныя з Германіі этнічныя немцы. Астатніх чакала смерць або ператварэнне ў паслухмяных рабоў. У 1946 г. на Нюрнбергскім працэсе, дзе былі асуджаны галоўныя нямецка-фашысцкія злачынцы, было дадзена азначэнне паняццю "германізацыя" (анямечванне), што з'яўлялася часткай той палітыкі, якую праводзілі гітлераўцы на захопленых тэрыторыях: "Когда мы говорим о планах германизации, мы имеем в виду планы ассимилирования захваченных территорий экономически, политически и в культурном отношении, втягивания их в орбиту германской империи. Германизация, или онемечивание, означает уничтожение национального характера захваченных территорий и искоренение всех элементов, которые не примут нацистской идеологии" [263, с. 557].

Планы ў адносінах да захопу і валодання тэрыторыямі, што месціліся на ўсход ад Польшчы, нацысцкае кіраўніцтва пачало распрацоўваць з 1940 г. Тэорыя "жыццёвай прасторы", расавая тэорыя заклалі падмурак для абгрунтавання планаў знішчэння і анямечвання захопленых народаў. Ужо ў маі 1940 г. Г. Гімлер заяўляў, што "процедуру германизации намечено провести путем отбора детей, которые должны отниматься у родителей, получать новое имя, посылаться в Германию и там ассимилироваться" [32, с. 167].

Далейшыя распрацоўкі ў гэтым накірунку мелі ўжо і практычны характар, паколькі былі апрабаваны на насельніцтве Польшчы. Разам з тым, у адносінах да ўсходніх славян гэтае пытанне карэкціравалася да

Витебский государственный технологический университет

самага пачатку вайны і непасрэдна ў яе ходзе. Вынікам працы стаў дакумент “Некоторые соображения об обращении с лицами ненемецкой национальности на Востоке” Упраўлення расавай палітыкі, у якім прапаноўвалася абмежаваць тэрмін навучання дзяцей славян 4-ма класамі пачатковай школы. Мэта такой адукацыйнай і выхаваўчай палітыкі: “распространить учение о том, что подчинение немцам, честность, прилежание и послушание являются божьей заповедью” [306, с. 503 – 505].

Першыя месяцы вайны паказалі адсутнасць канкрэтна акрэсленых мерапрыемстваў па германізацыі падрастаючага пакалення на тэрыторыі Беларусі. Дзейнасць нямецкіх войскаў і загады кіраўніцтва былі накіраваны на масавае знішчэнне грамадзянскага насельніцтва, падаўленне супраціўлення, поўнае падпарадкаванне захопленых зямель. Пра гэта сведчаць і разважанні А. Гітлера наконт партызанскай барацьбы (ліпень 1941 г.), якая давала магчымасць знішчаць усіх, хто аказвае супраціўленне, незадавальненне Г.Гімлера колькасцю забітых мірных жыхароў (жнівень 1941 г.) і яго патрабаванні дзейнічаць больш радыкальна, вытрымкі з дзённіка Э. Гольца пра масавыя забойствы грамадзянскага насельніцтва. Разам з тым, мела месца агульная стратэгія паводзін, зададзеная А. Розэнбергам. Так, напрыклад, у цяжкім становішчы апынуліся выхаванцы дзіцячых устаноў, якія ніхто не збіраўся забяспечваць. М. Кузняцоў, які сустрэў вайну ў піянерскім лагеры, што хутка быў пераатвораны ў дзіцячы дом, успамінаў: “Жизнь впроголодь уже с первых недель оккупации побуждала детей к поискам съестного на стороне” [155, с. 86].

Жорсткасць акупацыйнай палітыкі адчулі на сабе і яўрэйскія дзеці. Разам з дарослымі яны накіроўваліся для пастаяннага пражывання на тэрыторыю гета, дзе адсутнічалі элементарныя ўмовы існавання. Свае дзеянні акупанты матывавалі неабходнасцю абараніць насельніцтва ад “яўрэйскай небяспекі” (яўрэі – спекулянты, бандыты, рабаўнікі). Акцыі перасялення суправаджаліся масавымі забойствамі, якія чынілі германскія салдаты. Так, у г. Віцебску яны выбіралі ў натоўпе дзяўчын, каб згвалтаваць, а пры пераправе праз р. Дзвіну да тэрыторыі гета, тапілі чоўны з людзьмі і не давалі няшчасным выплыць [299, с. 52]. Яўрэйскіх дзяцей, што знаходзіліся ў дзіцячых установах, ізалявалі ад астатніх. Так зрабілі восенню 1941 г. з выхаванцамі Дамачаўскага дзетдома: 15 дзяцей яўрэйскай нацыянальнасці ва ўзросце ад 2 да 12 гадоў “были изъяты из детского дома и помещены в гетто, а затем 14 из них расстреляны, и только Ковалеровой Оле 12 лет удалось спастись бегством” [293, с. 220]. Дзеці-яўрэі ўспрымаліся гітлераўцамі як “непрадуктыўныя асобы” (у адрозненне ад дарослай часткі, што была паспяхова задзейнічана на прымусовых работах), якіх прыходзілася яшчэ і карміць. Таму яны, асабліва дзеці-сіроты,



Витебский государственный технологический университет

станавіліся аб'ектам знішчальнай палітыкі. Так, на тэрыторыі Мінскага гета ў красавіку 1943 г., у час аднаго з пагромаў, быў цалкам выразаны дзіцячы дом на Заслаўскай вуліцы [280, с. 101].

"Асаблівыя" адносіны былі ў акупантаў да хворых і людзей з адхіленнямі ў фізічным і псіхічным развіцці. А. Гітлер лічыў, што правам на жыццё валодаюць толькі здаровыя ва ўсіх адносінах людзі, а хворыя і калекі з'яўляюцца баластам грамадства, які патрабуе сродкаў на ўтрыманне. Практычнай рэалізацыяй поглядаў фюрэра ў Германіі стала прыняцце і выкарыстанне ў медыцынскай практыцы закона аб эўтаназіі. Дзеянне гэтага закона распаўсюдзілі і на захопленыя тэрыторыі. Пад знішчэнне трапілі пацыенты псіхіятрычных бальніц, аддзяленняў, інваліды, што пражывалі ў спецыяльных установах. Так, у канцы чэрвеня 1941 г. былі забіты 400 хворых псіхіятрычнай бальніцы Навінкі Мінскага раёна [293, с. 190]. "Лішнім і непрадуктыўным падпунктам" у бюджэтных планах і санітарных ацэнках была прызнана "дзіцячая вар'ятня" г. Чэрвеня, у якой знаходзілася 144 чалавекі. Улады проста пазбавілі яе фінансавання, не думаючы пра лёс дзяцей [159, с. 218]. Не пазбегнулі чыстак і дзетдамы, якія метадычна правяраліся немцамі на наяўнасць яўрэйскіх дзяцей, інвалідаў. Паводле ўспамінаў былой выхаванкі Козыраўскага прытулку г. Мінска, у час чарговай праверкі ноччу, акрамя "чарнявенькіх, кучаравенькіх, забралі дзяцей-інвалідаў і наогул з усялякімі адхіленнямі" [7, с. 2]. Пры правядзенні такіх акцый фашысты заўсёды гаварылі, што перавозяць дзяцей у іншае, больш спрыяльнае месца пражывання. У сапраўднасці гэта азначала, што дзеці будуць забіты.

Зусім іншай была палітыка германскіх улад у адносінах да фольксдойчэ і іх дзяцей, асоб нямецкай нацыянальнасці, што пражывалі на тэрыторыіі СССР, у тым ліку і ў Беларусі, яшчэ да вайны. Улады адразу адмежавалі гэтую этнічную групу ад астатняга насельніцтва. Пасля праверкі, наколькі яны адпавядаюць "сапраўдным арыйцам", у залежнасці ад "чысціні крыві", забяспечвалі іх пасадамі ў сістэме кіравання. У параўнанні з астатнім насельніцтвам фольксдойчэ карысталіся шэрагам пераваг: яны атрымлівалі дадатковы паёк, большую зарплату, займалі кіруючыя пасады. Для іх дзяцей адкрывалі спецыяльныя школы, сярод якіх узорнай лічылася школа "Адольфа Гітлера" ў Смалявічах, дзе навучалася 30 дзяцей [313, с. 173]. Улічваючы цікавасць вайсковага кіраўніцтва да працы школы, хутчэй за ўсё дзяцей планавалася выкарыстаць як асабліва палітычна надзейных пры асваенні захопленых тэрыторый. Адкрыццё школ для фольксдойчэ з'ўлялася першачарговай справай. Так, у 1942 – 1943 гг. працавалі школы ў Мінску, Драздах, Смалявічах, Малым Залуччы, Гародні з агульнай колькасцю 150 вучняў [82, арк. 56]. В. Кубэ патрабаваў прынцыпова пазбягаць таго, каб дзеці нямецкага паходжання з-за



Витебский государственный технологический университет

адсутнасці магчымасці наведваць спецыяльную школу накіроўваліся ў беларускую [151, с. 37]. Нацыянальны дэкрэт аб працы абараняў дзяцей-фольксдойчэ, якім не споўнілася 18 гадоў, ад выкарыстання на працы. Германскія ўлады падкрэслівалі прыярытэт інтарэсаў гэтай групы перад астатнім насельніцтвам. Так, для таго каб адкрыць дзіцячы сад для нямецкіх дзяцей, былі вывезены і расстраляны выхаванцы Дамачаўскага дзетдома [313, с. 178].

Асобныя пастановы нацысцкага кіраўніцтва рэгулявалі сферу дзетанараджэння і аховы дзяцінства. Асноўныя палажэнні выцякалі з прынцыпу пра непаўнацэннасць славянскіх народаў СССР. У дакуменце “Заўвагі і прапановы “Усходняга міністэрства” па Генеральным плане “Ост” гаварылася, што адзін са шляхоў падрыву біялагічнай моцы народа ёсць давядзенне нараджальнасці рускіх да больш нізкага ўзроўню, чым у немцаў. Для дасягнення гэтага прапаноўвалася “не допускать борьбы за снижение смертности младенцев, не разрешать обучение матерей по уходу за грудными детьми и профилактическим мерам против детских болезней. … Не оказывать никакой поддержки детским садам и другим подобным учреждениям” [294, с. 132]. На працягу ўсяго перыяду акупацыі пералічаныя палажэнні актыўна рэалізоўваліся на практыцы. Так, напрыклад, па прызнанні віцебскага бургамістра Родзькі, смяротнасць сярод выхаванцаў у дзіцячых установах горада дасягнула ў першую акупацыйную зіму 75 % [321, с. 63], а тыя, каму пашчасціла выжыць і дачакацца вызвалення, да сённяшняга часу пакутуюць ад розных хвароб.

Такім чынам, насельніцтва Беларусі чакаў жахлівы лёс. На думку нямецкага гісторыка Р. Мюлера, у рамках плана па “заваёве жыццёвай прасторы на ўсходзе” праводзіўся “бяздумны эксперымент”, мэтай якога была “селекцыя” мясцовага насельніцтва, яго перасяленне, выгнанне ці наогул вынішчэнне ў адпаведнасці з расавымі і палітычнымі патрабаваннямі нацысцкага кіраўніцтва рэйха [260, с. 49]. Найбольш прыгодных у расавых адносінах планавалася асіміляваць, у першую чаргу дзяцей і моладзь, паколькі можна было ўздзейнічаць на несфарміраваныя асобы (невялікі жыццёвы вопыт, адсутнасць падтрымкі бацькоў, схільнасць да пазнання новага). Сітуацыя на франтах дазваляла акупантам не задумвацца пра настроі мясцовага насельніцтва і ў якасці асноўнага сродку падпарадкавання выкарыстоўваць тэрор.

З крахам аперацыі “Барбароса” акупаваныя тэрыторыі СССР ператвараюцца ў адну з важных крыніц для забеспячэння ваеннай эканомікі рэйха і германскай арміі. У палітыцы германскіх фашыстаў з’явілася тэндэнцыя да сацыяльнага манеўрыравання, што дазваляла працягваць рэалізацыю захопніцкіх мэт, прыкрываючы гэта некаторымі уступкамі, не адмаўляючыся ад сілавых метадаў ва ўзаемаадносінах з

Витебский государственный технологический университет

насельніцтвам. Падрастаючае пакаленне стала ўяўляць сабой значную па колькасці групу, патэнцыял якой можна было выкарыстаць на работах, а пры патрэбнай ідэалагічнай апрацоўцы знайсці сярод іх актыўных прыхільнікаў “новага парадку”. Тым больш гэта было неабходна, паколькі нярэдка партызанам і падпольшчыкам дапамагалі дзеці, якія ўдзельнічалі ў разведцы, зборы зброі. У шэрагу справаздач нямецкіх спецслужбаў адзначалася зручнасць моманту для ідэалагічнага ўздзеяння: у маладога пакалення, выхаванага ў бальшавіцкім духу, утварыўся пэўны ідэалагічны вакуум, які неабходна неадкладна запоўніць, каб моладзі не было часу і жадання ўключыцца ў барацьбу супраць немцаў [134, с. 65].

В. Кубэ быў упэўнены, што беларуская моладзь атручана бальшавіцкай ідэалогіяй, таму патрабаваў прымаць неадкладныя меры, каб перацягнуць яе на свой бок. Асаблівая роля ў гэтым працэсе надавалася адукацыйнай палітыцы, працы дашкольных, школьных і пазашкольных устаноў. Менавіта навучальны працэс, як абвясціў В. Кубэ 15 – 17 снежня 1941 г. на нарадзе школьных інспектараў, “павінен будавацца і абапірацца на гістарычны светапогляд з пункту гледжання нацыянал-сацыялізму” [120, с. 10]. Акупанты ўлічвалі і такія асаблівасці нацыянальнага развіцця Беларусі, як моцны ўплыў рускай і польскай культур, таму выхаваўчая справа вялася, прынамсі вонкава, пад заклікам “Беларусь для беларусаў”. Сапраўдныя мэты гітлераўцы маскіравалі з дапамогай прапагандысцкіх сродкаў  [120, с. 10].

Нават павярхоўны агляд зместу адукацыйнага працэсу сведчыць пра тое, што праз школьную справу праводзілі анямечванне беларускіх дзяцей. У пачатковай школе дзецям казалі, што І. Сталін загінуў і цяпер “нашым правадыром будзе А. Гітлер”. На нацыянальны заклік “Жыве, Беларусь!” дзеці былі абавязаны прывітаць настаўніка фашысцкім жэстам, які адпавядаў закліку “Хайль, Гітлер”. Асаблівая ўвага звярталася на вывучэнне гісторыі жыцця і дзейнасці фюрэра, яго ролі ў “змаганні” супраць яўрэяў, бальшавікоў, “вызваленні” беларусаў ад камуністычнага прыгнёту [172, с. 172].

Кантролю над дзецьмі і падлеткамі толькі ў школьны час для дасягнення пастаўленай мэты (германізацыя) было недастаткова. Неабходна было наладзіць і пазашкольную дзейнасць, каб ахапіць увесь вольны час дзяцей. Акупацыйныя ўлады адзначалі, што з-за нерэгулярнай працы школ, значная частка дзяцей пакінута на волю лёсу, а для арганізацыі іх вольнага часу нічога не робіцца [90, арк. 56, 354]. У перыядычным друку праводзілі думку пра неабходнасць хутчэйшага вырАтавання дзяцей, сапсаваных бальшавікамі і іх сістэмай выхавання, пачынаючы з ясельнага ўзросту. З пункту гледжання калабарацыяніскай прэсы, савецкія ўлады пакінулі на беларускіх землях “ребенка физически слабого, нервного, с ленью относящегося к



Витебский государственный технологический университет

работе, воспринимающего на лету только все поверхностное и легкое”. Тыповай з’явай на вуліцах сталі “семи-восьми и даже пятилетние дети с папиросой во рту” [75, арк. 70 зв.]. На думку акупантаў, падлеткі толькі і чакалі магчымасці, каб падмануць ці скрасці што-небудзь, а потым выхваляцца адзін перад адным, у каго лепш атрымалася.

Змены ў маладзёжнай палітыцы, якія закранулі і дзіцячы рух, адбыліся ў другой палове 1942 г., калі А. Гітлер даў згоду на ўтварэнне агульнаеўрапейскага саюза моладзі на ўзор гітлер-югенда. Дзейнасць саюза павінна была распаўсюджвацца і на ўсходнія тэрыторыі, у тым ліку і Беларусь. Яшчэ ў маі 1942 г. А. Аксман (кіраўнік гітлер-югенда) стварыў пры імперскім кіраўніцтве гітлераўскай моладзі галоўны аддзел АФ VI, які займаўся арганізацыяй нацыянальных маладзёжных саюзаў на захопленых тэрыторыях Савецкага Саюза. Са згоды А. Розэнберга пры ўсходнім міністэрстве акупаваных абласцей ужо 1 жніўня 1942 г. было створана Усходняе ўпраўленне імперскага кіраўніцтва моладзі з рэзідэнцыяй у Берліне. Яго ўзначальваў гаўптбанфюрэр Нікэль, а за работу сярод моладзі Беларусі адказваў банфюрэр Мэнцэль. Маладзёжным аддзелам ГКБ кіраваў банфюрэр В. Шульц, яго намеснікам па рабоце сярод дзяўчат была К. Гроземан [134, с. 76].

На фоне такіх змен у верасні 1942 г. Н. Абрамава, будучы кіраўнік жаночай філіі Саюза беларускай моладзі, сфармулявала мэты і задачы дзіцячага руху на тэрыторыі ГКБ, абапіраючыся ў першую чаргу на ідэалогію нацыянал-сацыялізму ў спалучэнні з ідэямі нацыянальнага выхавання. Зводзіліся яны да наступных палажэнняў:

1. Выхаванне свядомых носьбітаў нацыянальнай культуры ў шчыльнай злучанасці з ідэаламі краіны-вызваліцельніцы (Германіі).

2. Прышчапленне пачуццяў маралі і ачышчэнне ідэалогіі ад хамства і распусты – спадчыны сталінскай эпохі – да высокіх ідэалаў сапраўднага нацыянал-сацыялізму.

3. Адшукванне і ўзгадаванне талентаў-самародкаў.

4. Гуртаванне дзяцей па здольнасцях і схільнасцях з тым, каб краіна мела юнацкія кадры, якія ў будучым зоймуць месца для далейшага прагрэсіўнага поступу краіны.

5. Падрыхтоўка дзіцячай свядомасці да ўтварэння атрадаў падобна гітлераўскай моладзі, першыя звенні якіх магчыма было б фарміраваць з дзяцей рэпрэсаваных у час бальшавізму бацькоў (“палітычных”) і найбольш дысцыплінаваных і паспяховых у вучобе [192, арк. 27].

Сфармуляваныя задачы можна падзяліць як на ідэалагічныя, так і на тыя, якія развіваюць дзіцячы творчы патэнцыял. Прычым першыя, канешне, мелі прыярытэтны характар. Апору для развіцця руху планавалася шукаць сярод дзяцей рэпрэсіраваных бацькоў, тых, хто выхоўваўся ў дзіцячых дамах, тых, чые бацькі супрацоўнічалі з германскай уладай. Рэалізацыя пастаўленых мэт павінна была



Витебский государственный технологический университет

адбывацца праз “сістэматычную арганізацыю” канцэртаў, ранішнікаў, дзіцячай самадзейнасці. Планавалася ўцягваць дзяцей і ў выкананне грамадска-карысных спраў: абслугоўванне безнаглядных, дапамога шматдзетным (догляд за дзецьмі), паказ сіламі дзіцячай самадзейнасці канцэртаў у лазарэтах і шпіталях для немцаў [192, арк. 27]. Пералічаныя мерапрыемствы капіравалі дзейнасць гітлер-югенда, дзе для мабілізацыі падлеткаў арганізатары карысталіся дзіцячай наіўнасцю, самаадданасцю, даверлівасцю, энтузіязмам. Ствараючы адчуванне ўдзелу ў агульнай справе, адначасова выхоўвалі пакорлівасць загадам, разуменне таго, што разам з арганізацыяй − ты усё, адзін – ты нішто. У рамках рэалізацыі праграмы дзіцячага руху ў 1942 г. у Баранавіцкай акрузе была створана арганізацыя для школьнай моладзі “Малады дубок”. Яна павінна была “выкарчоўваць усе згубныя ідэі, якія дэмаралізавалі б беларускую моладзь, і знаёміць яе з высокай ідэалогіяй і мараллю сучаснай Нямеччыны” [122, с. 43].

Заключным этапам маладзёжнай палітыкі стала ўтварэнне 22 чэрвеня 1943 г. з дазволу германскіх улад Саюза беларускай моладзі. Яго арганізацыя з’явілася вынікам шэрагу сацыяльна-эканамічных і ваенна-палітычных абставін, у якіх апынулася нацысцкая Германія. Як лічыць гісторык А.А. Каваленя, СБМ меў паўваенную сутнасць. Бездакорная дысцыпліна і паслухмянасць у адносінах да старэйшых па званні членаў СБМ пры выкананні загадаў рыхтавалі дзяцей і падлеткаў да будучага ўдзелу ў вайне, рыхтавалі як новую анямечаную беларускую эліту [134, с. 184]. Рознай была матывацыя ўступлення ў шэрагі саюзу: частка моладзі сапраўды імкнулася служыць інтарэсам Бацькаўшчыны і змагацца супраць бальшавізму, для большасці ж гэта была магчымасць атрымаць дадатковы паёк і форму, што для перыяду акупацыі ва ўмовах збяднення насельніцтва было вельмі істотным. У. Ісаенка, будучы археолаг, які ў гады вайны жыў у Мінску, успамінаў, што парадак ўступлення ў СБМ быў наступны: прыходзіў настаўнік і казаў, што “трэба ўступаць” у СБМ, што члены будуць займацца “культурнымі праграмамі, вывучаць гісторыю, будуць паходы і г.д.” [128, с. 173]. Як падкрэслівае сведка, падлеткам 14 – 15 гадоў было цікава насіць адрозную ад іншых форму, праходзіць спецыяльнае навучанне або з’ездзіць у Германію, прымаць удзел у культурных мерапрыемствах. Наўрад ці можна гаварыць пра масавы ўдзел падрастаючага пакалення ў СБМ. Колькасць членаў ацэньваецца гісторыкамі прыкладна ў 12 тыс. чалавек [131, с. 152].

Ідэалагічная “апрацоўка” падрастаючага пакалення адбывалася і праз друк. У перыяд акупацыі некаторыя газеты і часопісы былі адрасаваны спецыяльна падлеткам і моладзі. Сярод іх часопіс “Жыве Беларусь” для кіраўнікоў СБМ, “Юнацкі покліч” – орган СБМ Віцебшчыны, “Служба юначак”, “Вучэбны лісток”, якія выдаваліся

Витебский государственный технологический университет

аддзелам прапаганды Кіраўнічага штаба СБМ, “Школьнік” – пры Інспектарыяце беларускіх школ. Усе пералічаныя выданні былі аб’яднаны адной мэтай – прапагандаваць думку пра вызваленчую ролю Германіі ад “жыда-бальшавікоў”. Моладзь як авангард грамадства павінна была “падхапіць аднаўленчую працу і будаваць новую Беларусь у новай Еўропе” [78, арк. 4].

Развіццё дзіцячага руху было цесна звязана з падзеямі на фронце. Уцягванне падрастаючага пакалення нібыта ў справу адбудовы Бацькаўшчыны давала магчымасць не толькі фарміраваць патрэбныя погляды, але і выкарыстоўваць дзяцей у працоўнай сферы. Ужо ў пачатку 1942 г. пачалася кампанія па вывазе рабочай сілы ў рэйх, спачатку добраахвотная, а потым прымусовая. Хаця першыя дакументальныя сведчанні адносяцца да лютага 1942 г., калі дэпартавалі на працу ў Германію 42 выхаванцаў Козыраўскага дзетдома, аўтары даследавання “Беларускія остарбайтары” лічаць, што праграмы па мэтанакіраваным вывазе дзяцей у гэты час яшчэ не было [20, с. 75].

У 1942 г. вярбоўка ў рэйх закранула пераважна дзяцей старэйшага школьнага ўзросту: у красавіку 1942 г. выйшаў загад Заўкеля аб мабілізацыі грамадзянскіх кваліфікаваных работнікаў і работніц ва ўзросце ад 15 гадоў для выкарыстання іх на працы ў Германіі; у верасні 1942 г. праводзілася акцыя па вярбоўцы “ўсходніх работніц”, дзяўчын і жанчын ад 15 гадоў. Калі ў канцы 1942 г. стала зразумелым, што фактычна ўсе акцыі па добраахвотным наборы рабочай сілы праваліліся, нямецкія ўлады зрабілі стаўку на прымусовую мабілізацыю падлеткаў і моладзі. Гэта давала магчымасць выканаць устаноўленую А. Розэнбергам квоту для ГКБ: 30 тыс. юнакоў і дзяўчат ва ўзросце 15 – 18 гадоў, 100 тыс. сямейных рабочых. З ліку апошніх адбіралі толькі працаздольных, да якіх адносіліся асобы ва ўзросце ад дзесяці гадоў [294, с. 210]. Даваўся дазвол на прымяненне на тэрыторыі Беларусі ўсіх магчымых сродкаў, у тым ліку “спецыяльных” мерапрыемстваў. Пад апошнімі разумелі выкарыстанне прымусовых дэпартацый, правядзенне аблаў і зачыстак населеных пунктаў, жыхары якіх падазраваліся ў сувязях з партызанамі. Такім чынам, пачынаючы з вясны 1943 г., праводзіўся мэтанакіраваны вываз дзяцей старэйшага школьнага ўзросту на прымусовыя работы ў Германію нараўне з дарослым насельніцтвам.

Неабходную колькасць падлеткаў і моладзі набіралі пры правядзенні карных экспедыцый супраць партызан. Ужо з восені 1942 г. афіцэрам СД, што дзейнічалі ў раёнах з моцным партызанскім рухам, загадана больш не расстрэльваць насельніцтва, “самое важное теперь – набор рабочих” [306, с. 382]. Задача захопу працаздольных, у тым ліку дзяцей, заключалася не толькі ў тым, каб выкарыстаць іх на прадпрыемствах Германіі, але і каб шляхам першаснай селекцыі

Витебский государственный технологический университет

адабраць найбольш прыгодных для асіміляцыі. Для гэтага ствараліся перасыльныя або зборныя лагеры, з якіх адсартаванае насельніцтва адпраўлялі ў Германію.

Свае інтарэсы да дзяцей былі і ў разведслужбаў. З ліку захопленых падчас карных экспедыцый, з ліку дзетдомаўцаў, тых, хто знаходзіўся ў канцлагерах, тых, чыіх бацькоў рэпрэсіравалі, беспрытульных адбіраліся прыгодныя для навучання ў адпаведных школах. У пачатку 1942 г. існавала цэлая сетка такіх разведшкол, у якія немцы набіралі дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў [128, с. 166]. Так, у верасні 1943 г. з розных дзіцячых дамоў г. Оршы было адабрана немцамі да 70 падлеткаў ва ўзросце ад 11 да 13 гадоў, якіх потым вывезлі ў Германію для навучання ў спецыяльнай школе [126, с. 101]. У якасці аплаты за супрацоўніцтва яны атрымлівалі грошы, прадукты харчавання.

Існаванне шырокай сеткі разведшкол на акупаваных тэрыторыях не толькі Беларусі, але Расіі і Украіны абумоўлена, на наш погляд, масавым беспрытульніцтвам і збядненнем насельніцтва. Дзеці, што страцілі бацькоў, не мелі сродкаў для існавання, не было тых, хто змог бы абараніць іх. Для многіх падлеткаў гэта быў адзіны шанец трапіць за лінію фронту, да "сваіх". Разам з тым, трэба адзначыць, што разведработу немцы праводзілі дастаткова актыўна, і гэта стварала для савецкіх войск пэўныя праблемы [295, с. 167].

Захоп вялікай колькасці дзяцей пры барацьбе з партызанамі адпавядаў не толькі вырашэнню пытанняў рабочай сілы, навучання дыверсантаў, але і мэтам германізацыі. 6 студзеня 1943 г. Г. Гімлер падпісаў загад "Об обращении с бандитскими детьми", які рэгламентаваў адбор "расово полноценных подростков мужского и женского пола" [221, арк. 83] для адпраўкі іх са зборных лагераў у распараджэнне гаспадарчых прадпрыемстваў Германіі ў якасці вучняў. Сістэма працоўнага навучання і перавыхавання была жорсткай і прадугледжвала "послушание, прилежание, безусловное подчинение и честность по отношению к немецким господам" [221, арк. 83]. Дзеці, адарваныя ад сям'і, роднай зямлі, адчувалі на сабе моцнае псіхалагічнае ўздзеянне германскай прапаганды пра немагчымасць вяртання на Радзіму, перамогу Германіі ў вайне з СССР.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што палітыка акупантаў у 1942 – першай палове 1943 гг. вызначалася пэўным лавіраваннем у палітычнай і эканамічнай сферах (стварэнне СБМ, аграрная рэформа і г.д.) і адначасова яшчэ большым уціскам у сувязі з нарастаннем партызанскага руху. З аднаго боку, неабходна было падавіць супраціўленне ў тыле ўласнай арміі, з другога – унутраныя рэсурсы Германіі былі не ў стане забяспечыць патрэбы краіны і арміі, таму ўзнікла неабходнасць у рабочай сіле. Паколькі колькасць

Витебский государственный технологический университет

добраахвотнікаў не вырашала праблемы, то нямецкія ўлады перайшлі да прымусовай працоўнай мабілізацыі. Грамадзянскае насельніцтва, у тым ліку і дзеці, заставалася пацярпелым як у першым, так і ў другім выпадках.

Пасля перамогі савецкіх войск на Арлоўска-Курскай дузе рэпрэсіўная палітыка гітлераўцаў дасягнула апагею жорсткасці. 10 ліпеня 1943 г. Г. Гімлер падпісаў загад аб спусташэнні савецкіх тэрыторый [178, с. 186]. Ваенна-палітычнае кіраўніцтва Германіі патрабавала ад ваенных і грамадзянскіх улад зрабіць больш жорсткімі татальныя рабункі, знішчаць населеныя пункты, шырэй прымяняць тактыку "выпаленай зямлі". Грамадзянскае насельніцтва тэрмінова падлягала эвакуацыі, перамяшчэнню ў зборныя лагеры і адпраўцы ў Германію. Ачышчаныя тэрыторыі планавалася выкарыстаць у сельскагаспадарчых мэтах, а "детские лагеря расположить на границе этих территорий, так чтобы дети могли быть использованы в качестве рабочей силы" [306, с. 499]. Размова ішла ў першую чаргу пра дзяцей, родзічы якіх былі забіты ў час карных аперацый ці працавалі ў Германіі. Гэты праект падтрымалі імперскія ведамствы, у тым ліку штаб эканамічнай арганізацыі "Усход". Як адзначаў нямецкі гісторык Н. Мюлер, праграму на практыцы ажыццявіць не змаглі, але дзяцей шырока выкарыстоўвалі на іншых сельскагаспадарчых работах у тылавых раёнах [176, с. 233].

Для "дзяцей бандытаў" (гэта значыць дзяцей, якіх захапілі ў раёнах, дзе быў моцны партызанскі рух, ці тых, каго падазравалі ў сувязях з партызанамі і падпольшчыкамі) ужо з сярэдзіны 1943 г. у Германіі і на тэрыторыі Польшчы меліся лагеры для перавыхавання, у прыватнасці ў Канстантынуве, Любліне (за апошні адказваў обер-групэнфюрэр СС Поль). Такія дзеянні адпавядалі агучанай Г. Гімлерам у канцы 1943 г. праграме асіміляцыі славянскіх дзяцей: "Нашим долгом будет взять себе их детей для того, чтобы убрать их из нежелательного окружения и, если будет необходимо, даже просто выкрадывать или отнимать детей насильно. Или мы приобретем хорошую кровь, которую мы сумеем использовать и дадим ей место среди нашего народа, или мы уничтожим эту кровь. … Мы будем воспитывать их детей так, как мы хотим сами" [262, с. 564]. Абмяркоўвалася пытанне ўзросту падрастаючага пакалення, у якім мерапрыемствы па перавыхаванні дадуць найлепшыя вынікі. Нацысты лічылі, што для перавыхавання найбольш прыдатныя дзеці ад 2 да 10 гадоў, і менавіта іх трэба накіроўваць у рэйх, паколькі ў дзяцей старэйшага ўзросту дастаткова моцнае пачуццё нянавісці [241, арк. 88]. Пра тое, што гітлераўцаў у большай ступені цікавілі дзеці да 10-ці гадоў, сведчаць іншыя дакументы германскіх улад. Так, фон Бах (упаўнаважаны па барацьбе з партызанамі) з сярэдзіны 1943 г. патрабаваў штодзённых паведамленняў

Витебский государственный технологический университет

пра колькасць дзяцей такога ўзросту, захопленых у час карных экспедыцый [237, арк. 199]. Старэйшыя дзеці разглядаліся фашыстамі ў першую чаргу як працоўная сіла і выкарыстоўваліся на прымусовых работах.

Летам 1944 г. вываз дзяцей за межы рэспублікі набыў характар выкрадання. Пры адступленні гітлераўцы, паводле ўспамінаў насельніцтва, прымусова забіралі дзяцей ад 8 да 15 гадоў і накіроўвалі ў спецыяльныя лагеры, якія называліся “юнацкімі паселішчамі”. Бацькам гаварылі, што “гэта робіцца для таго, каб даць дзецям правільнае выхаванне”. У сапраўднасці гэта былі дзіцячыя лагеры для забору крыві і па адпраўцы ў Германію [269, с. 79]. Па прызнанні нямецкіх злачынцаў, зробленых у час правядзення судовага працэсу ў Мінску ў студзені 1946 г., накірункаў вывазу было некалькі: праз Бабруйскі дзіцячы лагер (500 падлеткаў з г. Петрыкаў, 60 – з в. Макарычы [223, арк. 111, 151]), праз лагер на тэрыторыі вучэбнай гаспадаркі “Чырвоны Бераг” Жлобінскага раёна (1990 чалавек са Жлобінскага, Добрушскага, Рагачоўскага, Стрэшынскага раёнаў [224, арк. 26]), праз лагер у в. Дваранінавічы за 7 км ад Бабруйска (каля 2 тыс.) [225, арк. 28].

Акупанты і кіраўнікі СБМ спрабавалі рэалізаваць ідэю стварэння абарончых вёсак, галоўнай функцыяй якіх была б барацьба з партызанамі. Камандаванне групы армій “Цэнтр” у супрацоўніцтве з ГКБ арганізавала ў сакавіку 1944 г. у г. Бабруйску двухтыднёвыя курсы для падрыхтоўкі моладзі абарончых вёсак. З кожнай такой вёскі было запрошана па 1 – 2 маладым чалавекі ва ўзросце ад 15 да 20 гадоў. Сяляне атрымлівалі граматы на валоданне зямлёй і павінны былі побач з нямецкімі вайскоўцамі і членамі СБМ выконваць абарончыя і сельскагаспадарчыя абавязкі. Дзяўчаты з саюза дапамагалі ў доглядзе дзяцей, займаліся справамі аховы здароўя [205, арк. 76 – 77]. Вобраз абарончай вёскі, у якой дзеці разам са сваімі бацькамі хаваліся за штыкетнікам, сімвалізаваў становішча беларускіх дзяцей і падлеткаў у час вайны, працэс прымусовай страты дзяцінства [159, с. 244], калі гвалт і забойствы ў жыццё дзяцей неслі акупанты, як бы бацькі ні імкнуліся абараніць іх. Стварэнне абарончых вёсак не стала масавым, паколькі насельніцтва чакала хуткага вызвалення Беларусі і не жадала добраахвотна супрацоўнічаць з вермахтам.

Такім чынам, нацысцкая мэтанакіраваная палітыка анямечвання і генацыду падрастаючага пакалення, якую асудзілі на Нюрнбергскім працэсе, была накіравана на дасягненне наступных мэт:

1) не дапусціць ваеннага ўзмацнення суперніка, “воспрепятствовать развитию его биологической силы в будущем” [293, с. 81];

Витебский государственный технологический университет

2) прыцягнуць на свой бок як мага больш падлеткаў і моладзі, каб у будучым выкарыстаць іх ў якасці надзейнай апоры на каланізаваных тэрыторыях;

3) набіраць з ліку дзяцей танную рабочую сілу як для працы на месцы, так і ў Германіі;

4) садзейнічаць забыццю нацыянальных каранёў, ператварэнню дзяцей у паслухмяных рабоў праз правядзенне палітыкі германізацыі;

5) падтрымліваць высокую смяротнасць сярод насельніцтва, у тым ліку і дзяцей, спрыяць зніжэнню нараджальнасці;

6) выкарыстоўваць дзяцей як донараў для нямецкіх салдат, кроў якіх не магла "сапсаваць" арыйскую.

## 2.2 Мерапрыемствы акупантаў у сацыяльнай і працоўнай сферах і іх наступствы для падрастаючага пакалення

Палітыка акупацыйных улад вызначалася жорсткасцю, рэпрэсіўнымі мерамі і была накіравана на генацыд насельніцтва незалежна ад полу і ўзросту. Згодна выказванням кіраўніка рэйха А. Гітлера і іншых вышэйшых асоб Германіі любое ўпарадкаванне сацыяльнай сферы жыцця насельніцтва ўяўлялася ім непатрэбным. Жыхарам прыходзілася думаць пра выжыванне, харчаванне, дзяцей. Але ва ўмовах краху надзей на бліцкрыг, неспрыяльнага становішча на фронце нацысцкае кіраўніцтва было вымушана пайсці на кампраміс паміж ідэалагічнымі поглядамі і прагматычнымі меркаваннямі. Мерапрыемствы акупацыйных улад у сацыяльнай сферы ў адносінах да насельніцтва Беларусі, у тым ліку і дзяцей, зводзіліся да рэгулявання праблем харчавання, прадухілення распаўсюджання інфекцыйных захворванняў у тыле нямецкай арміі, уліку працоўнай сілы з мэтай найбольш поўнага выкарыстання рэсурсаў захопленых тэрыторый. Па меры зацягвання вайны з'яўляліся і іншыя праблемы, звязаныя непасрэдна з дзіцячым насельніцтвам: барацьба з бадзяжніцтвам, беспрытульнасцю, ростам дзіцячай злачыннасці, прызначэнне аліментаў, апякунства.

Асабліва вострай для насельніцтва стала праблема забеспячэння харчаваннем. У першыя месяцы гэты працэс меў бясспланавы і стыхійны характар [115, с. 120]. На думку даследчыка Я.С. Розэнблата, акупацыйныя ўлады паспрабавалі прыняць шэраг мер для больш рацыянальнага размеркавання прадуктаў на занятых усходніх тэрыторыях. Сярод мер значылася "установление лимитов суточного расхода продовольствия для местного населения в зависимости от национальности, возраста (выделялись три группы – дети до 2 лет, дети до 14 лет и взрослые), места работы и должности (выделялись категории лиц, занятых тяжелым физическим трудом, работников и иждевенцев, служащие аппарата управления и полицейские, которые



Витебский государственный технологический университет

получали повышенные продовольственные нормы), места жительства и рода занятий" [298, с. 68]. Ва ўсіх выпадках у аснову падзелу на катэгорыі быў пакладзены прынцып занятасці і прыдатнасці чалавека ў сістэме працы на Германію. Такім чынам, дзеці і падлеткі, беспрацоўныя, утрыманцы, інваліды значыліся на самым нізе сістэмы забеспячэння.

Ужо да канца 1941 г. ва ўсіх рэгіёнах Беларусі была ўведзена карткавая сістэма размеркавання прадуктаў, хаця рэальную карціну харчовага забеспячэння насельніцтва ў гады акупацыі цалкам аднавіць складана. Сітуацыю можна рэканструяваць на прыкладзе асобных гарадоў. Так, напрыклад, насельніцтва г. Віцебска дзялілася на тры катэгорыі. Дзеці траплялі ў катэгорыю ўтрыманцаў, а тыя з іх, хто вучыўся, у катэгорыю беспрацоўных. У абодвух выпадках іх меркавалася забяспечваць "у залежнасці ад наяўных запасаў харчавання" [63, арк. 14 а]. У ГАБ дзіцячае насельніцтва дзялілася на некалькі груп: да 2-х гадоў, ад 2-х да 6-ці, старэйшыя дзеці ўключаліся ў катэгорыю беспрацоўных, асобна вылучаліся дзеці-фольксдойчэ (дадатак А). Апошнія атрымлівалі ў тыдзень 300 г мяса, 1 л знятага малака, 1400 г хлеба. Для параўнання: дзецям мясцовага насельніцтва да 2-х гадоў норма хлеба складала ўсяго 200 г, а мяса ўвогуле не прадугледжвалася [193, арк. 48 – 49].

Аналіз дакументаў паказвае, што дзіцячае насельніцтва ўключалася ў катэгорыю беспрацоўных (утрыманцаў) ці выдзялялася ў асобную групу, акрэсленую ўзроставым фактарам. Падлеткаў (з 14-ці гадоў – для хлопцаў, для дзяўчын з 16-ці гадоў) адносілі ўжо да катэгорыі працаўнікоў, хаця афіцыйна, напрыклад, у ГАБ працоўная павіннасць выконвалася з 18 гадоў. Патрэба ў рабочай сіле прымушала акупацыйныя ўлады, кіруючыся патрэбамі канкрэтнай мясцовасці, уводзіць свой узроставы цэнз выканання працоўнай павіннасці, хаця яго паніжэнне прыводзіла да павелічэння расходаў на харчаванне. Такая ўзаемазалежнасць была выгаднай для гітлераўцаў, паколькі ўстаноўленыя нормы прадуктаў не адпавядалі сапраўднай аплаце працы. Акрамя гэтага, неабходна ўказаць на сувязь працоўнага абавязку з сістэмай прафесійнага навучання. Планавалася, што менавіта з 14-ці гадоў (пасля заканчэння абавязковай 7-гадовай школы) падлеткі і моладзь будуць уцягнуты ў працоўнае навучанне, каб потым атрымаць канкрэтную спецыяльнасць. Рэйху ў будучым неабходны былі рабочыя рукі. Такія штучна створаныя ўладамі абставіны ўцягвалі дзяцей у дарослыя працоўныя адносіны, што спрыяла дэфармацыі дзяцінства.

Харчаваннем па картках забяспечваліся толькі дзеці працуючых ці беспрацоўных бацькоў, якія былі зарэгістраваны на біржы працы [94, арк. 106]. Катэгорыі насельніцтва, якія мелі права на атрыманне картак, строга фіксаваліся, вёўся іх улік. За спробу прыпісаць лішніх

Витебский государственный технологический университет

утрыманцаў, падрабіць картку былі прадугледжаны меры пакарання: звальненне з працы, пазбаўленне картак, штрафы. Дзеці-сіроты, беспрытульныя заставаліся па-за межамі сістэмы харчовага забеспячэння і вымушаны былі жабраваць, рабаваць і г.д. Адсутнасць сістэмы іх выяўлення і ўліку ў гады акупацыі не дазваляе назваць нават прыблізную лічбу такіх дзяцей.

Становішча з харчовым забеспячэннем насельніцтва заставалася катастрафічным на працягу ўсяго перыяду акупацыі. Параўнанне норм харчавання па картках паказвае іх паступовае змяншэнне. Калі летам-восенню 1941 г. у некаторых рэгіёнах Беларусі (напрыклад, у Брэсце, Пінску) норма хлеба для працуючага складала ад 500 да 1000 г у тыдзень, а мясцоваму насельніцтву выдавалі дадатковыя хлебныя карткі [298, с. 70], то ўжо летам 1943 г. у адной са справаздач Магілёўскай гарадской управы адзначалася, што “продовольственный вопрос для населения стоит очень остро, кроме хлеба (и то хлеба недостаточного количества) население больше ничего не получает” [91, арк. 123]. Трэба адзначыць, што ў некаторых мясцовасцях акупацыйныя ўлады, з дазволу вайскоўцаў, спрабавалі крыху палепшыць харчаванне дзяцей. Так, у Магілёве з чэрвеня 1943 г. па распараджэнні ваеннага ўпаўнаважанага дзецям да 6-ці гадоў, нават тым, чые бацькі не працавалі, дадаткова да пайка па картках выдавалася малако-абрат [87, арк. 47]. Аднак гэтыя меры не маглі карэнным чынам змяніць сітуацыю і былі хутчэй прапагандысцкімі, а не сапраўдным клопатам пра дзяцей.

Недастатковыя нормы харчавання вымушалі жыхароў шукаць нелегальныя шляхі заробку. Дарослыя, а часта і дзеці, гандлявалі на чорным рынку адзеннем, іншымі рэчамі. Мясцовыя ўлады канстатавалі, што “базар полон торгующей, спекулирующей молодежи” [90, арк. 56]. Паўгалоднае гарадское насельніцтва не магло абысціся без натуральнага абмену з жыхарамі вёскі. Пра гэта сведчаць успаміны партызана П.А. Лебедзева: “Па вёсках народу ходзіць шмат, большасць жанчыны, старыя і падлеткі, каб абмяняць вопратку, соду, сахарын ці што іншае на прадукты харчавання” [Цыт. па: 24, с. 70]. Такія перамяшчэнні насельніцтва стваралі пэўныя цяжкасці для акупацыйных улад і, як самі ж яны адзначалі, мелі “особенно отрицательные политические последствия” [215, арк. 11], паколькі ўскладнялася выкананне функцыі кантролю і не выключалася непатрэбнае ідэалагічнае ўздзеянне на моладзь з боку варожых для фашыстаў элементаў.

Ва ўмовах масавага збяднення насельніцтва і пагрозы нестабільнасці акупацыйныя ўлады сталі праводзіць некаторыя мерапрыемствы ў сацыяльнай сферы. Аказанне пэўнай матэрыяльнай дапамогі насельніцтву было абумоўлена імкненнем пазбегнуць негатыўных настрояў у тыле нямецкай арміі і адначасова папулярызаваць палітыку, якая праводзілася акупантамі. Для гэтага ў



Витебский государственный технологический университет

кастрычніку 1941 г. гітлераўцы далі дазвол на стварэнне Беларускай народнай самапомачы (Беларускай самапомачы), дзейнасць якой была накіравана на дапамогу "пацярпелым беларусам ад ваенных дзеянняў, бальшавіцкага і польскага праследавання" [42, с. 512]. Фінансаванне гэтай арганізацыі павінна было адбывацца праз сяброўскія ўзносы і добраахвотныя зборы з насельніцтва і ўстаноў. Планавалася, што з "утворанага збору раённыя аддзелы БНС будуць аказваць дапамогу дзіцячым садам, браць апеку над беднымі дзецьмі і дзецьмі-сіротамі дашкольнага ўзросту, арганізоўваць дапамогу бедным дзецям у школе (снеданне, вопратка, абутак і г.д.)" [204, арк. 26]. Сацыяльныя функцыі выконвалі і мясцовыя органы кіравання (аддзелы сацыяльнага забеспячэння, апекі пры ўправах). Дапамога аказвалася праз выдачу талонаў на бясплатныя абеды ў сталоўках БНС, адзення, абутку, прадуктаў харчавання, аднаразовыя грашовыя выплаты.

У архіўных дакументах пра дзейнасць БНС, органаў мясцовага кіравання зафіксавана шмат заяў ад грамадзянскага насельніцтва з просьбай выдзяліць сродкі для існавання ў сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам. Гэтыя дакументы паступалі ў асноўным ад сямей, дзе дзеці непрацоўнага ўзросту знаходзіліся на ўтрыманні толькі аднаго з бацькоў (часцей за ўсё маці), не было стабільнай крыніцы заробку, маёмасць згарэла ў час ваенных дзеянняў. Памеры грашовай дапамогі былі living рознымі і залежалі ад сацыяльнага статусу сям'і і колькасці дзяцей. Грашовыя выплаты рабіліся адзін раз у памеры ад 35 да 500 руб. Зразумела, што яны былі недастатковымі, асабліва калі параўнаць іх з коштам прадуктаў на чорным рынку. У чэрвені 1942 г. 1 кг хлеба каштаваў ад 45 да 120 руб., 1 дзесятак яек – 40 – 70 руб., 1 л малака – 12 – 20 руб.  [14, с. 303; 90, арк. 249].

На тэрыторыі ГАБ нярэдка дапамога аказвалася прадуктамі харчавання: бульбай, мукой, соллю. Гэта мера з'яўлялася больш эфектыўнай, паколькі кошт прадуктаў на рынку, як адзначалася вышэй, быў несувымерным з грашовымі выплатамі. Былі выпадкі, калі выдаваліся прадукты спецыяльна для дзяцей малалетняга ўзросту: цукар, малако, твораг, масла [59, арк. 8]. Бацькі, даведзеныя да стану поўнага адчаю, калі не было чым карміць сваіх дзяцей, асабліва калі тыя хварэлі, звярталіся да ўладаў з апошняй надзеяй. Прашэнні грамадзян адлюстроўваюць усю глыбіню гаротнага становішча, у якім апынулася насельніцтва Беларусі, штучна створанага і падтрымліваемага акупантамі.

Недахоп сродкаў існавання ствараў праблемы ва ўнутрысямейных адносінах, не ўласцівыя даваеннаму часу. Бацькі, вымушаныя шукаць, як і чым пракарміць дзяцей, пакідалі іх без нагляду, і дзеці хадзілі па вуліцах, капаліся ў сметніках, папрашайнічалі ў мясцовага насельніцтва і ў вайскоўцаў [62, арк. 56]. Пазбаўленыя кантролю з боку сям'і, яны

Витебский государственный технологический университет

траплялі пад чужы ўплыў. У свае незаконныя справы дзяцей уцягвалі падпольныя гандляры і спекулянты, карыстаючыся іх імкненнем дапамагчы бацькам і зарабіць свае першыя грошы [159, с. 214].

На тэрыторыі ГАБ па ініцыятыве аддзелаў апекі, а затым БНС (БСП) спрабавалі стварыць сетку сталовак бясплатнага харчавання для беднага насельніцтва і бежанцаў. Так, за снежань 1943 г. бедным вучням г. Мінска было выдана 1584 бясплатныя абеды з двух блюд [203, арк. 27 – 28], а ў студзені, лютым, сакавіку 1944 г. – 4218 [199, арк. 4]. Дадзеная статыстыка паказвае, што колькасць дзяцей маламаёмасных і немаёмасных грамадзян не змяншалася. Хутчэй за ўсё, у сталоўках харчаваліся пастаянныя групы вучняў, вызначаныя адміністрацыяй школ як бедныя. Разам з тым, як адзначалася ў справаздачах БНС, “норма выдачы прадуктаў (у сталоўках. – *Б.В.*) супраць нармальнага харчавання з’яўляецца ніжэйшай”. Планавалася, што “ў далейшым страўні БСП будуць больш прыдатнымі да абслугоўвання бяднейшага насельніцтва і бежанцаў” [203, арк. 63]. Недахоп прадуктаў быў абумоўлены агульнай сітуацыяй на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Першапачатковай задачай станавілася забеспячэнне германскай арміі, а ўжо потым астатняга насельніцтва.

Акрамя сталовак бясплатнага харчавання для беднага насельніцтва, у Мінску працавалі спецыяльныя сталоўкі для дзяцей-сірот. Адна з іх абслугоўвала ў 1943 г. 50 чалавек [218, арк. 212]. У яе працы меліся тыя ж праблемы, што і ў астатніх: недахоп харчавання, пераважна мясных прадуктаў. Нягледзячы на тое, што раённыя гаспадаркі былі ў стане пастаўляць іх, ваеннае кіраўніцтва не дазваляла адпускаць мяса на сацыяльныя патрэбы. Такім чынам, у рацыёне дзяцей адсутнічаў “матэрыял”, які адказвае за паўнацэннае развіццё арганізма.

Загадам Цэнтральнага ўпраўлення БНС ад 31 студзеня 1942 г., змешчаным у “Менскай газэце”, для дзяцей-школьнікаў ГАБ уводзіліся ў школах штодзённыя бясплатныя сняданкі а 10-й гадзіне раніцы, якія павінны былі складацца са 100-грамовага кавалка хлеба, намазанага павідлам або патакай “ці чым іншым, што будзе пад рукой” [59, арк. 2]. Зразумела, што падобнае рашэнне павінна было садзейнічаць папулярызацыі дзейнасці БНС, падтрымцы найбяднейшых дзяцей. Аднак пры рэалізацыі неблагой ідэі ўзніклі цяжкасці матэрыяльнага характару. Раённыя і акружныя аддзелы БНС слаба ўяўлялі, як арганізаваць гэтыя сняданкі і з якіх грошаў купляць хлеб і патаку [216, арк. 11]. Улічваючы, што дзяцей школьнага ўзросту, ахопленых школай, у ГАБ у 1941/1942 навучальным годзе налічвалася 245 тыс. чалавек, на правядзенне задуманай БНС дабрачыннай акцыі патрэбны былі немалыя грошы. Акупацыйныя ўлады не маглі і не хацелі фінансаваць такія мерапрыемствы, а сабраць неабходную суму праз добраахвотныя ахвяраванні было немагчыма.

Витебский государственный технологический университет

Да сацыяльных мерапрыемстваў, якія праводзіліся БНС, можна аднесці і арганізацыю калядных ёлак для школьнікаў і дашкольнікаў. Першае такое мерапрыемства было праведзена ў канцы 1941 года. Прысутныя дзеці атрымалі падарункі, сродкі на якія збіралі камітэты самапомачы. Так, у час святкавання Новага, 1943, года Койданаўскі камітэт БНС "выдаў грашовых і матэрыяльных сродкаў" 323 вучням школ на суму 3423 руб., 26 дзяцей атрымалі палатно, падушкі, хусткі, рукавічкі [213, арк. 14]. Такія пазашкольныя мерапрыемствы, нягледзячы на іх дабрачынны характар, праводзіліся згодна з інструкцыямі, дасылаемымі з Інспектарыята беларускіх школ. Перад ёлкай арганізатар свята вітаў дзяцей крыкамі "Ура!" у гонар германскай арміі і Адольфа Гітлера. Такім чынам, побач з сацыяльнымі функцыямі забяспечвалася яшчэ і выхаванне дзяцей у патрэбным новай уладзе рэчышчы.

Акрамя арганізацыі і правядзення дабрачынных акцый сярод дзяцей, БНС займалася пошукам, рэгістрацыяй і ўладкаваннем беспрытульных. Пачатак гэтай працы быў пакладзены яшчэ загадам Намесніцтва Мінскай акругі ад 26 жніўня 1941 г., які абавязваў узяць на ўлік усіх беспрытульных дзяцей [104, арк. 143]. Заявы з просьбай весці пошук бацькі прыносілі ў Цэнтральнае ўпраўленне БНС, а супрацоўнікі рассылалі запыты (з указаннем узросту, знешніх прыкмет, абставін, пры якіх згубілася дзіця) па дзіцячых установах ГАБ, раённых аддзелах самапомачы. Калі дзіця знаходзілася ў адной з такіх устаноў, то яго вярталі бацькам. Спрабавалі адшукаць дзяцей праз друкаванне абвестак у акупацыйных газетах, такіх, як "Беларуская газэта", "Голас вёскі" [201, арк. 2, 4, 11, 44]. Наколькі такі шлях быў эфектыўны, сказаць цяжка, бо ў дакументах намі не знойдзена фактаў, якія б пацвярджалі станоўчыя вынікі пошукаў.

Неабходна адзначыць, што праца БНС у сферы пошуку дзяцей была малаэфектыўнай па той прычыне, што ніхто не ведаў іх дакладнай колькасці. Інструкцыі, якія патрабавалі браць на ўлік беспрытульных, не выконваліся. У справаздачах райаддзелаў адзначалася, што такіх дзяцей па раёнах проста не існуе. Пошукі ўскладняліся яшчэ і тым, што многіх дзяцей прытулілі жыхары вёсак і гарадоў без афармлення дакументаў на ўсынаўленне ці апеку. Так, у Мінскай акрузе на ліпень 1942 г. афіцыйна было зарэгістравана васьмёра дзяцей, з якіх 1 жыло у бабулі, 5 – у чужых людзей, 2 – у дзіцячым маёнтку "Горкі абчак" [218, арк. 29]; па Глыбоцкай акрузе іх налічвалася 44 чалавекі [200, арк. 17]. Астатнія бадзяліся ў пошуках ежы па вуліцах, мелі схованкі, каб не трапіць на вочы паліцыі ці работнікам сацыяльных службаў. Гэта пацвярджаецца існаваннем так званых "дзіцячых баракаў", адзін з якіх быў выяўлены вясной 1943 г. у разбураным саўгасе Мінскай вобласці. Дзеці былі

Витебский государственный технологический университет

пакінуты на волю лёсу, знаходзіліся без кантролю з боку дарослых [255, с. 244].

Нягледзячы на цяжкі матэрыяльны стан насельніцтва, памяншэнне памераў прадуктовых пайкоў, мелі месца выпадкі ўсынаўлення і афармлення апекі над беспрытульнымі дзецьмі. З гэтай мэтай пры органах кіравання, управах ствараліся спецыяльныя аддзелы апекі, якія павінны былі выяўляць асоб, што мелі патрэбу ў апекаванні, прызначаць апекуноў, а затым кантраляваць іх дзейнасць [70, арк. 51]. Згодна распараджэнню Генеральнага камісара "апекунамі маглі быць грамадзяне незалежна ад полу, нацыянальнасці і веравызнання (за выключэннем жыдоў)". Ад іх патрабавалася выгадаваць маральна і фізічна здаровае дзіця [202, арк. 4]. У Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці захавалася справа, прысвечаная пытанням усынаўлення дзяцей жыхарамі г. Мінска, якая датавана вераснем – кастрычнікам 1943 г. За гэты перыяд былі ўзяты ў сем'і выхаванцы дзетдома № 11 і дзетсада № 9 [111, арк. 4, 15]. Гэта былі дзеці рознага ўзросту. Многія з іх, асабліва да 3-х – 5-ці гадоў, не памяталі свайго прозвішча, хто іх бацькі, дзе нарадзіліся і г.д. Забіралі іх на выхаванне звычайныя людзі, як правіла, забяспечаныя працай. Зафіксаваныя ў дакументах выпадкі ўстанаўлення апекі і работнікамі органаў кіравання, напрыклад, Магілёўскай гарадской управы [91, арк. 52].

Сям'я, што прымала на выхаванне беспрытульнае дзіця, атрымлівала на яго прадуктовую картку. Але для гэтага неабходна было ахрысціць дзіця і прайсці спецыяльную камісію, якая рабіла заключэнне, што яно не яўрэйскай нацыянальнасці. У г. Мінску, напрыклад, селекцыяй дзяцей займалася спецыяльная антрапалагічная экспертыза, якой кіраваў супрацоўнік СД Рэгібер. Апекунам выдавалася даведка такога зместу: "Справка дана Гуще Пелагее о том, что она 27 марта 1942 г. взяла в детских яслях № 1 на воспитание девочку Люсю возраста 3 года. Этот ребенок комиссией по национальности признан не жидом" [49, с. 122].

Акрамя ўсынаўлення беспрытульных дзяцей, выхаванцаў з дзіцячых дамоў, людзі імкнуліся забраць дзяцей сваіх родзічаў ці сяброў, якія загінулі ці былі знішчаны акупантамі як партыйныя і савецкія дзеячы. Такія дзеці траплялі ў дзіцячыя дамы пад іншымі прозвішчамі, як і яўрэйскія дзеці. Апошнім перафарбоўвалі валасы, давалі іншыя імёны, вучылі, як адказваць на пытанні камісіі, хавалі ў час праверак. Не кожнай сям'і хапала рашучасці хаваць іх у сябе, паколькі за такія ўчынкі расстрэльвалі, а бацькі, акрамя свайго жыцця, рызыкавалі жыццём сваіх уласных дзяцей. Па ўспамінах В. Бембель-Дзядок, якая жыла ў гады вайны ў г. Мінску, у час аднаго з пагромаў у Мінскім гета суседзі прывялі дачку жанчыны-яўрэйкі са словамі: "В



Витебский государственный технологический университет

гетто погром. Мы не можем держать у себя Лару. Соседи требуют: уведите девочку к матери” [25, с. 10].

Нягледзячы на тое, што на ўсыноўленых дзяцей дадаткова выдаваліся прадуктовыя карткі, а БНС заяўляла пра выплату апекунам сродкаў на ўтрыманне апякуемых дзяцей “у выпадках неабходнасці і магчымасці”, насельніцтва кіравалася не матэрыяльнымі выгадамі, тым больш што картка не забяспечвала пражытачнага мінімуму. Фактычна сям’я прымала лішняга “едака”, якога трэба было карміць, як і ўласных дзяцей. Хутчэй за ўсё, можна гаварыць пра звычайнае чалавечае спачуванне, якое захавалі некаторыя людзі, нягледзячы на ўсе жорсткасці вайны і акупацыйнага рэжыму. Як успамінае І.І. Боўт, жыхарка г. Мінска, нельга было адмовіць “девочке, которая просила милостыню. Она была плохо одета, худая, бледная, в чирях, с отмороженными руками и ногами. На нее жалко было смотреть. Мои родители хотели оставить девочку у нас дома под видом моей двоюродной сестры, но слишком назойливы и любопытны были соседи” [312, с. 188].

Сацыяльная дапамога мясцовых органаў кіравання вызначалася месцам, якое займаў чалавек у іерархіі адносін у перыяд акупацыі. Паколькі дзеці не мелі ніякіх правоў як непрацаздольныя, то яны залежалі ад становішча, займаемага бацькамі. Зразумела, што больш абароненымі былі дзеці тых, хто супрацоўнічаў з гітлераўцамі. Спецыяльная пастанова палявой камендатуры г. Магілёва рэгламентавала забеспячэнне сем’яў паліцэйскіх “хорошими квартирными условиями, питанием, работой и т.д.”, каб у гэтых мерапрыемствах адчуваўся клопат германскай арміі пра іх дабрабыт [245, арк. 72]. Для паліцэйскіх прадугледжваліся пэўныя сацыяльныя выплаты ў выпадку іх смерці ці страты працаздольнасці. Імі карысталіся дзеці і ўдовы. На тэрыторыі ГАБ падобныя выпадкі рэгуляваў цыркуляр В. Кубэ ад 19.10.1942 г. У ім акрэсліваліся ўмовы выдачы дапамогі і выплаты пенсіі. Дзеці карысталіся гэтым правам толькі да 14 гадоў і толькі ў выпадку смерці бацькі ад “рук бандытаў” пры выкананні службовага абавязку [209, арк. 2 – 3]. Памер пенсіі на дзяцей быў меншы за тую, якую выплачвалі ўдаве, і складаў для няпоўных сірот 1/5 удовінай пенсіі (удава атрымлівала 70 % ад апошняга месячнага заробку мужа), а для поўных сірот – 1/3. У тылавым раёне групы армій “Цэнтр” такая дапамога была строга зафіксавана ў грашовым эквіваленце. Памер пенсіі залежаў ад звання забітага паліцэйскага. Напрыклад, паўсірата былога падузводнага атрымлівала 8 рэйхсмарак, сірата – 13 RM, дзіця камандуючага батальёнам – адпаведна 12 і 20 RM [96, арк. 655]. Улічваючы, што на тэрыторыі ГАБ паліцэйскія, чыноўнікі апарату кіравання атрымлівалі ад 200 да 300 RM у месяц, то відавочны той факт, што ў выпадку смерці бацькі дзіця заставалася фактычна без сродкаў



Витебский государственный технологический университет

існавання. Прадугледжаная дапамога па лініі БНС, якая вызначалася "ў памеры 40 RM на кожнага непрацаздольнага члена сям'і" [219, арк. 36] і была ўведзена зімой 1944 г., перш за ўсё мела на мэце прыцягнуць насельніцтва для барацьбы з партызанамі, абяцаючы клопат пра членаў сям'і ў выпадку смерці кармільца.

Аднак не ўсе служачыя і іх сем'і былі забяспечаны так, як паліцэйскія і члены вайсковых фарміраванняў. У першую чаргу трэба ўзгадаць настаўнікаў і медыцынскіх работнікаў. У 1942 г., каб нейкім чынам выправіць становішча, Інспектарыят беларускіх школ быў вымушаны прасіць пра выдзяленне дадатковага пайка ў памеры 6,5 кг мукі і 20 кг бульбы на настаўніка і 4,5 кг і 15 кг адпаведна на ўтрыманца на месяц [197, арк. 5 – 6]. Яшчэ адной мерай стала залічэнне ўтрыманцаў (большасць дзяцей да 14 гадоў) на баланс Інспектарыяту, каб яны маглі атрымліваць дадатковы паёк. Пералічаныя меры ў сферы сацыяльнай палітыкі з боку акупацыйных улад яскрава паказваюць, наколькі ў час вайны дзеці залежалі ад сваіх бацькоў. Хаця ў любым грамадстве бацькі абавязаны выхоўваць і матэрыяльна забяспечваць сваіх непаўналетніх дзяцей, сітуацыя ў 1941 – 1944 гг. ускладнялася тым, што магчымасці дарослых былі значна абмежаваны. Нават праца і зарплата не гарантавалі забеспячэння мінімальных патрэб працуючага і яго сям'і.

У гады акупацыі зменшыўся кантроль за дзецьмі з боку сям'і і выявілася няздольнасць улад ахапіць дзяцей школай і пазашкольнай дзейнасцю. Падобныя функцыі ў даваенны час у СССР ажыццяўлялі піянерская і камсамольская арганізацыі. Пастаўленыя па-за рамкамі закона, яны не маглі выконваць свае функцыі, а спробы акупантаў стварыць сетку падначаленых ім арганізацый і зацікавіць імі дзяцей не мелі поспеху (напрыклад, СБМ быў створаны толькі ў чэрвені 1943 г. і ахопліваў прыкладна 12 тыс. чалавек) [134, с. 143]. На тэрыторыі тылавога раёна групы армій "Цэнтр" загадам ад 18.10.1941 г. узмацнялася адказнасць бацькоў за дзяцей: "за все преступления и правонарушения, совершенные несовершеннолетними, ответственность несут их родители или лица, на иждивении коих они находятся" [89, арк. 26]. За парушэнне гэтага загаду прадугледжваўся штраф і іншыя меры пакарання. Так, "за неосуществление родителями и воспитателями надзора за несовершеннолетним в случае совершения преступления", за адмову ад рэгістрацыі народжанага ці памерлага, за хуліганства прадугледжваўся штраф у 1000 руб., арышт ці прымусовыя работы на тэрмін да 14 дзён [97, арк. 26]. Нягледзячы на ўвядзенне рэпрэсіўных мер, дзеці працягвалі бадзяцца па вуліцах без нагляду. Наадварот, з-за таго, што бацькам патрэбна было забяспечваць сям'ю харчаваннем, працаваць, функцыя кантролю была зведзена да мінімуму. Адна з гараджанак г. Пінска адзначала: "Я работаю на фанерном заводе, и



Витебский государственный технологический университет

когда я ухожу на работу, они (ее дети 5-ти и 3-х лет. – *Б.В.*) как бездомные шляются по улицам” [60, арк. 4].

Такім чынам, адказнасць бацькоў за непаўналетніх была вельмі адноснай. Узроставыя межы катэгорыі “непаўналетні” былі расплывістымі, недакладна вызначанымі нават для саміх акупантаў. Аналіз архіўных дакументаў сведчыць, што крымінальную адказнасць неслі дзеці, якія не дасягнулі 16-гадовага ўзросту. У першую чаргу за сувязь з партызанскім ці падпольным рухам, за невыкананне ці ўхіленне ад працоўнай павіннасці, за супраціўленне акупацыйным уладам. Такія справы разбіралі нямецкія рэпрэсіўныя органы (камендатуры, ГФП і г.д.) [69, арк. 14 зв.].

Пачынаючы вайну з СССР, кіраўніцтва Германіі мела акрэсленыя мэты і задачы ў медыцынскай сферы, якія яна збіралася рэалізаваць на захопленых землях. Зводзіліся яны да наступных палажэнняў:

“1. Мы можем быть только заинтересованы в том, чтобы сокращать прирост населения оккупированных восточных областей путем абортов.

3. Ни в коем случае не следует вводить ненемецкое обслуживание для местного населения оккупированных восточных областей. Например, ни при каких условиях не должны производиться прививки и другие оздоровительные мероприятия для ненемецкого населения” [50, с. 39].

Але не звяртаць увагі на санітарна-эпідэміялагічны стан акупаваных тэрыторый было немагчымым. Ва ўмовах краху надзей на бліцкрыг, неспрыяльнага становішча на фронце нацысцкае кіраўніцтва было вымушана прымаць канкрэтныя меры. Неабходнасць рэгулявання санітарнага стану ў тыле ўласнай арміі дыктавалася ў першую чаргу задачай не дапусціць распаўсюджання інфекцыйных захворванняў сярод салдат вермахта. Прадпісанні ўлад на працягу 1941 – 1944 гг. зводзіліся да абавязковай санітарнай апрацоўкі і вакцынацыі мясцовага насельніцтва, чым павінны былі займацца аддзелы аховы здароўя пры створанай фашыстамі мясцовай дапаможнай адміністрацыі.

Асноўнымі прычынамі, якія маглі прывесці да распаўсюджання інфекцый, былі міграцыі насельніцтва, выкліканыя вайной, змяншэнне колькасці бальніц і паліклінік, лазняў, медыцынскага персаналу, у тым ліку і за кошт генацыду яўрэйскага насельніцтва, увядзенне аплаты за медыцынскія паслугі, больш высокі парог успрымальнасці арганізма, знясіленага голадам, да інфекцый. Часткай міграцыйных працэсаў стаў рост колькасці беспрытульных і безнаглядных дзяцей на вуліцах. Улады, нягледзячы на ўсе намаганні (захаванне савецкіх і стварэнне новых дзіцячых дамоў і прытулкаў, адміністрацыйная адказнасць бацькоў за паводзіны дзяцей, стварэнне пазашкольных арганізацый, такіх, як СБМ, “Малады дубок”, якія павінны былі падначаліць сабе

Витебский государственный технологический университет

дзіцячы рух), былі не ў стане кантраляваць гэты працэс. Дзеці, што жабравалі па вуліцах, і тыя, што наведвалі школьныя ўстановы, стваралі пагрозу як пераносчыкі інфекцый. Гэтыя канкрэтныя абставіны вымушалі акупантаў праводзіць пэўныя медыцынскія мерапрыемствы ў адносінах да дзіцячага насельніцтва.

У дзіцячых установах (школах, дашкольных установах для дзяцей, чые бацькі былі заняты на прадпрыемствах), праца якіх аднавілася згодна распараджэнню В. Кубэ з восені 1941 г., абавязкова праводзілі медагляды навучэнцаў, паколькі вялікая колькасць дзяцей у школах, дзіцячых садах, дзяцей-сірот у дзетдамах стварала ўмовы для перадачы інфекцыйных захворванняў з наступным іх распаўсюджаннем па-за межамі ўстаноў. Заключэнні ўрачоў былі несуцяшальнымі. Адзін толькі знешні выгляд дзяцей выклікаў нараканні: брудныя валасы, пазногці, рукі, адзенне. Напярэдадні новага, 1942/1943, навучальнага года на тэрыторыі ГАБ было выдадзена распараджэнне аб абавязковым правядзенні медыцынскіх аглядаў, “каб не дапусціць у школу хворых дзяцей. У школе не павінна быць ні аднаго завашывелага вучня” [208, арк. 51].

Вынікі праверкі вучняў па Мінскім раёне паказалі, што ў многіх дзяцей знойдзены вошы (напрыклад, у 8 з 19 вучняў Пільніцкай школы, у 8 з 34 навучэнцаў Касыльскай школы), кароста (у 1 з 34 навучэнцаў Касыльскай школы, у 1 з 25 навучэнцаў Сціклеўскай школы), у многіх нястрыжаныя валасы, ногці, нячыстыя вушы (у 22 вучняў са 100 Трасцянецкай школы, у 6 з 25 Сціклеўскай) [105, арк. 1 – 50]. Гэта сведчыла пра невыкананне правіл асабістай гігіены, рэдкае наведванне лазні, недагледжанасць з боку бацькоў. Праверкі выявілі і іншую тэндэнцыю: былі адзначаны выпадкі малакроўя, хвароб, звязаных з дрэнным харчаваннем, што яшчэ раз падкрэслівала немагчымасць бацькоў забяспечыць мінімальныя патрэбы дзяцей. У справаздачах называліся школы, дзе не знойдзена ніводнага хворага вучня (школы ў в. Барок, Астрашыцкі Гарадок, Галіца і інш.), аднак наколькі прыведзеныя дадзеныя адпавядалі сапраўднаму стану здароўя вучняў, сказаць складана.

Каб выправіць сітуацыю з захворваннямі сярод дзіцячага насельніцтва, ўлады прымалі некаторыя захады, якія зводзіліся да адказнасці медработнікаў і бацькоў за знешні выгляд і выкананне правіл гігіены. Так, бацькі павінны былі рыхтаваць дзяцей да школы, стрыгчы, мыць у лазні, забяспечваць чыстай вопраткай, урачы абавязаны рабіць агляды сярод насельніцтва свайго ўчастка на прадмет выяўлення інфекцыйных захворванняў з наступнай ізаляцыяй хворага [208, арк. 51, 103]. Улічваючы недахоп медыцынскіх кадраў, ажыццявіць апошняе было немагчыма. Як адзначаў сам В. Кубэ на нарадзе 8 – 10 красавіка 1943 г., “на участке мы имеем по 1-2 врача, как предусматривает наш

Витебский государственный технологический университет

закон. Но эти два врача не в состоянии обработать территорию в 80000 м$^2$" [308, с. 68].

Яшчэ адным накірункам у правядзенні санітарна-медыцынскіх мерапрыемстваў стала адкрыццё дзіцячых кансультацый. Адпаведнае распараджэнне (красавік 1942 г.) у ГАБ прадпісвала адкрываць іх у кожным раёне. Асноўнай мэтай дзейнасці дзіцячых кансультацый павінны былі стаць "не толькі лячэнне дзяцей, але і правядзенне санітарна-прафілактычнай работы" [208, арк. 101]. Дадзеныя, якія б пацвярджалі факт аказання платных паслуг, у дакументах не выяўлены. Па ўскосных матэрыялах (у першую чаргу на аснове статыстыкі наведванняў) можна гаварыць пра тое, што мясцовае насельніцтва вадзіла туды сваіх дзяцей. Так, колькасць наведванняў Койданаўскай дзіцячай кансультацыі за 1943 г. склала 2393 [214, арк. 9 – 20], а дзяцей да 14 гадоў у Койданаўскай воласці на канец 1943 г. пражывала 1566 чалавек [108, арк. 1].

Аднак нават пры такой колькасці наведванняў (з аднаго боку, гэта сведчыць пра даступнасць паслуг, з другога пра рост захворванняў сярод дзяцей) дзіцячыя кансультацыі не маглі забяспечыць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Як адзначалі медыцынскія работнікі, не хапала самых простых і неабходных рэчаў: дэзынфекцыйных сродкаў, інструментаў, іголак для шпрыцаў [214, арк. 3; 208, арк. 16]. Калі бацькі прыводзілі дзіця ў кансультацыю, медыкі не заўсёды мелі магчымасць аказаць дапамогу.

Архіўныя дакументы дазваляюць вызначыць характар і колькасць захворванняў. Зрабіць гэта можна на аснове аналізу гадавых справаздач Койданаўскай і Лагойскай дзіцячых кансультацый за 1943 г. (дадатак Б).

Пік наведванняў у абедзвюх кансультацыях прыпадае на перыяд з мая па кастрычнік. Гэта можна патлумачыць тым, што з канца вясны і да сярэдзіны восені, па-першае, дзеці былі задзейнічаны на сельскагаспадарчых работах, што павышала траўматызм і магчымасць заразіцца (напрыклад, так званымі "кантактнымі" хваробамі: каростай, вашыма і г.д.); па-другое, заканчваліся запасы прадуктаў харчавання, і да новага ўраджаю (у дадзеным выпадку мы гаворым пра сельскую мясцовасць) магчымасці харчавання былі абмежаваны (неабходна ўлічваць і прымусовыя рэквізіцыі, якія праводзілі акупацыйныя ўлады. Гэтыя меркаванні тлумачаць і структуру захворванняў).

З дадатку Б бачна, што найбольш частымі былі дыспепсія, хваробы скуры (перш за ўсё кароста). Прычыны першай заключаліся ў дрэнным харчаванні, галаданні, адсутнасці патрэбных для дзіцячага арганізма сродкаў для далейшага росту (напрыклад, вугляводаў, якія паступаюць з мясам), другой – у невыкананні правіл асабістай гігіены, рэдкім наведванні лазні. Перавага гэтых хвароб над астатнімі ў структуры захворванняў дазваляе меркаваць пра некаторыя рысы

Витебский государственный технологический университет

штодзённага жыцця дзяцей у час акупацыі: барацьба нараўне з дарослымі за выжыванне, задзейнічанне дзяцей у працы па гаспадарцы (у большай ступені ў параўнанні з даваенным перыядам з-за адсутнасці мужчынскай сілы).

У справаздачах таксама зафіксаваны выпадкі сыпнога тыфу, дызентэрыі, коры, рахіту, якія не пагражалі перарасці ў эпідэміі. Пры вывучэнні справаздач неабходна мець на ўвазе наступныя фактары: статыстыка захворванняў магла спецыяльна заніжацца для кіраўніцтва, некаторыя жыхары мэтанакіравана не звярталіся за дапамогай, паколькі баяліся трапіць у лагер ці бальніцу, дзе іх не толькі не лячылі, але маглі выкарыстоўваць для медыцынскіх доследаў.

Працягвалі працу дзіцячыя бальніцы, дзіцячыя аддзяленні пры бальніцах, кабінеты. Паслугі, што аказваліся ў іх, былі платнымі. Так, у тылавым раёне групы армій "Цэнтр" такое становішча рэгламентавалася загадам ад 22 жніўня 1941 г. Кошт прыёму ўрача па дзіцячых захворваннях складаў 2 руб. [88, арк. 32]. Пры неабходнасці шпіталізацыі аплата за суткі знаходжання ў бальніцы складала 12 руб. 50 кап. Асобна неабходна было заплаціць і за хірургічнае ўмяшальніцтва. Аперацыя і пасляаперацыйнае лячэнне маглі каштаваць бацькам хворага да 325 руб. [68, арк. 91]. Гэта адпавядала прыкладна месячнаму заробку няні дзетдома, двухмесячнаму − прыбіральшчыцы ў гаруправе. У большасці насельніцтва не было такіх грошай. У архіўных дакументах зарэгістраваны адзінкавыя выпадкі выдаткавання сродкаў на лячэнне органамі мясцовага кіравання, камітэтамі БНС.

На працягу 1941 – 1944 гг. мела месца тэндэнцыя да закрыцця дзіцячых кабінетаў, аддзяленняў, бальніц і далучэння іх да бальніц, якімі карысталася дарослае насельніцтва. Такі факт тлумачыцца тым, што карыстанне лячэннем супярэчыла асноўным прынцыпам палітыкі нацыстаў у Беларусі, якая прадугледжвала адсутнасць медыцынскай дапамогі для мясцовага насельніцтва.

У медыцынскай сферы рэалізоўваўся яшчэ адзін прынцып фашысцкай палітыкі – прынцып перавагі арыйскай расы. Адкрываліся і працавалі спецыяльныя ўстановы для нямецкіх вайскоўцаў і фольксдойчэ, у якіх было забаронена прымаць мясцовых жыхароў, у тым ліку і дзяцей. Тым не менш, у дакументах зафіксаваны выпадкі парушэння гэтага прадпісання. Так, у г. Пінску ў паліклініцы для арыйцаў зрабілі аперацыю навучэнцу вучылішча, але для гэтага спатрэбіліся пісьмовая заява загадчыка ўстановы, якая накіроўвала хворага і адпаведна аплачвала яго лячэнне, пісьмовы дазвол загадчыка паліклінікі і главы мясцовага органа кіравання [58, арк. 2, 5, 7].

Шматлікія пастановы акупантаў рэгулявалі сферу дзетанараджэння. Мясцовым жанчынам забаранялася ўступаць у сувязі з нямецкімі вайскоўцамі і тым больш нараджаць ад іх дзяцей. Аднак



Витебский государственный технологический университет

такія дзеці з’яўляліся, і адзіных указанняў наконт іх будучага лёсу не існавала. Так, санітарны афіцэр Магілёўскай палявой камендатуры раіў “з расавых біялагічных меркаванняў” дазволіць штучна перарываць цяжарнасць мясцовых жанчын, каб народжаныя дзеці не сталі пазней “моцным праціўнікам нямецкага народа”. З другога боку, гэтых дзяцей, згодна яго разважанням, можна было выхоўваць у духу падпарадкавання і любові да Германіі, стварыўшы спецыяльныя дзіцячыя дамы. Такія перавыхаваныя дзеці пазней маглі б “стаць мастом паміж нямецкім і рускім народам” [256, с. 54]. Мерапрыемствы, накіраваныя на ахову мацярынства і клопат пра дзяцей, насілі выбарачны характар: прыярытэт мелі фольксдойчэ, а таксама асобы, карысныя для рэйха. На жанчын-фольксдойчэ распаўсюджваўся Закон аб ахове мацярынства 1942 г., які дзейнічаў на тэрыторыі Германіі ў дачыненні да яе падданых. Дапамога па нараджэнні дзіцяці складала 50 RM [256, с. 56]. Ненямецкія жанчыны атрымлівалі дапамогу ў залежнасці ад памеру заробку.

У перыяд акупацыі ў шэрагу рэгіёнаў працавалі малочныя кухні, прызначаныя забяспечваць сумесямі нованароджаных, а таксама дзяцей, што выхоўваліся ў Дамах немаўлят. Улады не ліквідавалі савецкую практыку падтрымкі насельніцтва, каб у нейкай меры выклікаць давер жыхароў да сваёй дзейнасці. Як сведчаць дакументы, кухні працавалі з перабоямі. У выпадку закрыцця на рамонт некаторыя так і не адкрываліся з-за адсутнасці фінансавання (напрыклад, у г. Мінску) [112, арк. 164]. Нягледзячы на такое становішча, яны заставаліся фактычна адзінай магчымасцю атрымаць дадатковы, а для многіх і асноўны, паёк на дзіця. Так, у Брэсце колькасць замацаваных за кухнямі на працягу 1942 – 1943 гг. была пастаяннай: 140 – 150 чалавек [115, с. 128]. Разам з тым, забеспячэнне прадуктамі адбывалася ў рэчышчы агульнага снабжэння. Адчуваўся недахоп неабходных для сумесяў кампанентаў, якія названы ў дакументах “вострадэфіцытнымі”. Выдаваць іх паасобку (не ў выглядзе гатовага прадукту) забаранялася, але гэта правіла неаднаразова работнікі кухань парушалі [86, арк. 48].

Да злачынстваў гітлераўцаў у медыцынскай сферы неабходна аднесці выкарыстанне дзяцей у якасці донараў для нямецкіх салдат. Кроў славянскіх дзяцей лічылі чыстай, якая не магла сапсаваць арыйскую, нягледзячы на прынцып чысціні арыйскай расы і недапушчальнасці кантактаў з прадстаўнікамі славянскіх народаў. У адрозненне ад дзіцячых дамоў, якія ствараліся спецыяльна з гэтай мэтай, у дадзеным выпадку дзяцей гвалтоўна забіралі ў бацькоў і вывозілі ў падрыхтаваныя для填 забораў крыві месцы. Так, групу хлопцаў 12 – 14 гадоў (прыкладна 50 чалавек) фашысты адабралі ў лагеры для грамадзянскага насельніцтва ў в. Рудабелка і вывезлі ў г. Бабруйск, у адзін з нямецкіх шпіталяў [44, с. 3].



Витебский государственный технологический университет

Сацыяльная неабароненасць, экстрэмальныя ўмовы ваеннага часу, адсутнасць мужчынскай дапамогі, збядненне насельніцтва адбіліся на дэмаграфічным становішчы. Рэальную карціну дзіцячай нараджальнасці і смяротнасці на ўсёй тэрыторыі Беларусі цалкам аднавіць складана. Дэмаграфічныя працэсы можна прасачыць на прыкладзе асобных рэгіёнаў і пэўных храналагічных перыядаў. У сувязі з гэтым увагі заслугоўвае журнал рэгістрыцыі памерлых грамадзян г. Пінска за 1941 – 1943 гг., які захаваўся ў Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці. Дадзеныя журнала, а таксама звесткі па г. Магілёву за 1942 г. дазваляюць выявіць некаторыя характэрныя рысы працэсаў нараджальнасці і смяротнасці сярод дзяцей у гады вайны (дадатак В).

У журнале зафіксавана 1548 выпадкаў смерці людзей, з якіх 356 чалавек складаюць дзеці (23 % ад агульнай колькасці памерлых). З 356 памерлых 1926 – 1943 г.н. 220 з'яўляюцца яўрэямі, 121 − неяўрэйскага паходжання (вызначаліся па рэлігійнай прыналежнасці: праваслаўны, католік, евангеліст), на 15 чалавек звестак няма [57, арк. 1 – 49]. Паказчык смяротнасці за акрэслены перыяд сярод яўрэйскіх дзяцей складаў 64,5 %, а неяўрэйскіх – 35,5 %. Такія суадносіны тлумачацца ўмовамі пражывання ў гета, змяншэннямі хлебных норм і абмежаваным доступам да крыніц набыцця прадуктаў, асабліва ў 1942 г. Згодна журналу рэгістрацыі, пік смяротнасці сярод дзяцей гета прыйшоўся на перыяд з мая па кастрычнік 1942 г.: памерла 166 чал., прычым дзеці да трох гадоў складалі 72 % ад агульнай колькасці памерлых [114, с. 160]. Сярод прычын смяротнасці найбольш часта называюцца знясіленне арганізму, дыспепсія, розныя страўнікава-кішачныя захворванні. Галоўнымі фактарамі, якія выклікалі пералічаныя хваробы, сталі сістэматычнае недаяданне, недахоп якаснай пітной вады, холад, адсутнасць медыцынскай дапамогі. Неабходна адзначыць, што прычынамі смерці дзяцей 1927 – 1929, 1932 – 1933, 1942 гадоў нараджэння былі агнястрэльныя раненні. Па ўспамінах сведак, на тэрыторыі гета паліцэйскія сапраўды забівалі дзяцей, што знайшло сваё адлюстраванне ў дакуменце [114, с. 161]. Нягледзячы на больш спрыяльную сітуацыю для выжывання дзяцей-неяўрэяў (маецца на ўвазе магчымасць бацькоў уладкавацца на працу, атрыманне сацыяльнай дапамогі, наяўнасць агарода), карціна захворванняў і паказчыкі смяротнасці сярод дзяцей неяўрэйскай нацыянальнасці не маюць якасных адрозненняў.

Выдзелім некаторыя характэрныя рысы дэмаграфічных працэсаў у перыяд 1941 – 1944 гг.:

1. Вялікая Айчынная вайна, на думку германскага гісторыка Х. Герлаха, стала дэмаграфічнай катастрофай для Беларусі. Такую выснову ён зрабіў абапіраючыся на падлікі стратаў сярод дзяцей да 14 гадоў у раёне Барысаў – Орша – Магілёў, якія складалі 51 %. За 1941 –



Витебский государственный технологический университет

1947 гг. на тэрыторыі Беларусі не нарадзілася каля 800000 дзяцей [329, с. 1159]. Наколькі істотнымі былі страты сярод дзіцячага насельніцтва, можна таксама прасачыць па змяншэнні колькасці дзяцей школьнага ўзросту (7 – 15 гадоў). Так, да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў школах Беларусі навучалася 1826129 чалавек, на 5 кастрычніка 1944 г. было зарэгістравана толькі 1222852 [269, с. 207, 210]. Некаторыя ўяўленні даюць і вынікі перапісу насельніцтва 1959 г. Узрост 13 – 16-гадовых у 1959 г. адпавядаў народжаным у 1942 – 1945 гг. Гэта група аказалася значна меншай, чым яна магла б быць пры ўзроўні нараджальнасці як у даваенны час (прыкладна 640 тыс. чалавек). Пра гэта сведчыць і колькасць навучэнцаў першых чатырох класаў у 1950 – 1954 гг. Па падліках савецкіх навукоўцаў, у гады вайны “неданарадзілася” прыкладна 35 % дзяцей [319, с. 50].

2. Самыя высокія паказчыкі смяротнасці сярод дзяцей, якія нарадзіліся з 1940 па 1943 гг. Напрыклад, сярод дзяцей г. Пінска 1941 г.н. смяротнасць складала 39,3 %. У параўнанні з астатнімі ўзроставымі групамі яны аказаліся найменш жыццяздольнымі ў экстрэмальных умовах вайны. Нельга не сказаць пра згубны ўплыў стрэсаў, якія перажывалі цяжарныя жанчыны ад забойстваў сваякоў, сацыяльнай неўладкаванасці. У журнале рэгістрацыі памерлых у такіх выпадках адзначалася: “без імені”, “мёртванароджаны”, “смерць пры родах”.

3. Параўнальны аналіз захворванняў дзяцей г. Пінска паказвае, што найчасцей яны паміралі ад страўнікава-кішачных захворванняў, дыспепсіі, а таксама запалення лёгкіх. Пры ўсіх адрозненнях у прычынах, што выклікалі гэтыя хваробы, асноўным было агульнае знясіленне арганізма. Да гэтага дадаваліся неспрыяльныя ўмовы жыцця: адсутнасць патрэбнага харчавання, адзення, медыцынскай дапамогі, холад.

4. Узровень нараджальнасці істотна знізіўся, пачынаючы з 1942 г. У другой палове 1941 г., у параўнанні з наступнымі гадамі акупацыі, нараджальнасць была самай высокай, паколькі пасля 22 чэрвеня 1941 г. і да вясны 1942 г. на свет з’яўляліся дзеці, якімі былі цяжарныя жанчыны яшчэ да пачатку вайны. Напрыклад, у Віцебску за перыяд з ліпеня 1941 па ліпень 1942 гг. нарадзілася 1687 чалавек, а за 1942 г. толькі 577 [76, арк. 35; 77, арк. 10 зв.]. Гэтым жа можна патлумачыць і такую высокую смяротнасць сярод дзяцей гэтага перыяду (хуткая змена і пагаршэнне ўмоў жыцця, нестабільнасць грамадства).

Сферай, у якой германскія ўлады адразу прынялі шэраг мер, сталі працоўныя адносіны. Паколькі адной з мэт нацысцкай палітыкі было выкарыстанне працы мясцовага насельніцтва на патрэбы нямецкай арміі, то на працягу 1941 г. праводзілася рэгістрацыя працаздольных жыхароў. Улікам рабочай сілы займаліся біржы працы, створаныя пры акупацыйных органах улады. У жніўні 1941 г. рэйхсміністр па справах



Витебский государственный технологический университет

акупаваных усходніх абласцей А. Розэнберг выдаў распараджэнне аб увядзенні абавязковай працоўнай павіннасці для насельніцтва Остланда ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў [21, с. 45]. Аднак, у розных рэгіёнах Беларусі працоўную павіннасць выконвалі, пачынаючы з 14 гадоў, што пацвярджаецца архіўнымі дакументамі. У дачыненні да дзяцей-фольксдойчэ дзейнічаў Нацыянальны дэкрэт аб працы, у якім "дзіцячая праца ў перыяд вайны забаранялася законам" [206, арк. 122]. Дзяцей захопленых усходніх тэрыторый выкарыстоўвалі як на прымусовых работах у межах рэспублікі, так і вывозілі ў Германію. Палітыка ў гэтый сферы прайшла некалькі этапаў, на кожным з якіх меліся свае асаблівасці.

1 этап. Пасля захопу тэрыторыі Беларусі і ў пачатку 1942 г. асноўны рабочы кантынгент складалі працаздольныя кваліфікаваныя мужчыны і ваеннапалонныя. На гэтым этапе нават не абмяркоўвалася пытанне пра выкарыстанне савецкага насельніцтва на працы ў Германіі. Акупанты разглядалі дзяцей і падлеткаў у якасці дадатковай працоўнай сілы па расчыстцы ад руінаў, снежных заносаў і рамонце дарог пад кантролем нямецкіх ваенных [193, арк. 116], а таксама па размініраванні, зборы неўзарваных снарадаў і на іншых небяспечных для жыцця работах. За невыкананне такіх распараджэнняў, непадпарадкаванне заяўлялася, што "каждый сурово и беспощадно будет наказан" [69, арк. 14 зв.]. Нягледзячы на ўвядзенне жорсткіх пакаранняў, падлеткі і моладзь імкнуліся ўхіліцца ад выканання павіннасці. Так, у г. Магілёве з 565 чалавек 16-21-гадовага ўзросту, што не з'явіліся па запатрабаванні біржы працы, палова з'ехала ў сельскую мясцовасць, астатнія праігнаравалі загад [84, арк. 35]. У дакументах акупацыйныя ўлады называлі такіх падлеткаў "лодырями", што свядома ўхіляюцца ад працы, і ў якасці пакарання накіроўвалі іх у турмы для грамадзянскага насельніцтва [239, арк. 148].

Дзеці ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў не мелі кваліфікацыі, многія не паспелі скончыць нават абавязковай школы. Першапачаткова ў сваіх планах па эксплуатацыі захопленых зямель і германізацыі насельніцтва нацысты не прадугледжвалі прафесійнае навучанне дзяцей. Як адзначалася вышэй, для іх было дастатковым скончыць 4 класы пачатковай школы і ва ўсім падпарадкоўвацца новай уладзе. Па прыблізных падліках акупантаў узроставая група 10-19-гадовых складала ва ўсходніх абласцях 25 %, у заходніх – 17,1 % [20, с. 32]. Яна вызначалася гітлераўцамі як запас працоўнай, але некваліфікаванай сілы, якую без цяжкасцяў можна будзе выкарыстаць у будучым.

2 этап. Паражэнне вермахта пад Масквой і зрыў бліцкрыга, дэфіцыт рабочых рук у рэйху прымусіў гітлераўскае кіраўніцтва перагледзець свае рашэнні наконт выкарыстання ўсходніх рабочых. Пачаліся мабілізацыі на працу ў Германію, а ўжо з восені 1942 г. стаў

Витебский государственный технологический университет

адчувацца недахоп рабочых непасрэдна на тэрыторыі Беларусі [16, с. 174]. Акрэсленыя прычыны вызначылі змены ў працоўнай палітыцы германскіх улад у адносінах да дзяцей. Падлеткі задзейнічаны ўжо не толькі на дадатковых работах, а часткова замянілі “дарослую” рабочую сілу. Так, на лесараспрацоўках Хімкава-Слабадского ўезда Бабруйскага раёна з 56 чалавек 8 былі ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў [101, арк. 57]. З аднаго боку, такое становішча задавальняла ўлады, бо дазваляла мабілізаваць патрэбную колькасць рук у рэйх. Аплата працы некваліфікаванага работніка (а падлеткі адносіліся менавіта да гэтай катэгорыі) ацэньвалася у памеры 50 – 70 % ад зарплаты кваліфікаванага [14, с. 298]. З другога боку, нягледзячы на такія эканамічныя выгады для акупацыйных улад, падлеткі не валодалі прафесійнымі навыкамі і не маглі замяніць спецыяліста, на выкананне імі пэўнай работы патрабавалася больш часу. Мясцовыя камендатуры скардзіліся, што бургамістры высылаюць па іх запатрабаванні для працы не дарослых працаздольных людзей, а дзяцей ці хворых [101, арк. 84].

Улічваючы, што 10-19-гадовая ўзроставая група займала па колькасці (пасля жанчын) у структуры беларускага грамадства значнае месца, а кваліфікаваных рабочых рук не хапала, германскія чыноўнікі з сярэдзіны 1942 г. разглядалі магчымасць прафесійнага навучання падлеткаў з наступным іх выкарыстаннем на патрэбы рэйха. Каб зацікавіць маладых людзей у прафесійным навучанні, акупанты разгарнулі шырокую агітацыйна-прапагандысцкую кампанію. У інструкцыях па адукацыі падкрэслівалася, што “в школах еще с детского возраста необходимо указывать на значимость ремесленной деятельности” [191, арк. 166]. Ужо ў маі 1942 г. зафіксаваны выпадкі выкарыстання вучняў школ Пінскага раёна на сельскагаспадарчых работах. У дакуменце акруговага школьнага інспектара падкрэслівалася, што “калі ваеннае становішча патрабуе выкарыстання школьнікаў, то патрабаванні павінны быць выкананы” [282, с. 232]. Такія ўказанні ніколькі не супярэчылі праграме анямечвання, наадварот, садзейнічалі яе рэалізацыі праз працоўнае навучанне.

1942/1943 навучальны год быў аб’яўлены годам разбудовы сярэдняй спецыяльнай школы на тэрыторыі ГАБ [121, с. 13]. Была распрацавана сістэма, якая ўключала некалькі профільных накірункаў: сельскагаспадарчы, тэхнічны, гандлёвы, гуманітарны і працоўны. Навучанне ў школах давала магчымасць атрымліваць сталы заробак або стыпендыю, калі такія прадугледжваліся. Так, у г. Магілёве ў вучылішчы на гандлёвым аддзяленні навучалася 45 чалавек, з іх 37 былі 13-16-гадовага ўзросту, на прамысловым адпаведна 170 і 72. Пры умове атрымання разраду выплачвалася зарплата ў памеры 200 руб. [85, арк. 1 – 12]. Хаця падлеткі і мелі статус вучняў, на іх распаўсюджваліся агульныя патрабаванні, што дзейнічалі ў сферы працоўных адносін: 54-

Витебский государственный технологический университет

гадзінны рабочы тыдзень, праца ў выхадныя і святы па патрабаванні ўлад [21, с. 186]. Пасля заканчэння вучобы іх рэгістравалі на біржы працы і адпраўлялі на работу згодна запытам мясцовых арганізацый ці на працу ў Германію.

Агітацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы, у якіх распавядалася пра ўсе плюсы навучання, не прынеслі жаданага выніку. Дакументы сведчаць, што прафесійныя школы не карысталіся папулярнасцю. Па прызнанні чыноўнікаў, жадаючых вывучаць рамёствы сярод падлеткаў было менш, чым тых, хто хацеў бы працягваць навучанне ва ўніверсітэтах ці застацца працаваць на сельскай гаспадарцы. Тым больш, што статус вучня не даваў гарантыі ад вывазу ў Германію. Так, у лютым 1943 г. у час заняткаў у Баранавіцкай гандлёвай школе “вооруженные гитлеровцы с собаками оцепили школу и стали производить отбор учеников. По всем убегающим открывали стрельбу и натравливали собак для их задержания. В этот день было схвачено и отправлено в Германию 150 чел. учащихся” [293, с. 243].

Нягледзячы на занятасць у прафесійных школах, заставалася значная колькасць моладзі, якая, па меркаваннях улад, не толькі “нідзе і нічога не вывучала”, але і папаўняла партызанскія і падпольныя шэрагі. У снежні 1942 г. на пасяджэнні, дзе прысутнічаў генеральны ўпаўнаважаны па выкарыстанні працоўнай сілы ў Остландзе оберштурмбанфюрэр Бёнінг, было адзначана, што ўзнікла тэрміновая неабходнасць паслаць вялікую колькасць усходніх рабочых у рэйх. Аднак з-за недахопу кваліфікаванай сілы на тэрыторыі ГАБ зрабіць гэта немагчыма. Тады кіраўнік аддзела працы ГКБ Фройдэнберг прапанаваў накіраваць у Германію старэйшых школьнікаў і моладзь ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў, забяспечыўшы ёй праходжэнне самых простых прафесійных курсаў у асобых лагерах [21, с. 228]. Планавалася, што можна будзе набраць па 7 – 8 тыс. чалавек кожнай узроставай групы. Гэта давала нацыстам магчымасць не толькі выканаць квоту па пастаўцы працоўнай сілы, але і вывезці за межы ГАБ палітычна ненадзейную частку падрастаючага пакалення. У будучым яна павінна была стаць дысцыплінаванай рабочай сілай пры засяленні немцамі ўсходніх зямель.

У 1943 г. працэс прыцягнення дзяцей старэйшага школьнага ўзросту да прафесійнага навучання набыў прымусовы характар. Каб ведаць колькасць падлеткаў “у прафесійна здольным веку”, В. Кубэ выдаў распараджэнне ад 1 сакавіка 1943 г. аб абавязковай рэгістрацыі вучняў на біржах працы на працягу 4-х тыдняў пасля заканчэння імі абавязковай школы [107, арк. 106]. Паколькі падобныя загады ігнараваліся падлеткамі, то ўлады прымянялі рэпрэсіўныя метады. Насельніцтва адбіралася з дапамогай аблаў. Адна з такіх акцый пад



Витебский государственный технологический университет

назвай “Цаўберфлетэ” была праведзена ў г. Мінску ў красавіку 1943 г. Усіх беспрацоўных мужчын ва ўзросце ад 14 гадоў і жанчын ад 16 гадоў адпраўлялі ў штабы па ўліку працоўнай сілы, з якіх яны размяркоўваліся для працы на мясцовых прадпрыемствах ці адпраўляліся ў Германію [22, с. 82].

Агітацыю сярод падлеткаў і моладзі ва ўзросце ад 14 да 20 гадоў для наступнай добраахвотнай адпраўкі ў Германію праводзілі калабарацыянісцкія сілы. Бацькоў і дзяцей запэўнівалі, што, выязджаючы туды на працу, яны выконваюць свой патрыятычны абавязак перад Беларуссю [21, с. 205]. У чэрвені 1943 г. па лініі СБМ для работы на нямецкім заводзе Юнкерса было перададзена 1000 хлопцаў ва ўзросце ад 15 да 21 года. Тэрмін іх працы быў неабмежаваны [22, с. 104]. Нягледзячы на прапагандуемы акупантамі добраахвотны характар мерапрыемстваў, улады пры правядзенні дэпартацый кіраваліся шэрагам сакрэтных дырэктыў. Адна з іх была выдадзена кіраўніком БНС І. Ермачэнкам у лістападзе 1942 г. У ёй загадвалася завербаваць з кожнага павета ГАБ па 120 маладых асоб, у першую чаргу з тых, хто не прыносіць сваёй працай карысці Беларусі, хто “спачувае партызанам або паходзіць з польскіх колаў” [133, с. 104; 106, арк. 108].

У тылавым раёне групы армій “Цэнтр” вербавалася насельніцтва пачынаючы з 15-гадовага ўзросту. Хаця ў дакументах агаворваліся катэгорыі асоб, якія не падлягалі вывазу (падлеткі маладзейшыя за 15 гадоў, паліцэйскія і іх сем’і, жанчыны, у якіх былі дзеці ва ўзросце да 10 гадоў [95, арк. 264]), такая выбіральнасць мела досыць умоўны характар, паколькі пры адступленні нямецкай арміі азначаныя вышэй катэгорыі насельніцтва таксама эвакуіраваліся і перапраўляліся ў Германію.

Ужо ў 1942 г. добраахвотная вярбоўка не забяспечвала выкананне ўстаноўленых квот на вываз рабочай сілы. Так, у выніку правядзення акцыі “ўсходнія работніцы” замест плануемых 30 тыс. дзяўчат і жанчын ад 15 гадоў у ГАБ набралі толькі 100 чалавек [22, с. 14]. Такія абставіны абумовілі пераход да прымянення рэпрэсіўных метадаў пры наборы рабочых. Адным з найбольш эфектыўных стаў захоп грамадзянскага насельніцтва падчас правядзення карных аперацый супраць партызан. Згодна загаду Г. Гімлера, пачынаючы з лістапада 1942 г., пры правядзенні антыпартызанскіх экспедыцый неабходна “ўсё працаздольнае насельніцтва браць у палон, каб потым накіроўваць у рэйх” [21, с. 208]. Мужчыны 15-60-гадовага ўзросту, захопленыя ў “бандыцкіх” раёнах, лічыліся ваеннапалоннымі і адразу перапраўляліся на зборныя пункты. Туды траплялі і працаздольныя жанчыны такога ж узросту, жанчыны з дзецьмі, калі палова з іх была старэйшая за 10 гадоў. Наколькі на практыцы прытрымліваліся гэтага распараджэння (адбор дзяцей старэйшых за 10 гадоў), сказаць цяжка. У выніковых



Витебский государственный технологический университет

справаздачах аб выніках карных экспедыцый даваліся агульныя звесткі па колькасці захопленых дзяцей. Так, у час правядзення аперацыі “Зімняе чараўніцтва” (чэрвень 1943 г.) – 1000 чалавек дзяцей [221, арк. 86], аперацыі “Герман” (ліпень – жнівень 1943 г.) у палон трапілі дзеці ў колькасці 4178 чалавек, аперацыі “Фрыц” (верасень – кастрычнік 1943 г.) – дзеці ў колькасці 1708 чалавек [18, с. 160, 608]. Любая сям’я, якую западозрылі ў сувязях з партызанамі, безагаворачна адпраўлялася ў рэйх, незалежна ад узросту і колькасці дзяцей. Германскія ўлады лічылі, што сістэма прымусовай працы стане сродкам перавыхавання палітычна ненадзейных.

З 1943 г. быў уведзены метад правядзення набору рабочай сілы ў адпаведнасці з годам нараджэння. Рашэнне пра выбар года, які падлягаў набору, прымалася ў Берліне. У ГАБ абавязковаму набору падлягалі дзяўчаты ад 16 да 22 гадоў (1921 – 1927 г.н.), а ў рамках закрытага вывазу – дзеці 13- і 14-гадовага ўзросту. Для дзяцей у пачатку 1943 г. загадам Г. Гімлера на тэрыторыі рэйха былі створаны спецыяльныя лагеры, дзе яны праходзілі расавы адбор і прывучаліся да паслухмянасці новай уладзе [133, с. 81].

3 этап. Пасля паражэння Германіі ў Сталінградскай і Курскай бітвах і пачатку вызвалення ў верасні 1943 г. тэрыторыі Беларусі насельніцтва прыцягвалася акупантамі да абарончых работ у раёнах баявых дзеянняў. Па сведчанні штаба партызанскага злучэння ў Асіповіцкім раёне, па загадзе нямецкага камандавання праводзіліся прымусовыя мабілізацыі мужчын ад 15 і жанчын ад 16 гадоў на пабудову ўмацаванняў шляхам аблаў, акружэння вёсак [242, арк. 114]. Недахоп дарослай мужчынскай сілы прывёў да таго, што гітлераўцы выкарыстоўвалі падлеткаў і жанчын. З 7 чалавек в. Цяплуша і Дубоўка, што знаходзіліся на акопных работах, 5 былі 15-16-гадовага ўзросту [102, арк. 476]. Тых, хто спрабаваў пакінуць працоўнае месца, назад вярталі сілай [83, арк. 50]

Пры адступленні ваенныя часці выконвалі загад А. Гітлера аб эвакуацыі ўсіх мужчын ва ўзросце ад 15 да 65 гадоў, а таксама, пры магчымасці, асноўнай масы грамадзянскага насельніцтва, якое пазней планавалася выкарыстаць як працоўную сілу. Катастрафічным стала становішча гарадскога і сельскага насельніцтва ва ўсходняй Беларусі пасля таго, як на мяжы 1943/1944 гг. армейскае камандаванне запатрабавала татальнага “использования рабочей силы без учета возраста и половых различий” для правядзення работ у прыфрантавых раёнах [16, с. 176]. Менавіта ў канцы 1943 – 1944 гг. была створана найбольшая колькасць лагераў для ўтрымання грамадзянскага насельніцтва, якое выкарыстоўвалі на прымусовых работах на лініі абароны нямецкай арміі (працоўных, а таксама рабочых калон, батальёнаў. З 32, на якія ёсць звесткі па часе стварэння, на 1943 – 1944



Витебский государственный технологический университет

гг. прыпадае 25 лагераў). Так, у лагеры ў пас. Барчанкі Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці знаходзілася 150 чалавек дарослых і непаўналетніх дзяцей, якіх выкарыстоўвалі на цяжкай працы [307, с. 27]. Адначасова на тэрыторыі Беларусі дзейнічала распараджэнне ўпаўнаважанага па барацьбе з партызанамі фон Баха аб абавязковай эвакуацыі грамадзянскага насельніцтва з раёнаў, ахопленых партызанскай дзейнасцю, з наступным размяшчэннем жанчын і дзяцей у лагерах і накіраваннем працаздольных у рэйх.

Ужо восенню 1943 г. нацысты актывізавалі вываз дзяцей у Германію. Паміж 16 верасня і 15 кастрычніка 1943 г. з тэрыторыі гаспадарчай інспекцыі "Цэнтр" у рэйх прывезлі 6730 непаўналетніх, у лістападзе – 12895 чалавек; з 4 кастрычніка да 18 снежня з раёна Орша – Барысаў – Магілёў вывезлі дзяцей у колькасці 2680 чалавек, звыш паловы з якіх былі зарэгістраваны ў зборных пунктах як прыдатныя для працы ў рэйху [260, с. 187]. За студзень – чэрвень 1944 г. з тэрыторыі ГАБ і тылавога раёна групы армій "Цэнтр" дэпартавалі 5814 чал. ад 10 да 14 гадоў, 5390 да 10 гадоў (усяго 14 % ад агульнай колькасці) [19, с. 97].

Пры адступленні гітлераўцам не было часу праводзіць адбор і медыцынскі агляд остарбайтараў. Так, у транспарце, які прыбыў у Германію 26 лютага 1944 г. для працы ў вугальных шахтах, сярод працаздольных усходніх рабочых аказалася 13 дзяцей ва ўзросце ад 13 да 15 гадоў, якія, аднак, былі прызнаны прыгоднымі для працы, і 13 немаўлят. З 56 прыбыўшых толькі 31 чалавек "мог быць выкарыстаны, а астатнія проста папоўнілі лагер". У транспарце 12 мая 1944 г. з 50 чалавек налічвалася 22 непаўналетніх ва ўзросце ад 1 да 14 гадоў [22, с. 365]. Вясной-летам 1944 г. па ўсёй тэрыторыі Беларусі былі праведзены аперацыі па захопу дзяцей і падлеткаў. Вайскоўцы акружалі вёскі, урываліся ў дамы і сілай забіралі дзяцей у бацькоў. У некаторых раёнах (напрыклад, Гродзенскім, Свіслацкім, Скідзельскім, Сакалішчанскім) іх вывозілі па развёрстках [130, с. 114].

Спецыяльная каманда "Цэнтр", што размяшчалася ў г. Мінску, займалася адпраўкай падлеткаў на ваенныя нямецкія прадпрыемствы. Была распрацавана "акцыя Сено", у рамках якой неабходна было захапіць 40 – 50 тыс. чалавек ва ўзросце 10-14-ці гадоў. Іх планавалася выкарыстаць на акупаваных тэрыторыях "как особо надежную строительную силу" [264, с. 310]. У канцы чэрвеня 1944 г. нечаканым ударам на станцыю Блужа Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці савецкія танкісты 65-й арміі 1-га Беларускага фронта адбілі ў фашыстаў 22 вагоны з дзецьмі [21, с. 25]. Прымусовыя дэпартацыі дзяцей і падлеткаў дасягалі адразу некалькіх мэт: па-першае, вывозілі патэнцыяльных і непасрэдных удзельнікаў антыфашысцкага супраціўлення, па-другое, падрывалі біялагічную аснову беларускага народа, па-трэцяе, вырашалі



Витебский государственный технологический университет

вытворчыя задачы, па-чацвёртае, праз сістэму фільтрацыі на тэрыторыі Германіі адбіралі найбольш прыгодных у расавых адносінах для наступнага анямечвання.

На думку журналіста Ул. Літвінава, які доўгі час даследаваў праблему вывазу савецкіх дзяцей у рэйх, для іх была створана праграма адбору і перавыхавання [165, с. 21]. Існавалі спецыяльныя лагеры, дзе прывучалі паслухмяна выконваць загады, працаваць, забываць Радзіму, сям'ю, мову, праводзілі медыцынскія эксперыменты, бралі кроў для нямецкіх салдат. Да такіх лагераў аўтар адносіць лагер у Патуліцэ (з лістапада 1943 г. па жнівень 1944 г. знаходзіліся дзеці ў колькасці 542 чалавекі), у Штутгафе, Маутхаузэне, у Канстантынуве (больш за 2 тыс.). Па дадзеных СНК БССР у Германію было выгнана 399374 чал., з якіх – дзяцей да 16 гадоў 33244 чалавекі (8,3 %) [22, с. 381]. Колькасць вывезеных па абласцях бачна з дадатку Г.

Разгледзеўшы праблему выкарыстання працы дзяцей у перыяд акупацыі, можна зрабіць некаторыя абагульненні і вывады:

1. Адметнай рысай працоўнай палітыкі акупантаў з'яўлялася выкарыстанне падлеткаў і старэйшых школьнікаў у вытворчасці і на прымусовых работах, што мела ярка акрэслены характар генацыду. У адносінах да гэтай узроставай катэгорыі прымяняліся выключна рэпрэсіўныя метады эксплуатацыі. Танная праца дазваляла ў некаторай ступені пакрыць недахоп кваліфікаваных кадраў на месцы. Аднак падлічыць дакладную колькасць такіх работнікаў не ўяўляецца магчымым.

2. З тэрыторыі Беларусі было вывезена 33244 асобы да 16 гадоў. Падлікі па асобных рэгіёнах, на якія была падзелена Беларусь у гады акупацыі, паказваюць, што найбольшая колькасць дзяцей была выгнана з тылавога раёну групы армій "Цэнтр" – прыкладна 18,5 тысяч, у тым ліку з тэрыторыі Віцебшчыны каля 13 тыс. Некаторыя даследчыкі (Ул. Літвінаў, Л. Анікееў) тлумачаць гэта тым, што менавіта на тэрыторыі Прыдзвіння партызанскі рух набыў найбольшую моц, спасылаючыся пры гэтым на словы П.М. Машэрава [6, с. 17]. Адпаведна дзеянні партызан прымушалі акупантаў узмацняць рэпрэсіўную палітыку, якая праявілася ў карных аперацыях і прымусовых дэпартацыях грамадзянскага насельніцтва, у тым ліку і дзяцей, у рэйх за сувязь з партызанамі. На наш погляд, такое тлумачэнне слушнае, але не зусім поўнае. Колькасныя дадзеныя, прыведзеныя вышэй, тлумачацца асаблівасцямі кіравання, устаноўленага ў тылавым раёне групы армій "Цэнтр". Амаль увесь аб'ём паўнамоцтваў належаў прадстаўнікам ваеннай адміністрацыі, асноўнай мэтай дзейнасці якіх было забеспячэнне належнага становішча ў тыле ўласнай арміі. Адпаведна прыярытэтнымі мерамі пакарання за супраціўленне сталі рэпрэсіўныя, у тым ліку карныя экспедыцыі, стварэнне лагераў, прымусовыя

Витебский государственный технологический университет

дэпартацыі. Да таго ж, з восені 1943 па чэрвень 1944 г. менавіта праз тэрыторыю тылавога раёна праходзіла лінія фронту. Усё насельніцтва з прыфрантавых абласцей падлягала эвакуацыі. У залежнасці ад працаздольнасці і патрэб германскай эканомікі яго ці пакідалі на мясцовых работах, ці адпраўлялі ў Германію. Па астатняй тэрыторыі Беларусі фронт фактычна "пракаціўся", паколькі яе вызвалілі за два з паловай месяцы. Акупанты не паспявалі вывазіць насельніцтва ў вялікай колькасці, а хутчэй выкарыстоўвалі тактыку стварэння лагераў грамадзянскага насельніцтва на пярэднім краі абароны.

3. Неабходна адзначыць, што ў гады вайны штомесячная смяротнасць сярод остарбайтараў амаль у два разы пераўзыходзіла смяротнасць сярод насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі [152, с. 148]. Пры гэтым у няволі паміралі і хварэлі маладыя і патэнцыйна здаровыя людзі, якія не ўдзельнічалі непасрэдна ва ўзброеным супрацьстаянні. Медыцынскі агляд, які правялі пры вызваленні 180 непаўналетніх вязняў Асвенцыма, паказаў: 72 былі хворыя на туберкулёз, 49 – на дыстрафію, 41 мелі абмаражэнні [165, с. 462]. Гэтая тэндэнцыя назіралася і пры вяртанні остарбайтараў на Радзіму. Так, у фільтрацыйным лагеры ў г. Рэчыца за перыяд з 26.03.1946 па 12.04.1946 памерла 286 чалавек, з якіх 155 былі ва ўзросце да 16 гадоў (54 %) [222, арк. 2 – 7]. Па заключэнні ўрачоў прычынамі смерці сталі дыстрафія, таксічная дыспепсія, пнеўманія і знясіленне арганізму.

4. Нягледзячы на ўсе намаганні прапаганды, работа ў Германіі ўспрымалася насельніцтвам не як магчымасць зарабіць грошай ці набыць вопыт, а як пакаранне за сувязь з партызанамі і падпольшчыкамі ці толькі за пражыванне ў мясцовасці, "зараженной бандитами". У сувязі з гэтым дэпартацыі набывалі палітычную афарбоўку. З другой паловы 1943 г. ні адна сям'я не была застрахавана ад вывазу ў рэйх, нават з ліку тых, хто супрацоўнічаў з акупантамі. Такія змены закранулі і дзяцей. Фашысты ўвялі спецыяльнае азначэнне для дзяцей з партызанскіх сем'яў: "бандэн кіндэр". Трапіўшы ў перавыхаваўчыя германскія лагеры, яны насілі на адзенні чырвоныя трохкутнікі, што сымвалізавалі палітычных ворагаў рэйха [5, с. 79].

### 2.3 Дзіцячыя дамы, сады, яслі ва ўмовах акупацыі

З пачаткам вайны 23 чэрвеня ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне пра эвакуацыю ў двухдзённы тэрмін дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту з тых гарадоў, якія бамбардзіраваліся германскай авіяцыяй, і толькі за межы раёнаў [285, с. 16].

Афіцыйна Рэспубліканская эвакуацыйная камісія пры СНК БССР была створана 25 чэрвеня 1941 года, калі кіраўніцтва было ўжо ў Магілёве, куды яно выехала вечарам 24 чэрвеня пасля таго, як цэлы дзень праціўнік бамбіў Мінск [277, с. 47]. Асноўная функцыя камісіі –



Витебский государственный технологический университет

дапамога і каардынацыя дзеянняў па вывазе насельніцтва на ўсход. Але ні камісія, ні спецыяльныя эвакуацыйныя тройкі, створаныя на буйных чыгуначных вузлах, у абласных і раённых цэнтрах, ва ўмовах узмацнення і павелічэння інтэнсіўнасці бамбардзіровак, недахопу транспарту не маглі забяспечыць вываз усіх дзіцячых установаў. Многія з апошніх знаходзіліся далёка ад чыгункі, ад буйных шляхоў зносін (піянерскія лагеры, санаторыі, дамы адпачынку).

Агульнымі намаганнямі ўладаў, кіраўнікоў дзіцячых установаў, простымі людзьмі за межы Беларусі, у тыл, было вывезена 110 са 190 дзіцячых дамоў (каля 10 тыс. чалавек), 50 дзіцячых садкоў (2029 чалавек), 28 піянерскіх лагераў (3941 чалавек), 6 спецшкол і дзіцячых санаторыяў (465 чалавек) – агульнай колькасцю 16,7 тыс. Яшчэ 500 тыс. дзяцей выехалі ў тыл разам з дарослымі [120, с. 29]. Усяго да вайны ў БССР, уключаючы Беластоцкую вобласць, пражывала дзяцей у колькасці 4351 тыс. чалавек да 16 гадоў. Эвакуіраваць змаглі толькі 14 – 15 % [121, с. 5]. Астатнія засталіся на акупаванай тэрыторыі і вымушаны былі пераносіць усе цяжкасці акупацыі.

Некаторыя работнікі спрабавалі самастойна ўратаваць свае сем'і, асабліва калі мелі доступ да аўтатранспарту, нягледзячы на забарону з боку вышэйшага кіраўніцтва. Таму іх затрымлівалі і вярталі назад [61, арк. 130 – 131]. Такія ўчынкі называлі панічнымі ўцёкамі, якія дэстабілізуюць становішча сярод грамадзянскага насельніцтва.

Да канца жніўня 1941 года ўся тэрыторыя Беларусі аказалася занятай нямецкімі войскамі. На часова акупаванай тэрыторыі ўводзілася новая сістэма ўлады. Справай стварэння, забеспячэння, нагляду за станам дзіцячых установаў на тэрыторыі ГАБ займаўся пададдзел культуры, які падпарадкоўваўся галоўнаму аддзелу палітыкі, аднаму з чатырох у складзе Генеральнага камісарыята Беларусі. Функцыю кантролю ажыццяўляў Інспектарыят беларускіх школ, створаны ў пачатку лістапада 1941 г., на чале з Ё. Сівіцам, пры якім існаваў аддзел дзіцячых установаў. ГАБ складалася з 10 акруг (гебітаў), кожная з якіх мела свае аддзелы дзіцячых дамоў, садоў і ясляў.

У тылавым раёне групы армій "Цэнтр" кіраўніцтва належала ваеннаму камандаванню, якому падпарадкоўвалася цывільная ўлада. Кожная гарадская ўправа мела аддзел асветы і культуры, у якім па меры неабходнасці маглі існаваць пададдзелы школьных спраў, сектар дзіцячых дамоў і садоў (напрыклад, у Віцебскай гаруправе) [64, арк. 55], аддзел народнай адукацыі (напрыклад, у Магілёўскай гаруправе) [90, арк. 56]. На тэрыторыі рэйхскамісарыята "Украіна" таксама ствараліся адпаведныя аддзелы для кіраўніцтва сферай культуры. Так, пры гарадской управе г. Брэст-Літоўска (даваенны г. Брэст) існавала секцыя школы і культуры [55, арк. 48], пры Брэсцкім магістраце (адзін з

Витебский государственный технологический университет

органаў кіраўніцтва горадам) – аддзелы школьны і культуры і навукі [274, с. 134].

Апеку над дзецьмі ажыццяўляла і Беларуская народная самапомач, якая ў сваім статуце аб'явіла, што адна з мэт яе дзейнасці – "взять под опеку женщин и детей. Для выполнения поставленных задач "Самапомач" организует и поддерживает детские дома, детские ясли" [92, арк. 5]. Пры кіраўніку БНС існаваў Цэнтральны дзіцячы аддзел, потым аддзел аховы здароўя Цэнтральнага ўпраўлення БНС (пазней БСП). У 1944 г. пры Цэнтральным упраўленні БСП быў створаны пададдзел "Прытулкі", які і накіроўваў у дзіцячыя дамы дзяцей-сірот [285, с. 130].

Нягледзячы на разыходжанні ў структуры кіравання дзіцячымі ўстановамі, у сферу дзейнасці азначаных вышэй органаў уваходзілі стварэнне, забеспячэнне, кантроль за школамі, дзіцячымі дамамі, садкамі і яслямі, а таксама пазашкольнымі ўстановамі, кантроль за станам дзяцей у гэтых установах. Большасць матэрыялаў аб дзейнасці дзіцячых устаноў і жыцця там выхаванцаў у час акупацыі маецца менавіта ў справаздачах аддзелаў адукацыі і аховы здароўя, школьных інспектараў, Інспектарыята беларускіх школ.

Аналіз архіўных матэрыялаў сведчыць, што палітыка акупацыйных улад была накіравана як на захаванне неэвакуіраваных дзіцячых устаноў, так і на стварэнне новых. Пасля захопу тэрыторыі Беларусі гітлераўцы сутыкнуліся з праблемай беспрытульніцтва, паколькі бацькі многіх дзяцей, што бадзяліся па вуліцах, былі забіты падчас бамбёжак ці згубіліся ў калонах бежанцаў. Каб упарадкаваць і ўзяць пад кантроль гэтую з'яву, а таксама папулярызаваць новую ўладу сярод насельніцтва, 26 жніўня 1941 г. выйшаў загад Намесніцтва Мінскай акругі (створана 24 жніўня 1941 г.) пра неабходнасць уліку беспрытульных дзяцей і бежанцаў акругі, "беспрытульных дзяцей забяспечыць харчаваннем, хворых і слабых медыцынскай дапамогай, а таксама аказаць патрэбную дапамогу вопраткай" [104, арк. 143]. Але наўрад ці дадзены загад магчыма было ажыццявіць ва ўмовах абмежаванасці паўнамоцтваў органаў мясцовага кіравання (да 1 верасня 1941 г. улада ў ГАБ належала вайскоўцам). Наадварот, такое становішча адпавядала мэтам нацысцкай палітыкі на занятых усходніх тэрыторыях.

Усе дзіцячыя ўстановы, што не былі эвакуіраваны, трапілі пад нагляд акупацыйных улад. Адразу пільную ўвагу звярнулі на яўрэйскіх дзяцей. Яны аддзяляліся ад астатніх і падлягалі знішчэнню (Брэсцкі дзетдом, пазней, у красавіку 1942 г., 82 выхаванцы дзетдома "Крынкі" Асіповіцкай райуправы, 15 выхаванцаў дзетдома ў Дамачаве) ці перасяленню ў гета. Першапачаткова адбор і ізаляцыю дзяцей-яўрэяў праводзілі нямецкія вайскоўцы пры інспектаванні захопленых тэрыторый. Н. Куманяева, выхаванка Чэрвэньскага дзіцячага дома,

Витебский государственный технологический университет

успамінала, як гэта адбывалася: “В детдоме одно помещение отвели под гетто. Всех детей немцы согнали во двор, выстроили по рядам и стали отделять еврейских детей. Они хватали всех похожих, ... а мы все боялись, жались друг к дружке и не понимали, что происходит” [158, с. 219].

Пазней адборам займаліся спецыяльныя камісіі, што вызначалі нацыянальнасць па знешнім выглядзе. Працавалі яны рэгулярна, паколькі колькасць выхаванцаў у дзіцячых дамах і прытулках пастаянна мянялася. Чарговая праверка адбылася ў лістападзе 1941 г., па выніках якой аддзел дзіцячых установ Мінскай гарадской управы выдаў распараджэнне, дзе загадвалася: “На падставе зробленага агляду па вызначэнні нацыянальнасці 12 лістапада г.г., прапануем загадчыкам дзіцячых установ, у якіх выяўлены дзеці (яўрэйскія. – *Рэд.*), заўтра 14 лістапада 1941 г. к 10 гадзінам раніцы з’явіцца ў 21 пакой на вуліцы К.Маркса, д. 40, у аддзел дзіцячых дамоў, садоў і ясляў для атрымання пропуска для дастаўкі дзяцей у гета” [280, с. 101]. Некаторыя загадчыкі дзіцячых установ самі выдавалі фашыстам дзяцей-яўрэяў (дзіцячы прытулак у Драздах Мінскага раёна, Козыраўскі дзіцячы прытулак г. Мінска, Чэрвеньскі дзетдом).

Выхаванцы, асабліва малодшага ўзросту, не разумелі, чаму некаторых дзяцей забіраюць, абяцаючы ім лепшыя ўмовы жыцця і харчавання, але адчувалі, што нічога добрага не будзе. М. Кузняцоў успамінаў, што, нягледзячы на абяцанкі, “немцы грубо обращаются с детьми в выполнении своей миссии. Нам, жившим с Мулей в одной палате, было откровенно жалко и больно смотреть на него. В числе пока еще немногих, он – один из первых узников нацизма, о чем, скорее всего, уже и сам догадывался, правда, наверняка не зная, что это такое, национал-социализм, или германский фашизм, и какое отношение он имеет к его судьбе” [155, с. 68].

На працягу другой паловы 1941 г. дзіцячыя ўстановы на захопленай тэрыторыі Беларусі пастаянна папаўняліся. Дзеці прыходзілі з розных гарадоў і вёсак, іх падбіралі работнікі мясцовага апарата кіравання, паліцэйскія і здавалі ў дзіцячыя ўстановы. Дырэктар дзіцячага дома № 3 г. Бабруйска, які не паспелі вывезці ў тыл, у сваёй справаздачы Гарадскому ўпраўленню адзначаў, што “дети прибывают ежедневно ... из Витебска, Луцка, Бреста, Белостока”, з іншых дзіцячых дамоў (Свіслацкага, Чачэвіцкага) [98, арк. 9, 38, 43]. Каб справіцца з вялікай колькасцю дзяцей, якія раптам засталіся без бацькоў, улады г. Магілёва ў лістападзе 1941 г. вымушаны былі рэарганізаваць дзіцячы прытулак. З яго выдзелілі дзяцей старэйшых за восем гадоў і стварылі для іх дзетдом на 100 чалавек [89, арк. 103].

По меры стабілізацыі лініі фронту і ўстанаўлення акупацыйнага рэжыму праблема павелічэння колькасці беспрытульных дзяцей,

Витебский государственный технологический университет

дзяцей-сірот не знікла. Школьны аддзел пры ГКБ адзначаў, што, нягледзячы на вываз вясной 1942 г. 200 дзяцей з Мінска ў іншыя дзетдамы, "месцы іх даўно запоўнены, бо ў дзетдамы гораду штодзённа прыбывае 7 – 10 дзяцей-сірот з вуліцы і бліжэйшых да гораду раёнаў" [196, арк. 29]. Вясной 1943 г. у 25 дзіцячых дамах і прытулках ГАБ выхоўвалася каля 2 тыс. непаўналетніх [220, арк. 37 – 38]. Гэта дае падставу гаварыць пра тое, што дзяцей, якія бадзяліся па вуліцах ці былі ўзяты на выхаванне чужымі людзьмі, было значна больш, чым зафіксавана ў афіцыйных дакументах.

Адыграла сваю ролю і масавае збядненне насельніцтва, якое падкідвала сваіх дзяцей у дзіцячыя дамы ў надзеі, што там ім не дадуць памерці з голаду. Шмат дзяцей накіроўвалася ў дзіцячыя дамы ўправамі, паколькі бацькі не маглі іх забяспечыць. Перадача ажыццяўлялася з пісьмовай згоды бацькоў. Падставай для такіх дзеянняў часцей за ўсё станавілася бядотнае матэрыяльнае становішча. У якасці прыкладу прывядзём тэкст тыповай заявы ў Віцебскую гарадскую ўправу: "Прошу Городскую управу принять моих двух детей в детский дом в возрасте 4-х и 2-х лет ввиду того, что я не работаю и не могу их содержать. 1/XII-1941" [67, арк. 6]. Затым управа накіроўвала інспектара для абследавання матэрыяльнага стану гэтай сям'і. Ён даваў сваё заключэнне аб мэтазгоднасці накіравання дзяцей у дзіцячы дом. На наш погляд, істотную ролю ў гэтым адыгрываў стан здароўя прасіцеля. Калі яго можна было выкарыстаць на працы, то дзяцей накіроўвалі ў дзіцячую ўстанову, а бацьку ці маці рэгістравалі на біржы працы. Але, як паказваюць дакументы, бацькі ці сваякі імкнуліся забраць дзяцей назад, дадому. Так, у студзені 1943 г. у прытулак № 3 пры Мінскім гарадскім камісарыяце паступіла наступная заява: "Прошу вернуть мне моего ребенка, так как я устроилась и могу его содержать" [103, арк. 149].

Прытулак у дзіцячых дамах знаходзілі дзеці савецкіх і партыйных работнікаў, бо такія сем'і немцы рэпрэсіравалі ў першую чаргу. Выхавальнікі, якія не прынялі ідэі нацыянал-сацыялізму і заставаліся адданымі Радзіме, хавалі яўрэйскіх дзяцей пад рускімі прозвішчамі. Шляхі, па якіх траплялі дзеці ў дзіцячыя ўстановы, былі рознымі. У 1941 г. у дзіцячым доме-яслях № 1 г.Мінска налічвалася 16 выхаванцаў, з якіх 7 былі падкінуты, 5 накіравалі з прыёмніка (ізалятара), 2 – з санаторыя, 1 – з бальніцы, 1 уладкавала БНС [103, арк. 4]. Паступалі дзеці і з турмаў, куды іх забіралі разам з бацькамі. Так, кіраўніцтва Бабруйскай турмы ў маі 1943 г. перадала ў дзіцячыя дамы № 1 і № 2 дзяцей у колькасці 22 чалавекі ва ўзросце ад 2 месяцаў да 15 гадоў [93, арк. 64].

Стан дзіцячых дамоў, садоў, ясляў не адпавядаў санітарным нормам, не дазваляў стварыць нармальныя ўмовы для развіцця і

Витебский государственный технологический университет

існавання дзяцей. Падчас эвакуацыі многія дзіцячыя ўстановы былі разрабаваны [98, арк. 39], а тыя памяшканні, што знаходзіліся ў неблагім стане, аддаваліся пад размяшчэнне германскім салдатам (у Віцебску гэта былі будынкі 2-х дзіцячых садоў, 2-х дзіцячых ясляў) [67, арк. 46 – 50].

Такім чынам, вялікая колькасць беспрытульных дзяцей, якіх не паспелі вывезці ў тыл і якія страцілі бацькоў, стварала пэўныя праблемы для новай улады. З мэтай упарадкавання бадзяжніцтва і супрацьдзеяння распаўсюджанню інфекцыйных захворванняў акупанты не толькі не закрылі існуючыя дзіцячыя ўстановы, але і стваралі новыя. Своеасаблівы штуршок гэтаму працэсу ў ГАБ надаў загад В. Кубэ ад 10 верасня 1941 г., у якім гаварылася, што “пад нямецкім наглядам мусяць быць арганізаваны ва ўсіх гарадох дзіцячыя сады, якія возьмуць догляд над дзецьмі, маткі якіх працуюць” [104, арк. 147]. У Мінску, напрыклад, на 9 верасня 1941 г. працавалі 3 дзіцячыя дамы, 1 ізалятар, 9 ясляў-садоў. Да канца года колькасць дзіцячых дамоў дасягнула 11, садоў-ясляў стала таксама 11, з’явілася 1 калонія, 1 дзіцячы санаторый, 1 малочная кухня, 1 размеркавальнік [280, с. 57].

На тэрыторыях, што ўваходзілі ў тылавы раён групы армій “Цэнтр”, ваеннае камандаванне не спяшалася наладжваць дашкольную справу, таму тут адпаведны загад датаваўся вераснем 1942 г. Стварэнне новых дзіцячых устаноў мела на мэце не толькі вызваліць неабходны працоўны рэсурс і вырашыць праблему бадзяжніцтва, але і выхоўваць дзяцей у духу падпарадкавання новай уладзе. Менавіта праз гэтыя ўстановы, пачынаючы з дашкольнага ўзросту, праводзілася палітыка германізацыі.

У працэсе выхавання дзецям павінна было прывівацца пачуццё павагі і любові да Германіі, яе кіраўніка, да нямецкай арміі – “вызваліцельніце ад бальшавіцка-жыдоўскага засілля”. У метадычных указаннях інспектара дзіцячых дамоў Мінскага акруговага камісарыята падкрэслівалася, што “вялікае палітычнае і выхаваўчае значэнне мае азнаямленне дзяцей па малюнках і апавяданнях аб жыцці і дзейнасці правадыра Вялікай Нямеччыны Адольфа Гітлера, яго цёплых і чулых адносін да дзяцей. Для чаго скарыстаць брашурку “Адольф Гітлер і дзеці” [110, арк. 15]. Ва ўсіх дзіцячых установах забараняліся савецкія кнігі і падручнікі. Дазвалялася выкарыстоўваць толькі казкі дарэвалюцыйных выданняў. За гэта адказвалі дырэктары ўстаноў, з іх бралі падпіску за вядзенне выкладання прадметаў настаўнікамі згодна праграмам, якія прапаноўваліся германскімі ўладамі [99, арк. 1].

З другога боку, акрамя мерапрыемстваў па германізацыі, тая частка беларускіх палітычных колаў, якая супрацоўнічала з фашыстамі, праз дзіцячыя ўстановы імкнулася праводзіць выхаванне ў нацыянальным духу. У справаздачы аддзела дзіцячых устаноў за 1942 –



Витебский государственный технологический университет

1943 гг. адзначалася, што “дзіцячыя дамы і сады з’яўляюцца беларускімі ўстановамі і ўзгадаванне ў іх дзяцей павінна адбывацца толькі ў нацыянальна-беларускім кірунку, у працы з дзецьмі кіравацца толькі беларускай мовай” [110, арк. 14 – 16]. Беларускія нацыянальныя колы такім чынам імкнуліся як мага больш зменшыць польскі і рускі культурны ўплыў на дзяцей. Нягледзячы на вонкавы беларускі характар адукацыйнай палітыкі, германскія ўлады ў першую чаргу праводзілі германізацыю дзяцей і падлеткаў, прыкрываючы гэта нацыянальнай абалонкай. Інспектарыят беларускіх школ вызначыў мэты выхаваўчай працы з дзецьмі: “Дзіцячыя ўстановы павінны ўзгадаваць фізічна здаровую моладзь, для чаго кіраўнік установы разам з доктарам арганізуе жыццё дзяцей так, каб яны былі накормлены, увесь дзень былі разумна заняты, дзе моладзі прышчэпліваюць санітарна-гігіенічныя звычкі на працягу знаходжання яе ў дзіцячай установе” [110, арк. 14 – 16]. Як сведчаць архіўныя дакументы, жыццё выхаванцаў у дзіцячых дамах, садах, яслях у час акупацыі далёка не адпавядала задачам, акрэсленым Інспектарыятам, наадварот, было цалкам супрацьлеглым, паколькі стварэнне сапраўднай нацыянальнай школы, фінансаванне яе адпаведна патрэбам выхаванцаў не адпавядала планам акупантаў па падпарадкаванні і перавыхаванні падрастаючага пакалення.

У дзіцячых установах надавалася ўвага працоўнаму выхаванню. Згодна адной з мэт адукацыйнай палітыкі, падлетак павінен быў набыць якую-небудзь прафесію, каб з 14-16 гадоў яго можна было задзейнічаць на прадпрыемстве. Таму пры дзетдамах адкрывалі майстэрні, дзе дзеці вучыліся абутковай, пашывачнай справе, справе пляцення, лесаруба, працавалі на прысядзібных дзялянках і г.д. Прапаноўвалася нават увесці здзельную аплату, але, як правіла, дзеці працавалі бясплатна. Выхад на працу строга кантраляваўся. Так, за нявыхад на рабочае месца без прычыны выхаванцаў дзетдома № 1 г. Бабруйска ва ўзросце ад 12 да 16 гадоў палічылі звольненымі, а карткі на іх перадалі на біржу працы [100, арк. 276]. Працоўныя майстэрні пры дзіцячых установах адкрываліся з той жа мэтай, што і спецыяльныя прафесійныя школы, дазволеныя ўладамі ў 1942 г. Набыццё выхаванцамі канкрэтнай спецыяльнасці гарантавала атрыманне значнага рэзерву працоўнай сілы, якая магла б замяніць дарослых рабочых, вывезеных на працу ў рэйх. Ва ўяўленні акупацыйных улад дзіцячыя ўстановы павінны былі ўзгадаваць паслухмянага, прасякнутага ідэямі нацыянал-сацыялізму, працалюбівага падлетка, які б аддаваў усе сілы “Вялікай Германіі”.

У выніку хуткага прасоўвання нямецкіх войскаў па тэрыторыі Савецкага Саюза былі парушаны гаспадарчыя сувязі, і кіраўніцтва дзіцячых устаноў сутыкнулася з праблемай самастойнага набыцця для дзяцей ежы, вопраткі, рэчаў першай неабходнасці. Установы вымушаны былі перайсці на поўнае самазабеспячэнне, бо новыя ўлады не



Витебский государственный технологический университет

спяшаліся прымаць адпаведныя меры. У жніўні 1941 г. дырэктар Чэрвеньскага дзетдома адзначаў, што яшчэ "на два тыдні хопіць жыроў, манкі, мукі. Няма круп, мяса" [207, арк. 18]. Гэта, як правіла, былі тыя прадукты, што засталіся ад савецкіх паставак. Па ўспамінах былога выхаванца дзетдома "Дразды" М. Кузняцова, аб'ектам для нападу з боку выхаванцаў станавіліся сялянскія агароды, калгасныя палі. Дзеці збіралі ўсё, што можна было выкарыстаць у ежу [155, с. 86]. Да таго ж, як адзначалася вышэй, большасць дзіцячых устаноў пацярпела ад бамбардзіровак, маёмасць была раскрадзена. Дырэктар дзетдома № 2 г. Бабруйска скардзіўся Часоваму кіраўніцтву горада на тое, што "в детдом приходят военные и забирают что им нужно" [99, арк. 39].

Як сведчаць дакументы і ўспаміны былых выхаванцаў, найбольш цяжкай стала першая акупацыйная зіма, паколькі многія дзіцячыя ўстановы заставаліся па-за ўвагаю ўладаў нават да лета 1942 г. [159, с. 217]. Дзеці атрымлівалі па 40 г хлеба ў дзень (па іншых дадзеных 100 г). Акрамя гэтага, на снеданне ім давалі баланду з мукі, на абед – бульбу, на вячэру – зноў баланду [158, с. 220]. Многае ў справе забеспячэння дзяцей у гэты перыяд залежала ад кіраўніка ўстановы, наколькі той быў зацікаўлены ў выратаванні сваіх выхаванцаў. Дазволу на пастаўкі прадуктаў можна было дабіцца праз уласныя хаджэнні да акупацыйных уладаў. Так паступіў дырэктар дзіцячага дома ў в. Быкаўшчына. Ён звярнуўся за дапамогай да бургамістра Ветрына. Была прывезена мука, баландой з якой два разы на дзень кармілі дзяцей [321, с. 64]. Але не заўсёды падобныя прашэнні задавальняліся [285, с. 184].

Становішча з харчаваннем прывяло, як адзначаў у студзені 1942 г. інспектар дзіцячых устаноў Інспектарыята беларускіх школ, да павелічэння ліку хворых і слабых дзяцей [198, арк. 110]. Нават уведзеныя ў сакавіку 1942 г. на тэрыторыі ГАБ фіксаваныя тыднёвыя нормы харчавання для дзяцей, што выхоўваліся і жылі ў розных дзіцячых установах: 2100 г хлеба, 100 г мяса і мясных прадуктаў, 75 г жыроў, 400 г пажыўных сродкаў (питательных веществ. – *В.Б.*), 6000 г бульбы, 90 г кавы, 60 г цукру, 140 г мармеладу ці патакі [210, арк. 14], не маглі карэнным чынам палепшыць сітуацыю.

Хаця справаздачы інспектараў аддзелаў адукацыі, Інспектарыята беларускіх школ малявалі добрую карціну, рэальная сітуацыя заставалася катастрафічнай. Адзначалася, што ў дзень праверкі дзіцячых устаноў спецыяльна гатуюцца крыху лепшыя абеды, а ў астатнія дні дзеці галадаюць [110, арк. 1 – 3]. Неаднаразова кіраўнікі дзіцячых устаноў і аддзелаў апарата кіравання прызнавалі, што сапраўднае харчаванне дзяцей у параўнанні з іх мінімальнымі патрэбамі выклікае знясіленне арганізму, прыводзіць да інфекцыйных захворванняў [109, арк. 1]. Прымаліся і практычныя захады для вырашэння гэтай сітуацыі. Неаднарозова ўправы, інспектары дзіцячых



Витебский государственный технологический университет

аддзелаў хадайнічалі перад германскімі ўладамі пра выдзяленне для дзяцей дадаткова малочных прадуктаў, паколькі, як адзначалася ў прашэннях, “эти продукты являются единственным питанием” [72, арк. 85]. Аднак пры ўмове прыярытэтнага забеспячэння нямецкіх войск дзіцячыя ўстановы атрымлівалі дадатковае харчаванне нерэгулярна. Да месца тут будзе прывесці ў параўнанне дадзеныя па штодзённым рацыёне вайскоўца “добраахвотнага” рускага палка “Дзясна”. Акрамя фінансавай узнагароды, кожны атрымліваў 600 г хлеба, 25 г мяса, на снеданне і вячэру – 0,5 л кавы, 10 г сыру, 10 г алею, на абед – боршч з кансерваванай капусты [311, с. 41].

Сітуацыя ўскладнялася і тым, што ў многіх установах мелі месца выпадкі крадзяжу прадуктаў харчавання абслугоўваючым персаналам ці наўмыснае гатаванне ежы на большую колькасць чалавек (дзіцячы сад-яслі № 7 г. Мінска, дзіцячы сад № 13 г. Мінска, дзіцячы дом № 2 г. Бабруйска і г.д.). Кіраўнікі дзіцячых устаноў, выхавальнікі, абслуга ішлі на злоўжыванні, паколькі зарплата не адпавядала кошту прадуктаў на рынку. Некаторыя з іх дазвалялі харчавацца разам з выхаванцамі і сваім дзецям, сваякам. Дзеці вымушаны былі жабраваць, корпацца ў сметніках, каб знайсці там аб’едкі ежы. Яны заставаліся самай безабароннай групай грамадства. Іх жыццё залежала ад акупацыйных улад, якія рэалізоўвалі прынцыпы нацысцкай палітыкі аб непаўнацэннасці мясцовага насельніцтва, выкарыстанне мясцовых рэсурсаў на патрэбы Германіі і тым самым былі зацікаўлены ў нязменнасці сітуацыі з забеспячэннем дзіцячых устаноў.

Прыкладна гэтак жа складвалася сітуацыя ў дзіцячых садах, куды дзяцей прыводзілі бацькі толькі на час сваёй працы. Адрозненне было ў тым, што ў выпадку парушэнняў (неадпаведнага ўстаноўленаму харчавання ці непедагагічных адносін да дзяцей з боку выхавальнікаў) бацькі мелі права паскардзіцца ў Інспектарыят беларускіх школ. Адна з такіх скаргаў паступіла ад матуль дзяцей дзетсада № 7 г. Мінска вясной 1942 г. Пасля праведзенай спецыяльнай камісіяй праверкі скаргі пацвердзіліся: “у памяшканні брудна, кухня знаходзіцца ў антысанітарным стане. Кухарка займаецца крадзяжом прадуктаў” [195, арк. 118]. Аднак чым скончылася справа, прасачыць па дакументах не ўдалося.

Як бачна з дадатку Д, нормы забеспячэння дзіцячых устаноў (колькасны бок) па рэгіёнах Беларусі былі прыкладна аднолькавымі. Адной з крыніц дадатковага паступлення прадуктаў стала дапамога арганізацый, што займаліся апекаваннем дзіцячых устаноў і якія маглі якімсьці чынам паўплываць на іх забеспячэнне. Такую дапамогу дзецям аказвалі розныя арганізацыі. Так, напрыклад, у заходніх абласцях (напрыклад, Брэст) гэтую функцыю выконваў каталіцкі касцёл і праваслаўная царква. У кожнага дзіцяці Брэсцкага дзіцячага прытулку

Витебский государственный технологический университет

былі хросныя бацькі, якія бралі дзяцей на выхадныя дні, падкормлівалі [285, с. 138; 274, с. 122]. На тэрыторыі ГАБ апекаваннем, як адзначалася ў пачатку раздзела, займалася БНС (БСП). Яе члены збіралі ахвяраванні на карысць дзяцей-сірот (адзенне, прадукты харчавання), асабліва напярэдадні святаў (Новага года, Вялікдня). У красавіку 1942 г. Менскі раённы аддзел БНС адпусціў для дзетдома ў Трасцянцы 4,8 кг жыта, 2,2 кг грэчкі, 16 кг ячменя, 4,6 кг бульбы [217, арк. 1].

У тылавым раёне групы армій "Цэнтр" ініцыятыву па зборы ахвяраванняў узялі на сябе мясцовыя ўправы з дазволу ваеннага камандавання, аддзелы БНС (БСП). Матэрыяльнае становішча дзіцячых дамоў было настолькі цяжкім, што ў верасні 1943 г. газета "Новы шлях" надрукавала зварот да жыхароў Віцебска з просьбай аказаць дапамогу сіротам [137, с. 97]. Збіралі ў асноўным адзенне, паколькі ў насельніцтва магчымасць ахвяраваць прадукты была абмежаванай. Падобныя акцыі праводзіліся і іншымі ўправамі (напрыклад, Бабруйскай, Аршанскай). Аднак ахвяраванні гараджан, якія самі знаходзіліся ў стане здабыцця харчавання, не маглі сур'ёзна паўплываць на сітуацыю.

Рацыён выхаванцаў мог быць папоўнены за кошт апрацоўкі прысядзібных участкаў і ўтрымання жывёлы пры дзіцячых установах. У 1942 г. кіраўніцтва дзіцячых дамоў г. Віцебска выступіла з просьбай павялічыць памеры зямельных участкаў. Прычынай, якая прымусіла зрабіць так, стаў рост колькасці дзяцей. Кіраўнікі ўстаноў адзначалі, што "ўраджай вельмі недастатковы для пракармлення выхаванцаў" [65, арк. 217]. Улічваючы стан здароўя апошніх, іх узрост (ад нараджэння да 14 гадоў), наўрад ці яны былі здольныя апрацоўваць дзялянкі, плошча якіх дасягала 4-х га. Нават калі пры дзетдамах існавалі падобныя гаспадаркі, дзеці атрымлівалі нязначную частку прадуктаў. У Ракаўскім дзетдоме пры наяўнасці дзвюх дойных кароў дзецям давалі не цэльнае, а знятае малако, выхаванцы скардзіліся на дрэннае харчаванне [110, арк. 1 – 3]; некаторыя кіраўнікі прадавалі ўраджай з агародаў (напрыклад, дзетдом у Астрашыцкім Гарадку, у Клецку).

Праблемы, звязаныя з якасцю харчавання, забяспечанасцю ім дзіцячых устаноў, на ўсёй акупаванай тэрыторыі Беларусі былі аднолькавымі. Да іх можна аднесці і недахоп прадуктаў (з тых, што павінны былі складаць штодзённы рацыён дзяцей), немагчымасць набыць кіраўніцтвам некаторыя віды прадуктаў з-за недахопу грошай, дэфіцыту прадуктаў на складах (напрыклад, у дзіцячых садах г. Оршы адсутнічалі бульба, капуста, гародніна, хаця яны былі прадугледжаны ў рацыёне дзяцей [72, арк. 16]. Загадчык аддзела дзіцячых устаноў Мінскай акругі таксама прызнаваў, што "шмат якіх прадуктаў зусім не выдаецца (бульба, гародніна, тлушч, яйкі), а частка прадуктаў занадта памяншаецца (хлеб, булка, мяса, малако)" [109, арк. 1]), злоўжыванні персаналу дзіцячых устаноў, якія такім чынам самі карміліся, і галоўная



Витебский государственный технологический университет

прычына – нежаданне, незацікаўленасць акупацыйных улад у паўнацэнным забеспячэнні дзяцей.

Гаротны стан з харчаваннем ускладняла становішча з медыцынскім абслугоўваннем. Згодна штатнаму раскладу кожная ўстанова павінна была мець медыцынскага работніка, аднак у дзіцячых установах ён або адсутнічаў, або не выконваў свае службовыя абавязкі, як гэта было зафіксавана, напрыклад, у акце абследавання Горацкага дзетдома [71, арк. 582].

Да такіх непрафесійных адносін дадавалася праблема недахопу, а часцей за ўсё, адсутнасці медыцынскіх сродкаў для лячэння дзяцей. Калі ўрач нават і рабіў медыцынскі агляд дзіцяці, то дапамагчы яму быў не ў стане, паколькі па выпісаных рэцэптах набыць неабходныя прэпараты ў аптэцы было немагчымым [60, арк. 1]. Нават тое, што цэнтралізавана выдзялялася, не даходзіла да дзяцей. Факт крадзяжу і збыту медыкаментаў быў зафіксаваны ў Астрашыцка-Гарадоцкім дзетдоме [326, с. 24]. Адзначаныя вышэй прычыны, а таксама нездавальняючае харчаванне прыводзілі да ўзнікнення і распаўсюджання інфекцыйных захворванняў. Да хвароб, якія найчасцей фіксаваліся ў дзяцей, адносіліся завашывеласць, кароста, тыф, дыспепсія і г.д. Пры адсутнасці патрэбных лекаў, медыцынскага абслугоўвання гэтыя хваробы набывалі памеры эпідэмій у межах адной дзіцячай установы і прыводзілі да высокай смяротнасці. Эпідэмія сыпнога тыфу панавала ў дзетдоме № 4 г. Мінска (прычынай эпідэміі сталі нядбайныя адносіны да дзяцей з боку дырэктара і выхавацеляў [198, арк. 81]), у Заазерскім дзетдоме, кароcты – у Доме дзіцяці г. Пінска, Бранцаўскім дзетдоме Аршанскай гаруправы, дыфтэрыі – у дзетдоме № 1 г. Мінска і г.д.

У выхаванцаў з прычыны голаду развіваліся ацёкі, рахіт, дыспепсія. Так, пры праверцы Дома груднога дзіцяці г. Бабруйска з агледжаных 38 чалавек траіх прызналі хворымі на рахіт, аднаго – на дыспепсію, у дзевяцярых былі хваробы, звязаныя з недастатковым харчаваннем [91, арк. 10]. Менавіта масавыя захворванні, адсутнасць медыцынскай дапамогі і недастатковае харчаванне сталі прычынамі высокай смяротнасці сярод выхаванцаў. Так, за два тыдні ў лютым 1944 г. у Горацкім дзетдоме памёрла 3 дзіцяці [74, арк. 2, 3, 14]. Па некаторых падліках, за час акупацыі ў калоніі “Сёмкаў Гарадок” загінула больш за 200 чалавек [285, с. 255].

Маштабы захворванняў аб’ектыўна залежалі як ад санітарнага стану дзіцячай установы, гігіены выхаванцаў, так і ад якасці харчавання. Выхаванец дзетдома ў перыяд акупацыі і па архіўных матэрыялах, і па ўспамінах саміх дзяцей меў часцей за ўсё выгляд абарванага, бруднага дзіцяці, да якога нікому не было справы. У архівах захаваліся прашэнні кіраўнікоў дзетдамоў і прытулкаў аб выдачы для дзяцей адзення і



Витебский государственный технологический университет

абутку напярэдадні наступлення халадоў (паколькі ў летні і веснавы перыяды гэта было не так патрэбна). Падрабязны спіс неабходных рэчаў быў складзены інспектарам дзіцячых устаноў Мінскай акругі для вышэйшага кіраўніцтва. Для 200 чалавек патрабаваўся абутак, паліто, бялізна. Прычым адзначалася, што гэта "не адлюстроўвае сапраўднай патрэбы, бо ўсе дзеці амаль раздзеты" [213, арк. 20]. Такое становішча вымушала дзяцей да самастойных пошукаў таго, што можна было б выкарыстаць як адзенне. Для гэтай мэты падыходзілі і цёплыя анучы, шматы коўдр, якімі абкручвалі ногі, галовы, усё цела, а парваныя боты падвязвалі дротам ці анучамі. Не дзіўна, што, па ўспамінах саміх дзяцей, "многие из нас выглядели настоящими оборванцами. По нам и нашему тряпью постоянно ползали вши. А сколько среди нас было обмороженных!" [175, с. 94].

Не лепшым было і санітарнае становішча дзетдамоў. Аддзел культуры і асветы Віцебскай гаруправы прыкладна два разы на месяц пералічваў грошы на рахунак Аддзела аховы здароўя для правядзення дэзынфекцыі [66, арк. 165]. Пастаянны недахоп адзення, абутку, асабістых рэчаў, адсутнасць другога камплекту бялізны, немагчымасць памыцца зводзілі эфектыўнасць гэтых мерапрыемстваў да нуля. Дзеці вымушаны былі спаць нераспранутымі з-за холаду. Такія ўмовы прыводзілі, па словах М. Кузняцова, да распаўсюджання сярод дзяцей "сіндрома бамжа", калі цалкам ці часткова страчваліся навыкі гігіены [155, с. 137] і некаторыя выхаванцы мыліся толькі пад прымусам. Не дзіўна, што пастаянным спадарожнікам дзяцей станавіліся вошы і кароста. Нават пры пагрозе эпідэміі ўладкаваць дзяцей у бальніцу, каб ізаляваць хворых, не заўсёды ўдавалася з-за адсутнасці свабодных ложкаў [60, арк. 1].

Германскія ўлады не ліквідавалі савецкую сістэму дашкольных і школьных устаноў. Але ж умовы акупацыі накладвалі адбітак не толькі на іх дзейнасць, але і садзейнічалі відазмяненню савецкай практыкі. З'яўляліся ўстановы змешанага тыпу, дзіцячыя яслі і сады набывалі статус дзетдамоў. Класіфікацыя дзіцячых устаноў будзе мець наступны выгляд:

1. Дзіцячыя дамы. У пачатку вайны ў дзіцячыя дамы ператвараліся неэвакуіраваныя піянерскія лагеры, санаторыі (напрыклад, піянерскі лагер "Дразды", санаторый "Крынкі"). Акрамя стала пражываючых дзяцей, некаторыя наведвалі і дзеці, у якіх былі бацькі (характэрна для дзіцячых дамоў г. Магілёва [91, арк. 13 зв. – 14], дзетдамоў Мінска [240, арк. 120]). Яны атрымлівалі няпоўнае харчаванне, але прыцягваліся да выхаваўчага працэсу. Па дадзеных архіваў, матэрыялаў друку ў 1941 – 1944 гг. працавалі прыкладна 64 такія ўстановы. Змяншэнне іх колькасці ў параўнанні з даваенным перыядам (з улікам эвакуіраваных) абумоўлена тым, што некаторыя

Витебский государственный технологический университет

ўстановы закрываліся, а выхаванцы перавадзіліся з аднаго дзетдома ў другі, пэўная колькасць дакументаў пра дзейнасць дзетдамоў згубілася пры вызваленні тэрыторыі Беларусі ці была свядома ліквідавана гітлераўцамі.

2. Дзіцячыя сады. Ствараліся непасрэдна акупацыйнымі ўладамі для таго, каб вызваліць бацькоў для працы на прадпрыемствах. Пачатак гэтаму працэсу быў пакладзены загадам В. Кубэ ад 10 верасня 1941 г. З цягам часу сады маглі ператварацца ў дзетдамы, як гэта адбылося, напрыклад, у г. Орша [70, арк. 64]. Прычынамі трансфармацыі станавіліся збядненне насельніцтва, смерць бацькоў, вываз іх у рэйх.

3. Дзіцячыя сады-яслі, дзіцячыя яслі. Так, на тэрыторыі ГАБ працавалі сад-яслі № 1 на 165 чал., яслі № 2 на 29 чал., № 5 на 25 чал., № 12 на 140 чал. і інш. [194, арк. 11]. Падставай для выдзялення гэтага тыпу ўстаноў стаў узрост дзяцей (ад нараджэння да 3-х гадоў). Забеспячэнне дзяцей не адрознівалася ад забеспячэння ў іншых установах.

4. Дзіцячыя прытулкі, ізалятары, прыёмнікі-размеркавальнікі. Установы, дзе дзеці знаходзіліся часова, да іх накіравання, як правіла, у дзетдом ці вяртання ў сям'ю. Траплялі сюды з вуліцы, дзе займаліся бадзяжніцтвам. На жаль, звестак пра гэтыя тыпы ўстаноў вельмі мала, што не дазваляе аднавіць карціну ўтрымання і забеспячэння дзяцей.

Рэалізацыя акупантамі канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на выкарыстанне дзяцей ў якасці донараў і працоўнай сілы, рэгуляванне праблемы бежанцаў, шэрагу іншых сацыяльных праблем, прывялі да выдзялення наступных тыпаў дзіцячых дамоў:

1. Былі спробы стварыць дзетдамы – сельскагаспадарчыя калоніі. Адным з такіх павінен быў стаць дзетдом на базе былога санаторыя “Крынкі” (падпарадкоўваўся Асіповіцкай райуправе). Ідэя акупантаў заключалася ў тым, каб дзеці самі сябе абслугоўвалі, працавалі на гаспадарцы. У маі 1942 г. выйшаў адпаведны загад, згодна якому неабходна было “сократить завозную рабочую силу до минимума, заменив работоспособными детьми. Детскую работу оплачивать штатно и сезонно работающим детям от 100 до 150 рублей в месяц, за каковые деньги детям, по их согласию, приобретать дополнительную одежду или же деньги сберегать до выпуска их из детдома” [94, арк. 76]. Па-першае, акупацыйныя ўлады планавалі перавесці гэтую ўстанову на поўнае самазабеспячэнне, па-другое, праз працу і сістэму пакаранняў за непаслушэнства выхаваць паслухмяных работнікаў. У дзетдоме існаваў карцар, які не ацяпляўся. Сюды траплялі дзеці за дробныя праступкі (напрыклад, за з'яданне корму для свінняў) [159, с. 135]. Ніякіх клопатаў пра дзяцей выхавальнікі не праяўлялі, дзеці хадзілі “брудныя і абарваныя”. Не затрымліваліся ў дзетдоме хворыя і слабыя дзеці. Іх накіроўвалі ў Асіповічы, у бальніцу, дзе не было ніякага лячэння. Па



Витебский государственный технологический университет

ўспамінах выхаванцаў, адтуль ніхто жывым не вяртаўся [166, с. 8]. У сувязі з актывізацыяй дзеянняў партызан у студзені 1943 г. дзеці былі перавезены ў Асіповічы. Пад назвай "сельскагаспадарчая калонія" ў дакументах вызначаны і дзетдом "Сёмкаў Гарадок" Мінскага раёна. Згодна архіўным матэрыялам, успамінам сведак у гэтай установе, як і ў дзетдоме "Крынкі", дзеці знаходзіліся на становішчы самаабслугоўвання. Інспектар дзіцячых устаноў заклікаў кіраўніцтва дзетдома забяспечыць "старэйшым дзецям **сталую** працу на гаспадарцы" [211, арк. 216], а не толькі ў залежнасці ад сезону. Улічваючы, якія мэты рэалізоўваліся ў дадзеных установах і якім чынам было арганізавана жыццё выхаванцаў, паступова ўсе дзіцячыя дамы павінны былі перайсці на выкарыстанне працы дзяцей па сваім поўным забеспячэнні.

2. Дзетдамы для бежанцаў. Да гэтага тыпу можна аднесці дзетдом у Іўі, у Карэлічах, Бранцаўска-Глінскі. Узнікалі яны па прычыне прытоку бежанцаў з прыфрантавой зоны, як правіла, з Расіі. Вывозіліся адтуль цэлыя дзіцячыя ўстановы, як, напрыклад, Бранцаўска-Глінскі дзетдом. Яны паступалі пад кіраўніцтва мясцовых улад, якія і займаліся забеспячэннем дзяцей. Дзякуючы мясцоваму насельніцтву, збору прадуктаў самімі дзецьмі па навакольных вёсках і ўдалося выжыць выхаванцам пад акупацыяй. Санітарны стан дзетдамоў і стан здароўя дзяцей былі нездавальняючымі. Пра гэта сведчыць той факт, што ў дзетдамах панавалі эпідэміі каросты, тыфу, пастаянны голад.

3. Дзіцячыя дамы для забору крыві ("дзіцячае сяло" ў Скобраўцы, Козыраўскі дзіцячы прытулак г. Мінска ці дзетдом пры нямецкім шпіталі ў г. Віцебску, куды дзяцей збіралі спецыяльна з гэтай мэтай). Тэрыторыю абносілі агароджай, выстаўлялі ўзброеных вартаўнікоў. Ствараўся асобы рэжым выхавання, жорсткае абыходжанне з дзецьмі за непаслушэнства: збіванне дзягаю, стэкам, біццё па патыліцы, накручванне вушэй, пазбаўленне ежы [285, с. 248]. Як правіла, пасля чарговага забору крыві дзяцей болей не бачылі. Гэты тып дзетдамоў пераўзыходзіць па жорсткасці ўсе пералічаныя вышэй. Да гэтай катэгорыі трэба аднесці перасыльныя (донарскія) лагеры, з якіх дзяцей адпраўлялі ў Германію ў якасці донараў. Такі лагер існаваў у в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна, на тэрыторыі вучэбнай гаспадаркі "Чырвоны Бераг" Жлобінскага раёна, у Клецку.

4. Дзетдамы-лагеры для адпраўкі дзяцей на прымусовую працу ў Германію. Існавалі ў в. Загародскі Пагост Пінскага раёна, у гарадскім пасёлку Петрыкаў.

Неабходна адзначыць, што вываз выхаванцаў дзетдамоў на прымусовыя работы ў Германію пачаўся зімой 1942 г. Да гэтага часу адносяцца дадзеныя аб адпраўцы 42 чалавек з 70 з дзіцячай калоніі ў Козырава "в рейх как рабочей силы. В настоящее время принимаются



Витебский государственный технологический университет

усилия увеличить число направляемых в Германию детей” [21, с. 57]. У 1942 – 1943 гг. пад дэпартацыю падпадалі дзеці ва ўзросце ад 12 гадоў. Яны праходзілі вярбовачную камісію і, калі прызнаваліся годнымі, накіроўваліся ў рэйх. Як сведчаць дакументы, нацыстам не патрэбны былі хворыя ці змораныя голадам дзеці. У жніўні 1942 г. 17 падлеткаў 1925 – 1929 гадоў нараджэння Астрашыцка-Гарадоцкага дзетдома былі дастаўлены ў камісію. Годнымі прызналі толькі 10 чалавек, астатнія вярнуліся ў дзетдом па стане здароўя: дзеці былі хворыя на сухоты, эпілепсію, каросту, стрыгучы лішай [326, с. 27].

Вярбовачную дзейнасць праводзілі і прадстаўнікі Рускай вызваленчай арміі. Яны папаўнялі свае шэрагі хлопцамі старэйшага ўзросту – выхаванцамі дзетдамоў. Такі адбор быў праведзены сярод дзяцей Астрашыцка-Гарадоцкага і Сёмкаўгарадоцкага дзетдамоў. Са згоды генерал-фельдмаршала фон Клюге забралі 20 хлопцаў [212, арк. 45]. Сярод выхаванцаў дзетдамоў вылучалі дзяцей, што сваім знешнім выглядам нагадвалі прадстаўнікоў арыйскай расы – у першую чаргу бландзінаў і сінявокіх, але гэта не ратавала іх ад вывазу ў Германію [285, с. 248].

У 1944 г. узроставы цэнз на вываз дзяцей быў зніжаны з 12 – 15 гадоў да 10. Толькі ў чэрвені 1944 г. у сувязі з правядзеннем аперацыі “Сено” з Беларусі вывезлі 82 выхаванца Брэсцкага дзіцячага дома, 216 з Дзятлаўскага і Краснасельскага прытулкаў (30 з іх памёрлі ў дарозе) [285, с. 138, 211], 14 з Горацкага дзетдома [73, арк. 10]. Па ўспамінах М. Кузняцова, дэпартацыя ў Германію ўспрымалася не проста як адпраўка ў чужую краіну. “Германия в наших глазах представала как дикий необузданный зверь, который ворвался на нашу землю и сеет здесь разрушения. А теперь появилась «перспектива» очутиться в его логове, что вызывало у нас, подростков, смертельный ужас” [153, с. 60]. Дзеці расставаліся з апошняй надзеяй сустрэцца з бацькамі, вярнуцца ў сям’ю. Адчуванне жаху дапаўняла веданне таго, што па дарозе ў цягніках гінуць сотні людзей ад голаду і холаду.

Такім чынам, стварэнне новых і захаванне дзіцячых дамоў, якія не паспелі эвакуіраваць, абумоўлівалася шэрагам прычын: неабходна было ўпарадкаваць праблему бадзяжніцтва сярод дзяцей, выхоўваць іх у неабходным для акупацыйных улад рэчышчы, выкарыстоўваць дзяцей як рабочую сілу, як донараў для нямецкіх салдат, не дапусціць распаўсюджанне інфекцыйных захворванняў у тыле ўласнай арміі. Нягледзячы на адрозненні ў тыпах дзіцячых устаноў, жыццё дзяцей у іх на працягу вайны можна ахарактарызаваць як паўгалоднае балансаванне на мяжы жыцця і смерці.

Витебский государственный технологический университет

* * *

У гады акупацыі дзеці, як і ўсё беларускае грамадства, апынуліся ў складаных умовах існавання. Пазбаўленыя нечакана падтрымкі і апекі дарослых, дзеці вымушаны былі працаваць дзеля ўласнага выжывання і выжывання сваёй сям'і, клапаціцца пра сябе ў сітуацыі, калі палітыка, якую праводзілі акупанты ў адносінах да падрастаючага пакалення, насіла акрэслены характар генацыду, была накіравана на яго германізацыю. Месца дзіцяці ў акупаваным грамадстве і магчымасці на выжыванне вызначаліся не толькі яго этнічнай прыналежнасцю, узростам, але і наяўнасцю бацькоў, іх прыхільнасцю да новай улады, месцам працы. Дзеці калабарантаў, фольксдойчэ мелі лепшае забеспячэнне, наведвалі спецыяльныя школы, не прыцягваліся да прымусовых работ. Пераважная большасць дзяцей разглядалася як аб'ект уздзеяння нацысцкай палітыкі генацыду і германізацыі, як танная рабочая сіла, пры неабходнасці як донары для нямецкіх салдат, фактычна не атрымлівала неабходнага забеспячэння, медыцынскай дапамогі (за гады акупацыі неданарадзілася прыкладна 35 % дзяцей), не мела ўмоў для гарманічнага развіцця.

Дзіцячыя дамы, нягледзячы на адрозненні ў функцыях, сталі зручнай для акупантаў арганізацыйнай формай генацыду дзяцей праз стварэнне невыносных умоў існавання. Там панавалі голад, холад, адсутнічалі элементарныя ўмовы для асабістай гігіены, кваліфікаваная медыцынская дапамога. Законных спосабаў для самастойнага набыцця прадуктаў харчавання ў выхаванцаў не існавала, таму яны кралі, жабравалі, хадзілі па суседніх вёсках у пошуках ежы для сябе і малых, якія не маглі пра сябе паклапаціцца. Спробы апеляваць да вышэйстаячых інстанцый (якія не былі зацікаўлены ў паляпшэнні становішча выхаванцаў), прыцягнуць увагу грамадскасці (збор ахвяраванняў сярод насельніцтва) поспеху не мелі. Некаторыя дзетдамы былі пераведзены на самазабеспячэнне і самаабслугоўванне за кошт працы выхаванцаў у сельскай гаспадарцы. Гэтым планавалася дасягнуць адразу некалькіх мэт: выкарыстаць танную дзіцячую працу, праз працоўнае навучанне выхоўваць паслухмяных работнікаў.

Такім чынам, палітыка гітлераўскіх улад у сацыяльнай і працоўнай сферах прывяла да таго, што за 1941 – 1944 гг. на тэрыторыі Беларусі загінула больш за 166 тыс. непаўналетніх [120, с. 17], а сіротамі засталіся больш за 138 тыс. чалавек, 60 % з якіх дзеці загінуўшых чырвонаармейцаў і партызан.

Витебский государственный технологический университет

# Раздзел 3. Удзел дзяцей у антыфашысцкай барацьбе

## 3.1 Выратаванне і выхаванне дзяцей партызанамі і падпольшчыкамі

З узмацненнем руху супраціўлення, павелічэннем колькасці партызанскіх шэрагаў, пашырэннем дзейнасці падполля партыйныя, камсамольскія органы, партызанскія фарміраванні змаглі ўзяць на сябе функцыі па абароне, выратаванні жыцця дзяцей, іх выхаванні. Побач з баявымі задачамі па зрыве планаў акупантаў, прымаліся меры па захаванні жыцця беларускіх дзяцей, што з'яўлялася састаўной часткай комплексу мерапрыемстваў па абароне несельніцтва ад знішчэння акупантамі і вывазу яго ў Германію.

Важнае значэнне меў і асабісты фактар. Па прызнанні многіх камандзіраў партызанскіх атрадаў, шараговых партызан, дзеці, асабліва тыя, што былі задзейнічаны ў баявых аперацыях, станавіліся "любімчыкамі" ў атрадах [31, с. 145]. Зразумела, што дарослыя імкнуліся зберагчы іх не толькі таму, што яны значна саступалі па ўзросце, але і таму, што ў многіх з іх у акупаваных вёсках, у савецкім тыле таксама засталіся дзеткі.

У першую чаргу партызаны і падпольшчыкі звярнулі ўвагу на дзяцей, што засталіся без бацькоў, знаходзіліся ў дзіцячых установах, бадзяжнічалі. Адной з прычын такой пільнай увагі сталі сувязі выхавацеляў з патрыятычным падполлем і партызанамі, існаванне ў многіх дзетдамах падпольных груп, у большасці выпадкаў з удзелам у іх дзяцей старэйшага школьнага ўзросту. Ведаючы пра гаротнае становішча выхаванцаў такіх установ (голад, холад, адсутнасць медыцынскага абслугоўвання), партызаны і падпольшчыкі бралі іх пад свой кантроль і ўсімі магчымымі сродкамі дапамагалі дзецям. Сродкі дапамогі былі розныя: прадукты харчавання пастаўлялі партызаны ў дзіцячыя ўстановы праз сувязных з ліку выхавацеляў, прыкрывалі пастаўкі акупацыйнымі разнарадкамі і дазволамі. Так, Браслаўскі дом груднога дзіцяці фінансаваўся за кошт гарадской управы па ўказанні старасты А.А. Васілеўскага, які займаў гэту пасаду па заданні гарадскога падпольнага камітэта. У яго абавязкі ўваходзіла арганізацыя збору прадуктаў харчавання сярод насельніцтва і папярэджанне выкарыстання дзяцей у якасці донараў [168, с. 387]. Восенню 1943 г. пасля арышту А.А. Васілеўскага дзетдом перадалі на ўтрыманне Браслаўскай БНС. Каб не дапусціць выкарыстання дзяцей у медыцынскіх мэтах, падпольшчыкі пусцілі чуткі пра тое, што дзеці хворыя на сухоты. У тых раёнах, дзе нямецкія гарнізоны былі колькасна меншыя, партызаны прыбягалі да запалохвання дырэктараў дзіцячых устаноў, дапаможнай адміністрацыі.

Витебский государственный технологический университет

Сярод дзетдамоў, што апекаваліся падпольшчыкамі і партызанамі ў гады акупацыі, можна назваць Наваельненскі прытулак (вясной 1942 г. антыфашысцкая група пад кіраўніцтвам Т. Умновай узяла прытулак пад апеку), Гомельскі (доктарам там працаваў член гомельскай падпольнай камсамольскай арганізацыі), дзетдом у Карэлічах [285, с. 166, 186, 403], у в. Быкаўшчына Полацкага раёна (партызанская брыгада "Няўлоўныя" пад краўніцтвам М.С. Пруднікава, атрад "Смерць фашызму" брыгады ім. Варашылава падвозілі харчаванне) [285, с. 328; 33, с. 460].

Адным з накірункаў па забеспячэнні жыццядзейнасці дзяцей стала аказанне матэрыяльнай дапамогі сем'ям з дзецьмі, сем'ям загінуўшых партызан і чырвонаармейцаў, якія знаходзіліся ў партызанскіх атрадах. Першыя пастановы мелі дачыненне да Клічаўскай партызанскай зоны (першай па часе ўзнікнення). Прадугледжвалася стварэнне фондаў таварыскай узаемадапамогі для бежанцаў, сем'яў партызан, чырвонаармейцаў, тых, хто пацярпеў ад фашысцкага тэрору. Улічваючы, што сем'і ў асноўным складаліся з жанчын і дзяцей, то дадзеная пастанова непасрэдна абараняла іх інтарэсы. Па спецыяльных талонах азначаныя вышэй катэгорыі насельніцтва атрымлівалі прадукты харчавання. У чэрвені 1942 г. спецыяльнай пастановай Клічаўскага РК КП(б)Б і выканкама раённага савета дэпутатаў працоўных быў размеркаваны будучы ўраджай. Яна ўстанаўлівала нормы для розных катэгорый грамадзян. Так, дзеці да 12 гадоў атрымлівалі палову нормы, а старэйшыя за 12 гадоў – цэлую. Цэлая норма на дзіця незалежна ад узросту прадугледжвалася ў выпадку адсутнасці ў сям'і чырвонаармейца працаздольных мужчын, калі бацька быў забіты немцамі ці паліцаямі, а таксама сіротам, калі бацькі загінулі ў барацьбе з акупантамі [180, арк. 36]. Неабходна звярнуць увагу на той факт, што дзеці старэйшыя за 12 гадоў згодна дакументу, з'яўляліся працаздольнай адзінкай, як і дарослыя. Пайсці на такую меру кіраўніцтва партызанскай зоны вымушана было з-за недахопу працоўных рук, паколькі для мужчын асноўнай функцыяй заставалася баявая.

Вядомы факты пра выратаванне партызанамі беспрытульных дзяцей у Лёзненскім раёне. У 1943 г. у в. Бржазова на тэрыторыі партызанскай зоны намаганнямі былога загадчыка аддзела адукацыі Віцебскай вобласці Кец збіралі беспрытульных дзяцей, што бадзяліся па лясах. Іх сабралося каля 100 чалавек. Апекавалі і займаліся забеспячэннем дзяцей Кец, Сянкевіч, Смятаніна. Харчаванне ахвяравалі мясцовыя жыхары. Пасля вызвалення Лёзненшчыны быў адкрыты дзетдом, які атрымаў афіцыйную назву Хлусаўскага дашкольнага дзетдома [170, с. 166].

Витебский государственный технологический университет

Пытанні абароны насельніцтва ад знішчэння і вывазу ў Германію асаблівую вастрыню набылі пасля карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне. 21 верасня 1943 г. ЦК КП(б)Б прыняў дырэктыву "О задачах подпольных парторганизаций и партизанских отрядов Белоруссии по спасению населения от истребления и угона в рабство при отступлении немецких войск", у якой патрабаваў прыняцця адпаведных мер для выратавання насельніцтва, папярэджвання разбурэння населеных пунктаў, знішчэння матэрыяльных і культурных каштоўнасцей [33, с. 72 – 73]. Дырэктыва была разаслана па падпольных арганізацыях і партызанскіх атрадах, якія з гэтага часу сталі праводзіць арганізаваныя і мэтанакіраваныя мерапрыемствы па вываду насельніцтва ў бяспечныя раёны, па стварэнні лагераў для грамадзянскага насельніцтва, тлумачальную працу.

У 1944 г. партызанам удалося перавезці выхаванцаў двух дзетдамоў у партызанскія зоны. Гэта аперацыі "Зорачка" (вываз Полацкага дзетдома) і "Дзеці" (Сёмкаў-Гарадоцкага дзетдома). Неабходна адзначыць, што вывезці дзяцей з тэрыторыі, падкантрольнай акупантам, партызан прымусілі абставіны. Па прызнанні І. Фёдарава, камісара партызанскай брыгады "Штурмавая", якая адказвала за выратаванне выхаванцаў Сёмкаў-Гарадоцкага дзетдома, размяшчэнне вялікай колькасці дзяцей (274 чал.) у партызанскіх атрадах "моцна адбілася б на рухомасці і мабільнасці атрадаў, а гэта значыць і на іх баяздольнасці" [317, с. 155].

Штуршком да прыняцця няпростага рашэння пра эвакуацыю дзяцей стала пагроза іх жыццю: нацысты планавалі выкарыстаць дзяцей у якасці донараў і вывезці іх у Германію. Нагадаем, што зімой 1944 г. савецка-германскі фронт стабілізаваўся на тэрыторыі ўсходняй Беларусі. Нямецкая армія адступала і не толькі рабавала беларускія тэрыторыі, але і вывазіла насельніцтва, у тым ліку і дзяцей, у Германію. Таму пагроза для дзіцячых устаноў была сур'ёзная. Наладжаныя да гэтага моцныя сувязі паміж выхавацелямі і партызанамі дазволілі своечасова прыняць меры і апярэдзіць акупантаў.

Аперацыя "Зорачка" па эвакуацыі Полацкага дзетдома адбылася ў ноч на 19 лютага 1944 г. У штабе Полацка-Лепельскага партызанскага злучэння быў загадзя распрацаваны падрабязны план аперацыі. Галоўнай умовай яго паспяховай рэалізацыі стала правядзенне аперацыі без баявых дзеянняў, што дазволіла, па ўспамінах кіраўніка злучэння У.Е. Лабанка, "захаваць жыццё кожнага дзіцяці" [167, с. 309]. Магчымасць уступлення ў бой таксама прадугледжвалася. Для гэтага былі задзейнічаны сілы двух атрадаў брыгады імя Чапаева пад агульным кіраўніцтвам Б.П. Алешчанкі. На 30 падводах у партызанскую в. Славені прывезлі дзяцей у колькасці 130 чалавек ва ўзросце ад 5

Витебский государственный технологический университет

месяцаў да 15 гадоў, 20 чалавек абслугоўваючага персаналу, 3 павозкі харчавання, маёмасці і транспарту і 6 кароў [234, арк. 54].

Задача выратавання дзяцей і вывазу іх на падкантрольную партызанам тэрыторыю была адным са складнікаў комплексу мерапрыемстваў па выратаванні дзяцей. З гэтага моманту праблемы па іх забеспячэнні харчаваннем, адзеннем, выхаванні цалкам клаліся на плечы партызан, што, канешне ж, значна абмяжоўвала іх сілы ў выпадку блакады партызанскай зоны і сутыкненні з ворагам. Для больш зручнага забеспячэння і кантролю за дзецьмі Ушацкі падпольны РК КП(б)Б у лютым 1944 г. пастанавіў не ліквідоўваць дзетдом як арганізацыйную структуру, а перайменаваць яго ў “дзіцячы дом партызанскай брыгады імя Чапаева”. Штат педагогаў застаўся ранейшым, як і колькасць выхаванцаў [233, арк. 40 зв.]. На жаль, звестак пра далейшае жыццё і забеспячэнне дзяцей намі знойдзена вельмі мала. Па ўспамінах партызан і выхавацеляў, дзеці атрымлівалі ўсё самае лепшае, што можна было даць ва ўмовах існавання ў тыле германскай арміі. Старэйшыя былі задзейнічаны на абслугоўванні партызанскага аэрадрома “Вечалле”. Пад пагрозай блакады Полацка-Лепельскай зоны дзяцей па папярэдняй дамоўленасці з Масквой пераправілі на Вялікую зямлю. Дзіцячы дом спыніў сваё існаванне.

План па выратаванні выхаванцаў Сёмкаў-Гарадоцкага прытулку Мінскай вобласці распрацоўвалі Заслаўскі падпольны РК КП(б)Б і камандаванне партызанскай брыгады “Штурмавая”. Сярод сур’ёзных перашкод, якія ў першую чаргу неабходна было вырашыць, значыліся недахоп ці поўная адсутнасць цёплага адзення ў дзяцей і наяўнасць цэлай сістэмы варожых гарнізонаў на шляху вывазу, такіх, як мінскі, масюкоўшчынскі, ратамскі, змееўскі, заслаўскі. У ноч на 29 сакавіка 1944 г. 274 выхаванцы прытулку больш як на 60 падводах былі вывезены партызанамі ў в. Сярэдняе (Маньлы). Ахову абоза ўзначальваў камандзір першай роты атрада ім. Жукава І.І. Бацян (у некаторых крыніцах – І.І. Бацянка).

На нарадзе камісараў і камандзіраў партызанскіх атрадаў было вырашана ўладкаваць дзяцей у сем’і мясцовага насельніцтва. Улічваючы вялікую колькасць выхаванцаў, для кожнага атрада былі ўведзены спецыяльныя нормы па размяшчэнні дзяцей. На камандзіраў ускладвалася адказнасць за правядзенне медагляду і санапрацоўкі кожнага дзіцяці. Сярод насельніцтва прапаноўвалася правесці растлумачальную працу пра неабходнасць прыняць беспрытульных. Кантроль за жыццём дзяцей у прыёмных сем’ях павінны былі ажыццяўляць партызаны [236, арк. 218; 279, с. 217]. Па ўспамінах І. Фёдарава, у час блакады партызан у маі 1944 г. ніводная сям’я не пакінула прынятых дзяцей. Наадварот, многія з іх засталіся жыць з прыёмнымі бацькамі і пасля вайны [317, с. 157].


Витебский государственный технологический университет

У цяжкіх умовах апынуліся дзеці ў гета. Складанасць у аказанні дапамогі заключалася ў яго ізаляванасці і ахове. Адной з задач падпольшчыкаў фактычна ўсіх гета быў вывад людзей у бяспечныя раёны. Так, трапіць яўрэям з мінскага гета ў партызанскую зону Мінскага раёна дапамагаў І. Левін, дарэчы, падлетак па ўзросце. У час апошняга пагрому (восень 1943 г.) ім была выратавана група дзяцей 10 – 12-ці гадоў, сярод якіх знаходзілася і яго сястра Мая. Яны паспяхова дабраліся да партызан у Пухавіцкім раёне [118, с. 59]. Апошнія спрабавалі стварыць дзетдом для выратаваных дзяцей з Мінскага гета. Аднак з-за складанай ваеннай абстаноўкі камандаванне 2-й Мінскай партызанскай брыгады вымушана было размеркаваць дзяцей у колькасці 40 чалавек сярод жыхароў в. Парэчча. Прыняцце яўрэйскіх дзяцей абцяжарвалася неабходнасцю захавання ўласнай бяспекі, асабліва пры блакадзе партызанскай зоны. Аднак усе дзеці былі ўладкаваны і пражылі ў сем’ях да прыходу Чырвонай Арміі.

Беспрэцэдэнтным можна назваць выратаванне партызанамі і падпольшчыкамі дзяцей палітэмігрантаў, якія знаходзіліся ў Наваельненскім прытулку. Па загадзе камандзіра атрада “Кастрычніцкі” А. Рэдзькі былі вывезены і размешчаны ў сялянскіх сем’ях італьянка П. Глікозіо, чэшка У. Рэняк, полька К. Александрук і іншыя дзеці [285, с. 187].

Неабходна адзначыць, што рэгулярнае забеспячэнне размеркаваных па сем’ях дзяцей, якія былі выратаваны (ва ўсіх пералічаных вышэй выпадках), партызанамі не прадугледжвалася. Дапамога аказвалася толькі тым сем’ям, у якіх узнікалі цяжкасці, паколькі само насельніцтва і з’яўлялася першай крыніцай папаўнення партызанскіх запасаў харчавання. Такім чынам, асноўны цяжар па далейшым забеспячэнні дзяцей і адказнасці за іх клаўся на плечы мясцовых жыхароў. Набліжэнне лініі фронту і пагаршэнне сітуацыі ў большасці дзіцячых устаноў, што дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі, патрабавала неадкладных рашэнняў. Не заўсёды партызанскія фарміраванні мелі дастаткова рэсурсаў для выратавання адразу вялікай колькасці дзяцей. Часцей за ўсё дзяцей перавозілі ў больш бяспечныя вёскі, выводзілі ў лес разам з мясцовымі жыхарамі, карыстаючыся тым, што ў акупацыйных улад ва ўмовах адступлення не было часу займацца пытаннямі беспрытульных. Выратаваныя сотні жыццяў беларускіх дзяцей – гэта вынік супрацоўніцтва беларускіх партызан і мясцовага насельніцтва.

Сярод партызан у сямейных лагерах знаходзіліся дзеці дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту ў колькасці каля 5,5 тыс. чалавек [135, с. 80]. Умовы штодзённага жыцця былі цяжкімі для дзяцей усіх узроставых груп. Карныя аперацыі фашыстаў, адсутнасць стабільнай крыніцы забеспячэння харчаваннем, неспрыяльныя

Витебский государственный технологический университет

санітарныя ўмовы – вось шэраг прычын, па якіх дзяцей імкнуліся адправіць самалётамі на Вялікую зямлю. Да гэтага неабходна дадаць абмежаванасць магчымасцяў для далейшага гарманічнага фізічнага і псіхічнага развіцця дзіцяці. Асабліва небяспечным ўяўлялася апошняе. Забойствы бацькоў, расстрэлы мірнага насельніцтва падчас блакад партызанскіх зон, транспарціроўкі на прымусовыя работы ў Германію ці ў канцлагеры пакідалі свой негатыўны след у свядомасці дзяцей.

Улічваючы абмежаваныя магчымасці вывазу насельніцтва ў тыл Чырвонай Арміі (пералёт праз тэрыторыю, кантралюемую немцамі, вялікія адлегласці і ўмяшчальнасць самалётаў), у першую чаргу, як паказвае аналіз архіўных дакументаў, перапраўлялі нованароджаных і немаўлят з бацькамі, сірот, дзяцей-партызан для лячэння і працягу навучання [243, арк, 48, 97, 138]. Так, камандзір сямейнага атрада Ш. Зорын прасіў падпольны абкам Баранавіцкай вобласці садзейнічаць вывазу на тэрыторыю СССР жонкі камандзіра ўзвода, якая нарадзіла двойню, паколькі “ва ўмовах партызанскага атрада няма ніякай магчымасці гэтых дзяцей забяспечваць” [250, арк. 145].

Нягледзячы на аб’ектыўныя прычыны неабходнасці вывазу дзяцей у тыл і на зацікаўленасць у гэтым партызан, працэс не набыў масавага характару. У справаздачах камандзіраў асобных атрадаў адзначалася, што “налічваецца вялікая колькасць дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту, сірот, частку з якіх пажадана накіраваць у СССР” [250, арк. 145]. Колькасць дзяцей у атрадах не толькі не памяншалася, а, наадварот, павялічвалася, асабліва ў 1943 – 1944 гг., пры адступленні гітлераўскай арміі і прымянення тактыкі “выпаленай зямлі”, калі насельніцтва шукала паратунку пад абаронай партызан. Так, пры партызанскім атрадзе імя Кірава Брэсцкай вобласці на 1.03.1944 жанчын і дзяцей налічвалася 107 чал., праз месяц іх было 229 чал., на 1.05.1944 – 267 чал., на 1.07.1944 – 279 чал. [252, арк. 47, 86, 88, 93]. Усяго па дадзеных БШПР у савецкі тыл самалётамі было вывезена больш за 5 тыс. жанчын, дзяцей і старых [244, арк. 92].

Вайна і акупацыя парадзілі такую з’яву, як бежанства. Асноўную групу сярод бежанцаў складалі жанчыны і дзеці. Ратуючыся ад гітлераўцаў, яны шукалі абароны ў партызанскіх зонах. Каб нейкім чынам кантраляваць сітуацыю, партызанскім камандаваннем прымаліся некаторыя меры, накіраваныя на рэгуляванне ўзаемаадносін бежанцаў і мясцовага насельніцтва. Так, бюро Ветрынскага РК КП(б)Б двойчы прымала пастановы, у якіх гаварылася, што бежанцаў неабходна размясціць сярод насельніцтва вёсак, дапамагчы ім у першую чаргу прадуктамі харчавання, асабліва дзецям, а таксама прыцягнуць да веснавой сяўбы, выдзеліць дзялянкі зямлі, дапамагчы іх засеяць [181, арк. 279, 313]. Наўрад ці апошняе было магчымым ва ўмовах нестабільнай лініі фронту, блакад партызанскіх зон, недахопу

Витебский государственный технологический университет

працоўных рук. Зразумела, што для мясцовых жыхароў, на якіх ускладваўся абавязак па іх забеспячэнні, бежанцы ўяўлялі дадатковую праблему.

Абмежаваныя магчымасці па вывазу дзяцей у савецкі тыл, павелічэнне іх колькасці сярод партызан вымушала камандаванне займацца праблемай арганізацыі жыцця дзяцей у рамках партызанскіх атрадаў і сямейных лагераў. Яшчэ ў сваім лісце да камсамольскіх і партыйных органаў у тыле ворага ў 1942 г. першы сакратар ЦК ЛКСМБ М.В. Зімянін падкрэсліваў, што дзяцей неабходна выхоўваць у традыцыях савецкай піянерыі, каб яны станавіліся бясстрашнымі змагарамі за Радзіму. На камсамол ускладвалася функцыя супрацьдзеяння палітыцы анямечвання, якая праводзілася акупантамі праз школы і дашкольныя дзіцячыя ўстановы. Такім чынам, не менш важнай задачай партызан у адносінах да падрастаючага пакалення была выхаваўчая. Так, камандаванне партызанскага атрада імя Калініна брыгады імя Дзяржынскага неаднаразова задавалася пытаннем: «А все ли мы делаем для детей, что можем и что должны делать? Ну, кормим, стараемся одевать и обувать получше, потеплее. Это хорошо. Даже коров завели, чтобы малышам всегда молоко было. Живут... Но разве только в этом главное? Разве не первостепенная наша задача — в тяжелейших условиях борьбы в тылу врага воспитывать и воспитывать нашу советскую детвору?» [142, с. 7]. Выхаваўчая задача рэалізоўвалася праз стварэнне партызанскіх і лясных школ, арганізацыю піянерскіх атрадаў, правядзенне пазашкольнай працы з дзецьмі, працоўнае выхаванне (прыцягненне дзяцей да выканання розных гаспадарчых абавязкаў у партызанскіх атрадах).

Першая сетка партызанскіх школ з’явілася ў вёсках Ветрынскага раёна Віцебскай вобласці, якія пачалі працаваць з 1 верасня 1942 г. [121, с. 137]. Асабліва гэты працэс актывізаваўся пасля таго, як ініцыятыву на сябе ўзялі ЦК ЛКСМБ і яго сакратары М.В. Зімянін і К.Т. Мазураў. Як паказваюць архіўныя матэрыялы, найбольшы размах працэс стварэння і адкрыцця школ набыў у 1943 г., што было звязана з узмацненнем партызанскага руху. Ужо ў чэрвені 1943 г. у справаздачы аб працы камсамольскіх арганізацый Акцябрскага раёна Палескай вобласці адзначалася, што “после указания т. Мазурова по вопросу открытия школ и обучения детей в тылу противника, по инициативе комсомольской организации было открыто в районе 13 школ, где обучаются школьники 3 – 6 классов” [189, арк. 104]. Шырокая сетка школ была створана ў Брэсцкай вобласці. Для агульнага кіраўніцтва і кантролю за іх працай пры Брэсцкім падпольным АК ЛКСМБ быў створаны школьны аддзел. Інструктарам аддзела працавала Е.С. Волас [259, с. 13].

Витебский государственный технологический университет

Такім чынам, партыйнае кіраўніцтва надавала вялікае значэнне справе арганізацыі школ і навучанню дзяцей. Адной з прычын такой увагі да гэтага працэсу стала ідэалагічная барацьба за падрастаючае пакаленне. Фашысцкая палітыка анямечвання патрабавала мер супрацьдзеяння, сярод якіх былі адкрыццё савецкіх школ, навучанне па савецкіх праграмах, тлумачальная праца з бацькамі. Кантроль над школай даваў магчымасць весці выхаванне дзяцей у духу піянерскай традыцыі, нянавісці да ворага. Непазбежная перамога СССР у вайне з Германіяй, у якую верылі і на якую спадзяваліся на акупаваных землях, часовасць акупацыйнага рэжыму патрабавалі ад педагогаў па магчымасці захаваць педагагічны працэс у адпаведнасці з патрабаваннямі савецкай школы.

Пры арганізацыі партызанскіх школ узнікла шмат цяжкасцяў, якія пастаянна прыходзілася пераадольваць вучням і настаўнікам. Недахоп падручнікаў, паперы, пісьмовых прылад, адсутнасць праграм, абсталяваных памяшканняў, налёты варожай авіяцыі, карныя аперацыі немцаў перашкаджалі нармальнаму педагагічнаму працэсу. Але школы працавалі. Пералічаныя вышэй праблемы вырашаліся сіламі настаўнікаў, камсамольцаў і саміх вучняў. У лісце сакратара ЦК ЛКСМБ К.Т. Мазурава да М.В. Зімяніна, якое датавалася 22 лістападам 1942 г., адзначалася, што “население голосовало и руками и ногами [за адкрыццё школ. – *В.Б.*]. Трудности были не в этом. Трудности: помещения и все, что в них было, разбито; учебников, учебных пособий, бумаги, карандашей нет. Как мы выходим из положения? Ищем так же, как ищем оружие. Комсомольцы отряда Николая Розова, например, ходили по этим вопросам «на операцию» в разные деревни и собрали 150 карандашей, несколько учебников, несколько десятков тетрадей” [315, с. 118].

Неабходна адзначыць, што, акрамя партызанскіх школ (знаходзіліся ў населеных пунктах, якія кантраляваліся партызанамі, ці на тэрыторыі партызанскай зоны), функцыянавалі “лясныя” школы. Апошнія адрозніваліся ад партызанскіх тым, што дзейнічалі ў сямейных (грамадзянскіх) лагерах, у лясных масівах і ахоўваліся партызанскімі атрадамі. Яны ствараліся для дзяцей мясцовага насельніцтва, якое пайшло пад абарону партызан у лясы. Умовы для навучання і цяжкасці былі прыкладна аднолькавыя. “Лясныя” школы сталі арганізоўвацца пазней, з восені 1943 г. Адказваў за іх работу камсамол. Першая лясная школа была арганізавана на Брэстчыне пры атрадзе імя Калініна, дзе ў трох класах навучалася 50 дзяцей. Па астатніх абласцях, як паказваюць архіўныя дакументы, гэтай працы не надавалася неабходнай увагі. Стварэнне школ было не паўсюдным, а камсамольскія органы не кантралявалі гэты працэс. Так, Баранавіцкі АК ЛКСМБ у пастанове ад 26 красавіка 1944 г. адзначаў, што “отдельные райкомы ЛКСМБ не



Витебский государственный технологический университет

придали достаточного внимания работе среди молодежи и детей семейных отрядов. Работа среди детей совершенно неорганизованна” [227, арк. 17]. Каб палепшыць сітуацыю, абкам прыняў шэраг мер, у тым ліку прапаноўваў “одобрить инициативу Воложинского РК ЛКСМБ об организации в семейном лагере бригады «За Советскую Белоруссию» общеобразовательной школы для детей. Предложить всем РК ЛКСМБ, на территории которых имеются семейные лагеря, организовать обучение детей школьного возраста” [227, арк. 17]. Гэта надало некаторы штуршок працэсу арганізацыі школ. Сёння вядомы дзясяткі лясных школ, якія працавалі ў лясах Баранавіцкай, Брэсцкай, Віцебскай, Мінскай і іншых абласцей рэспублікі [121, с. 141], якія ўяўлялі сабой разгалінаваную сетку, што ахоплівала значную колькасць дзяцей.

Для саміх вучняў наведванне школы ўяўляла не толькі працэс набыцця ведаў. Гэта была спроба ўзнавіць даваеннае жыццё, няхай толькі у некаторай ступені. Праз школу даведваліся пра змены на фронце, у школе сустракаліся з партызанамі, займаліся вывучэннем зброі, перапісвалі лістоўкі, рабілі грамадска-карысную працу. Такім чынам, школа выконвала ідэалагічную функцыю, а таксама арганізоўвала і накіроўвала жыццё дзяцей у сямейных лагерах. Для вучняў “лясных” школ прыярытэтнай заставалася пазашкольная дзейнасць, што была прадстаўлена ў форме піянерскай работы, гурткоў самадзейнасці, ваенных гурткоў, гаспадарчых даручэнняў. Яна займала і большую частку часу, асабліва калі вучэбныя заняткі праводзіць было немагчыма. Работа ж па лагеры знаходзілася заўсёды.

Піянерскія атрады арганізоўваліся там, дзе існавалі лясныя школы. Так, піянерская дружына пры атрадзе імя Калініна Баранавіцкай вобласці налічвала 50 чал., пры атрадзе імя Жданава брыгады імя Свярдлова – 47 чал., пры атрадзе імя Калініна брыгады імя Дзяржынскага Брэсцкай вобласці – 38 чал. Практычна ўсе дзеці станавіліся піянерамі, па-за межамі атрадаў заставаліся адзінкі. Структура піянерскай арганізацыі фактычна не адрознівалася ад даваеннай. Дзейнічалі штаб атрада, абіраўся галоўны піянерважаты, дзеці рыхтавалі піянерскую сімволіку (гальштукі, форма, сцяг). Яе рабілі з падручных матэрыялаў. Так, піянеры атрада імя С. Васілеўскага пашылі іх з парашутнага палатна [12, арк. 3]. Кожны дзень праводзіліся піянерскія зборы, на якіх абмяркоўвалася зробленае. Вяліся пратаколы збораў саветаў (штабоў) атрадаў. Абавязковым мерапрыемствам быў прыём у піянерскую арганізацыю. Па ўспамінах тых, каго прымалі ў піянеры ў ваенныя гады, рабілі гэта абавязкова пры святле вогнішча. Атмасфера была таямнічай, а дзеці адчувалі сябе адзіным згуртаваным калектывам [12, арк. 3].

Дзеці малодшага ўзросту прымаліся ў акцябраты (наяўнасць такіх атрадаў зафіксавана ў Баранавіцкай вобласці). Іх дзейнасць, канешне, не



Витебский государственный технологический университет

была такой паўнамаштабнай, як піянераў. Галоўнай задачай акцябрат заставалася выдатная вучоба, удзел у гуртках самадзейнасці, выступленні перад партызанамі, бацькамі, параненымі байцамі. Над апошнімі шэфствавалі піянеры разам з акцябратамі. Формы працы сярод акцябрат былі іншымі, характар гутарак, гульняў меў пазнавальны характар (напрыклад, “Пионер – всем ребятам пример”, “Гигиена и дисциплина”) [249, арк. 207 зв.]. Элементы ваенізацыі выхаваўчага працэсу, што было непазбежным ва ўмовах вайны, прасочваліся ў ваенных гульнях са зброяй, зробленай самімі вучнямі. Аднак вызначаныя асаблівасці не перашкаджалі дзецям малодшага школьнага ўзросту ў сваіх гутарках гаварыць пра партызан, марыць пра здзяйсненне подзвігу і ўдзел у барацьбе з акупантамі. Іх свядомасць была прасякнута вайной, паколькі апошняя пазбавіла іх дома, бацькоў, школы, усяго таго, што звязана з дзяцінствам.

Насычанасць піянерскаму жыццю надаваў удзел піянераў у гуртках самадзейнасці. Яны былі самай рознай накіраванасці: харавыя, выразнага чытання вершаў, тэатральныя. У дзяцей карысталіся папулярнасцю апошнія, паколькі звычайнай з’явай была пастаноўка спектакляў перад партызанамі. Тэатральная справа, як і ўсё жыццё ў партызанскіх лагерах, была падпарадкавана патрэбам ваеннага часу. П’есы мелі характэрныя назвы: “Бей ворага”, “Піянеры”, “У бой, за Радзіму”, “Юныя мсціўцы”. Уцягванне дзяцей у гуртковую справу дазваляла не толькі развіваць іх творчы патэнцыял, але падрыхтавацца да значных і адзначаемых у сямейных лагерах дат, такіх, як 1 Мая, гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, утварэння БССР. План мерапрыемстваў загадзя распрацоўваўся партыйнымі органамі і дасылаўся ў кожны атрад. У святочнай праграме былі шырока задзейнічаны дзеці. Яны рыхтавалі пастаноўкі, дэкламавалі вершы, выконвалі фізкультурныя, песенныя, танцавальныя нумары. Праз разнастайныя формы масавай дзейнасці дзеці ўцягваліся ў сістэму савецкай культуры з яе святамі, пэўнымі абрадамі. У падрастаючага пакалення закладваліся неабходныя традыцыі, фарміраваўся менталітэт, які вызначыў у пасляваенныя гады асобнае пакаленне людзей, што выраслі на подзвігах партызан і падпольшчыкаў Вялікай Айчыннай.

У даваеннай савецкай педагогіцы адным з пастулатаў навучання была непарыўнасць тэорыі і практыкі. У гады акупацыі ў партызанскіх і лясных школах працоўнае навучанне дзяцей прадугледжвалася самім жыццём. Занятасць мужчын у баявых аперацыях, недахоп працоўных рук рабілі непазбежным уцягванне дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту ў дарослыя працоўныя адносіны. У справаздачы Брэсцкага АК ЛКСМБ падкрэслівалася, што адной з асноўных задач лясных школ з’яўлялася “привитие школьникам трудовых навыков, трудовой закалки и трудовой чести” [315, с. 155].



Витебский государственный технологический университет

Дзеці былі задзейнічаны ў першую чаргу ў гаспадарчых ротах. Аднак гэтае месца заставалася самым нелюбімым у падлеткаў. Прызначэнне туды (пасля прыняцця ў атрад) успрымалася як знявага для дзяцей старэйшага ўзросту, бо яны жадалі трапіць адразу ў баявы склад атрада і выконваць баявыя даручэнні, а не калоць дровы ці абіраць на кухні бульбу. Разам з тым, праца ў гаспадарчых ротах была не менш важнай за ваенныя дзеянні. Як адзначалася ў архіўных дакументах, дзіця на кухні, незалежна ад таго, якую работу яно выконвала, замяняла аднаго дарослага, які ў гэты час быў заняты ў барацьбе з ворагам [184, арк. 147]. Сітуацыя з выкарыстаннем працы дзяцей нагадвала становішча ў савецкім тыле, дзе пасля мабілізацыі ўсіх рэсурсаў краіны на заводах і фабрыках працавалі 12 – 16-гадовыя падлеткі і выконвалі нормы дарослых.

Не было ніводнай (зразумела, неваеннай) справы на тэрыторыі сямейнага лагера, дзе б не былі задзейнічаны падлеткі, незалежна ад таго, быў сфарміраваны тут піянерскі атрад ці не. У справаздачы партызанскага атрада імя Калініна брыгады імя Дзяржынскага Брэсцкай вобласці даецца наступны пералік заняткаў дзяцей: “подвозят дрова, рубят их, перегоняют лодки с продуктами (в партизанскую зону), подметают двор, перебирают картофель, пасут скот” [229, арк. 13 зв.]. Па ўспамінах Т.К. Кот, піянеркі дружыны імя С. Васілеўскага партызанскага атрада імя Калініна, асабліва складаным была дастаўка прадуктаў ад канала ў лагер з-за дрэннага абутку. Да гэтага неабходна дадаць працу ў майстэрнях, калі такія меліся на тэрыторыі партызанскага лагера. Так, у сямі сямейных лагерах Баранавіцкай вобласці дзеці былі заняты на работах у шавецкіх, кравецкіх майстэрнях, вывучалі слясарную справу [226, арк. 3 – 4]. У такіх майстэрнях знаходзілася праца для дзяцей, прынятых з дзетдамоў. Старэйшыя выхаванцы Падлужскага дзетдома Мсціслаўскага раёна дапамагалі рамантаваць абутак, хаця дзеці былі фізічна непаўнацэннымі [285, с. 397].

Значнае месца ў жыцці насельнікаў грамадзянскіх лагераў займалі сяўба і збор ураджаю, паколькі ад гэтага залежала забяспечанасць хлебам на зіму. Каб атрымаць добры ўраджай, пасевы неабходна было апрацоўваць на працягу перыяду іх росту і выспявання. Да гэтай працы актыўна прыцягваліся падлеткі. Камандаваннем партызанскага атрада імя Дзімітрава Брэсцкага злучэння было выдадзена спецыяльнае распараджэнне пра ўзмацненне барацьбы за захаванне пасеваў. З гэтай мэтай патрабавалася выдзеліць спецыяльных людзей з ліку непрацаздольных для аховы палёў, а са з’яўленнем пустазелля – тэрмінова групу для яго ліквідацыі [183, арк. 11]. На наш погляд, пад непрацаздольнымі людзьмі, якія павінны былі выконваць акрэсленыя работы, камандаванне мела на ўвазе дзяцей і старых.

Витебский государственный технологический университет

Найбольш поўна працоўную дзейнасць падлеткаў, дзяцей старэйшага школьнага ўзросту ў сямейных лагерах можна разгледзець на прыкладзе піянерскага атрада імя С. Васілеўскага партызанскага атрада імя Калініна Брэсцкага злучэння. Адметнасцю працоўнай дзейнасці была цесная яе сувязь са структурай дружыны. Штодзённая работа размяркоўвалася па звёнах з агаворваннем канкрэтных абавязкаў. Працоўны дзень пачынаўся з маскіроўкі лагера. Зімой сцяжынкі закідвалі снегам, летам – зялёнай травой, каб яны не чарнелі. Абавязковым было дзяжурства на кухні. У абавязкі дзяжурных уваходзіла абіранне бульбы, колка дроў, мыццё посуду, паднос вады [12, арк. 8 – 9]. Прычым рабіць гэта трэба было для насельніцтва ўсяго лагера (у сярэднім яно складала 200 – 300 чалавек). Піянерамі штодзённая занятасць на дадатковых, а нярэдка, і на асноўных работах успрымалася як дапамога партызанам, набліжэнне Перамогі. Канешне, кожнаму юнаку і дзяўчыне хацелася змагацца ў баявым складзе партызанскага атрада, аднак і яны разумелі, што неабходна выконваць гаспадарчыя даручэнні, што забеспячэнне быту партызан не менш важная справа.

Сярод працоўных заняткаў падлеткаў нельга не адзначыць дзейнасць па стварэнні ўмоў для ўласнага навучання і адпачынку. Разам і пад кіраўніцтвам дарослых яны расчышчалі месцы для пабудовы школ, спартыўных пляцовак, турнікоў, удзельнічалі ў пабудове зімняга лагера. Па ўспамінах Т.К. Кот “мы подносили бревна, помогали пилить, добывать мох. Мох приходилось драть из травы руками, болели пальцы. Часто травой резали руки, срывали ногти. Но это было задание наше – пионерское, а не выполнить нельзя” [12, арк. 6]. У такіх адносінах да працы, да заданняў партызанскага камандавання адчуваецца моцны ўплыў даваеннага выхавання. Адным з лозунгаў піянерскай работы ў СССР быў наступны: піянер заўсёды гатовы да абароны Радзімы і да працы. Закладзенае даваенным выхаваннем разуменне неабходнасці ўдзелу ў жыцці краіны, стаханаўскі рух, датэрміновае выкананне пяцігадовых планаў дарослымі (многія формы працоўнай дзейнасці пераносіліся і на дзяцей, асабліва на піянераў як адно са звёнаў структуры грамадска-палітычнага жыцця разам з партыяй і камсамолам) прадвызначылі актыўнасць удзелу дзяцей ва ўсіх справах сямейных лагераў.

Найбольш яскрава прыўнясенне дарослых форм працоўных адносін, норм жыцця адлюстравана ва ўцягванні піянерскіх дружын і вучняў розных класаў у сацыялістычнае спаборніцтва. Знойдзены ў архіве БДМГВАВ сацдагавор паміж вучнямі 3-га і 2-га, 2-га і 1-га класаў быў прымеркаваны да першамайскага загада т. Сталіна 1943 г. Дзеці бралі на сябе наступныя абавязкі: вучыцца на выдатна, не спазняцца на заняткі, быць чыстымі і акуратнымі, выконваць школьныя



Витебский государственный технологический университет

заданні, актыўна ўдзельнічаць ў грамадска-палітычным жыцці атрада, сабраць па 1 кг лекавых траў [13, арк. 1]. Дадзены дакумент прасякнуты захапленнем агульнай справай, адчуваннем уласнага ўнёску ў Перамогу. Хацелася б яшчэ раз падкрэсліць, што нельга ўявіць дзяцей球 рознага ўзросту асобна ад дарослага жыцця. Такія ўзаемадачыненні былі абумоўлены ў першую чаргу ўмовамі вайны, узрастаннем ролі самога дзіцяці ва ўласным выжыванні і адначасова ролі дарослага, які працягваў выконваць аберагальную функцыю. Адбылося пранікненне дзіцячага соцыуму ў дарослую ўзроставую групу, перайманне яе форм функцыянавання, што прыводзіла да непазбежнага ранняга сталення дзяцей.

У пазашкольным жыцці дзяцей не страцілі сваёй значнасці гурткі “Готов к труду и обороне”, “Будь готов к труду и обороне”, у якіх пераважна ранейшаму пераважала роля практычных навыкаў. У занятках па ваеннай справе бралі ўдзел партызаны, якія перадавалі дзецям уласны вопыт. На ўроках школьнікі вывучалі баявую зброю, здавалі нормы па супрацьпаветранай і супрацьхімічнай абароне, вучыліся аказваць першую медыцынскую дапамогу. Так, навучэнцамі лясной школы пры партызанскім атрадзе імя Калініна брыгады імя Дзяржынскага за 1943/1944 н.г. была вывучана страявая падрыхтоўка, арганізавана здача норм ПВХО, ГСО па звёнах, праводзіліся спаборніцтвы па бегу, скачках у даўжыню і вышыню і г.д. Па кожным відзе ваенна-спартыўных гульняў вучні здавалі залікі [11, арк. 20 зв.].

Для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту (15 – 17-гадовых) ваенізацыя праявілася ў закліку да вывучэння і авалодання некалькімі баявымі спецыяльнасцямі. Бюро ЦК ЛКСМБ 21 жніўня 1942 г. прыняло спецыяльнае рашэнне, якім абавязала камсамольскія органы і атрадныя арганізацыі ствараць гурткі па падрыхтоўцы сапёраў, кулямётчыкаў, аўтаматчыкаў, мінамётчыкаў, падрыўнікоў, знішчальнікаў танкаў, санінструктараў [132, с. 166]. Асноўная маса моладзі праходзіла курс маладога партызана. Для падлеткаў такая падрыхтоўка (уключала асноўныя палажэнні страявога статута, дысцыплінарнай і каравульнай службы, матэрыяльную частку зброі, тактычныя заняткі) праводзілася на ўроках як частка навучальнага працэсу. Як паказваюць архіўныя матэрыялы, падлеткі не толькі вучыліся вайсковай справе, але і станавіліся лепшымі сярод маладых байцоў у атрадах [187, арк. 12]. Піянеры старэйшага ўзросту пастаянна стаялі на варце па ахове лагера. На такой службе, напрыклад, былі задзейнічаны 8 старшакласнікаў партызанскага атрада імя Жданава брыгады імя Свярдлова.

Адным з заданняў па вайсковай падрыхтоўцы стаў збор зброі. Гэтай справе надавалася вялікая ўвага, паколькі адной з задач партызанскага руху была “мабілізацыя неваеннаабавязанага насельніцтва на збор зброі і боепрыпасаў” [181, арк. 255]. Пасля баёў з

Витебский государственный технологический университет

фашыстамі, якія нярэдка праводзілі карныя аперацыі і падыходзілі блізка да сямейных лагераў, а часта і ліквідавалі іх, заставалася многа зброі. Яна і станавілася трафеем дзяцей. Так, вучні школ Акцябрска-Любанскай зоны Палескай вобласці здалі партызанам 20 скрынак патронаў, больш за 100 вінтовак, 15 кулямётаў, аўтаматаў і пісталетаў [185, арк. 325].

Разнастайныя формы працы з дзецьмі ў лясных і партызанскіх школах былі падпарадкаваны прынятаму піянерскаму дэвізу: “Выдатнай вучобай і карыснымі справамі наблізім Перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі!”. Лозунг нёс пэўную сэнсавую нагрузку. Кожны дзень дзяцей у партызанскіх шэрагах павінен быў быць напоўнены актыўным удзелам у жыцці насельніцтва партызанскай зоны. І калі для дарослых такія ўстаноўкі былі сфармуляваны ў лозунгах “Колькі ты забіў фашыстаў?”, то ад дзяцей патрабавалася выдатна вучыцца і дапамагаць дарослым у гаспадарчых справах. Укараненне ў масавую свядомасць такіх лозунгаў спрыяла яе ваенізацыі, таму кожны піянер у пасляваенны перыяд мог з гонарам сказаць: “Так, я таксама змагаўся з акупантамі!”

Такім чынам, дзейнасць партызан і падпольшчыкаў у адносінах да дзяцей уключала два асноўныя накірункі: іх выратаванне ад знішчэння акупантамі і вывазу ў Германію і выхаванне сапраўдных патрыётаў сваёй Радзімы. Першае стала важным таму, што акупанты мелі канкрэтна распрацаваную праграму германізацыі і генацыду дзяцей, якую актыўна рэалізоўвалі на захопленых тэрыторыях. Партызаны і падпольшчыкі выкарыстоўвалі ўсе магчымыя і даступныя сродкі для абароны падрастаючага пакалення. У гэтым ім дапамагала мясцовае насельніцтва, якое прымала іх у свае сем’і, карміла і клапацілася.

Створаная патрыётамі сістэма савецкіх школ была супрацьпастаўлена акупацыйнай сістэме адукацыі на розных яе ўзроўнях. У гэтым супрацьстаянні яскрава прасочваецца барацьба дзвюх ідэалогій за падрастаючае пакаленне, за права на нацыянальную самабытнасць і далейшае існаванне беларусаў у якасці самастойнага этнасу. Арганізацыя школьнай і пазашкольнай дзейнасці давала магчымасць для сацыялізацыі дзяцей у грамадства, што жыло ва ўмовах вайны, выконвала немалаважную функцыю кантролю. Тут ажыццяўляўся і адзіны выхаваўчы прынцып: “Падрастаючае пакаленне павінна быць выхавана ў духу савецкага патрыятызму, адданасці сацыялістычнай Радзіме, нянавісці да ворага”. Школа выконвала маральна-выхаваўчую функцыю. Па ўспамінах настаўнікаў, “школа вселяла уверенность в силу партизан и победу Красной Армии” [232, арк. 196], а па прызнанні вучняў – “самое лучшее, что осталось в памяти с того жуткого времени, – это наша школа. Учеба и пионерская работа

Витебский государственный технологический университет

пробудили все наши мечты и думы о Родине. Мы жили жизнью всей страны” [142, с. 24].

## 3.2 Накірункі і формы барацьбы дзяцей

З першых дзён вайны дзеці разам з дарослымі актыўна ўключыліся ў барацьбу з акупантамі. Адным з фактараў, які абумовіў удзел падрастаючага пакалення ў супраціўленні, стала даваенная савецкая сістэма выхавання. Дзеці, як частка савецкага грамадства, былі аб’ектам уздзеяння афіцыйнай ідэалогіі, якая ў значнай ступені рыхтавала грамадства да магчымай вайны. Дзяржаўная дактрына пра варожае капіталістычнае атачэнне, у якую так шчыра верыў народ, несла ў сабе інфармацыю, хаця і “скрытую”, пра яе непазбежнасць.

Гэтая акалічнасць знайшла сваё адлюстраванне і ў дзіцячай свядомасці, паколькі ў асяродку дзяцей і моладзі засвойваліся погляды, што панавалі ў сям’і ці найбліжэйшым акружэнні, у тым ліку і ў ацэнцы знешне- і ўнутрыпалітычных падзей. Дзеці любілі чытаць ваенныя кніжкі, гуляць у “вайну”, глядзелі разам з дарослымі фільмы і спявалі песні пра непераможную Чырвоную Армію, выхоўваліся на кінастужках пра Чапаева, Катоўскага, чырвонагвардзейцаў. У адпаведнасці з канцэпцыяй “біць ворага на яго тэрыторыі” былі зняты кінастужкі “Калі заўтра вайна”, “Эскадрылля № 5” і інш. Вывучэнне чытацкіх інтарэсаў, праведзенае ў 1932/1933 навучальным годзе, паказала, што дзеці аддаюць перавагу кнігам з серыі “Дзецям пра вайну” [136, с. 16].

Акрэсленая вышэй дактрына дзяржавы і партыі непасрэдна ўплывала на навучальна-выхаваўчы працэс у 30-я гг. ХХ ст. Школа, піянерыя і камсамол павінны былі стаць праваднікамі гэтых ідэй. У праекце новых законаў для юных піянераў адзначалася, што “пионер готовится стать бойцом Красной Армии. Он укрепляет оборону своей страны” [141, с. 97]. Папулярызаваўся ўдзел хлопцаў і дзяўчат у розных гуртках абарончага характару. У 1931 г. быў уведзены комплекс “Готов к труду и обороне”, а ў 1934 г. – “Будь готов к труду и обороне”. Пасля ўсебаковай падрыхтоўкі, якая ўключала не толькі пэўны аб’ём тэарэтычных ведаў, але і авалоданне практычнымі навыкамі і ўменнямі, вучні выконвалі нарматывы і атрымлівалі значкі як пацвярджэнне пройдзенага курса. Асаблівай папулярнасцю карыстаўся стралковы спорт. Толькі за першую палову 1940 г. у БССР нормы на значок “Юны варашылаўскі стралок” здалі больш за 5 тыс. школьнікаў [141, с. 107].

У 1935 г. ЦК ВЛКСМ і Наркамасветы СССР прынялі “Положение об ученических организациях в начальной, неполной средней и средней школе”. Вучнёўскім калектывам неабходна было “вовлекать учащихся в физкультурные кружки, сдачу норм на «Ворошиловского стрелка», ГТО, ГСО” [136, с. 100]. Было прэстыжным не толькі мець усе пералічаныя значкі, але і ўдзельнічаць у спаборніцтвах, грамадскім

Витебский государственный технологический университет

жыцці, прымаючы яго нормы. Пачынаючы з 1939 г. штогод сталі праводзіць Усесаюзныя абарончыя спаборніцтвы піянераў і школьнікаў. За перадваенныя гады ў БССР было створана больш за 5 тыс. ваенных абарончых гурткоў. Разгорнутыя мерапрыемствы па папулярызацыі піянерскага руху садзейнічалі росту піянерскіх шэрагаў. Напярэдадні вайны ў БССР налічвалася 400 тыс. піянераў [141, с. 106].

Лагічным завяршэннем працэсу ваенізацыі школьнага і пазашкольнага жыцця падрастаючага пакалення стала прыняцце на IV пазачарговай сесіі ВС СССР у 1939 г. “Закона аб усеагульным воінскім абавязку”. У 5 – 7 класах уводзілася пачатковая вайсковая падрыхтоўка, а ў 8 – 10 – дапрызыўная [320, с. 12]. Ужо да канца 30-х гадоў у масавай свядомасці дзяцей быў сфарміраваны тыповы вобраз савецкага піянера: “пунктуальнага, акуратнага, які сур’ёзна адносіцца да справы, які можа назіраць, спрытнага, кемлівага”, гатовага ў любы момант дапамагчы ў абароне Радзімы. Апошняе заставалася галоўнай выхаваўчай задачай [3, с. 9].

Савецкая сістэма выхавання ў перадваенныя гады была ваенна-патрыятычнай па сваёй сутнасці. Галоўнай мэтай выхаваўчай працы з’яўлялася гатоўнасць маладога пакалення пры неабходнасці ў любы момант узняцца са зброяў у руках на абарону Радзімы. Побач з гэтым неаднаразова падкрэсліваўся класавы характар барацьбы як у будучай вайне, так і ўнутры савецкага грамадства. З’явілася асобная катэгорыя дзяцей – дзеці “ворагаў народа”, якія па адносінах да іх настаўнікаў і вучняў адчувалі сваё прыніжанае становішча. Па ўспамінах братоў Сакалоўскіх (у гады акупацыі былі выхаванцамі дзетдома ў “Драздах”, удзельнікамі партызанскага руху), бацьку якіх рэпрэсіравалі, “с нами никто не хотел сидеть за одной партой. Пустовали парты и впереди, и сзади. С нас сняли пионерские галстуки” [52, с. 7]. Неабходна адзначыць, што паняцце класавай барацьбы ў гады вайны не ўсведамлялася дзецьмі і не было для іх матывам уключэння ў барацьбу.

Увядзенне практыкі ўдзелу ў абарончых гуртках, здача норм на “ГТО” і “БГТО” садзейнічала ўцягванню дзяцей у піянерскі рух, рабіла пазашкольную дзейнасць больш цікавай і разнастайнай. Ваенныя гульні, уменне карыстацца зброяй, сувязі з Чырвонай Арміяй рамантызавалі і гераізавалі прафесію вайскоўца, а будучая барацьба ўяўлялася хуткай і пераможнай. Сапраўдная сутнасць вайны – забойствы, страта сяброў, калецтвы, пазбаўленне чалавека, няхай і ворага, жыцця – адсоўваліся на другі план.

Такім чынам, у 1930-я гады ў сістэме выхавання падрастаючага пакалення значную ўвагу надавалі ваенізацыі. Спроба даць некаторую падрыхтоўку праз ваенныя гульні і абарончыя гурткі спрыяла таму, што дзеці верылі, што ў выпадку вайны змогуць аказаць дапамогу Чырвонай Арміі. Разам з тым, непасрэдным штуршком да масавага ўдзелу дзяцей

Витебский государственный технологический университет

у барацьбе на акупаванай тэрыторыі Беларусі сталі страта сваякоў і гвалт, які чынілі гітлераўцы.

Удзельнікі дзіцячага руху супраціўлення – гэта непаўналетняя, неваеннаабавязаная катэгорыя савецкіх грамадзян. Згодна міжнароднаму праву ўдзел дзяцей (маюцца на ўвазе асобы да 18 гадоў) у ваенных канфліктах забаронены законам. Характар барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, які можна вызначыць як народны, спрыяў удзелу ў супраціўленні ворагу розных ўзроставых груп. Афіцыйная дактрына падкрэслівала, што "у нас все воюют, от малого до старого защищают Родину" [79, арк. 3 зв.], хаця на працягу акупацыі мерапрыемствы падпольных партыйных і камсамольскіх органаў абаранялі дзяцей у першую чаргу ад узброенага супрацьстаяння.

У Статуце піянерскай арганізацыі адзначалася, што ў выпадку вайны дапамога піянераў спатрэбіцца ў першую чаргу ў тыле, а таксама па абароне дзяржаўнай маёмасці, у назіранні за падазронымі асобамі, выяўленні дыверсантаў [54, с. 6]. Разам з тым, захопніцкая палітыка нямецкай арміі і жорсткасць акупацыйнага рэжыму абумовілі непасрэдны ўдзел дзяцей у антыфашысцкай барацьбе. Аналіз комплексу архіўных дакументаў і матэрыялаў дазваляе гаварыць пра наступныя асноўныя накірункі барацьбы дзяцей супраць акупантаў:

1) узброеная барацьба падпольных піянерскіх атрадаў; у складзе партызанскіх фарміраванняў, патрыятычнага падполля;

2) няўзброенае супраціўленне.

Неабходна падкрэсліць, што пад узброенай барацьбой неабходна разумець удзел дзяцей у баявых аперацыях партызан і падпольшчыкаў, правядзенне дыверсій падпольнымі піянерскімі атрадамі. У рамках другога накірунку будуць разгледжаны збор зброі, інфармацыі пра ворага, распаўсюджванне лістовак, нелегальнай савецкай літаратуры, выкананне функцый сувязных, агентурных разведчыкаў. Акрэсленыя праявы ўзброенай і няўзброенай барацьбы з'яўляюцца формамі супраціўлення падрастаючага пакалення.

Аднымі з першых удзел у абароне Радзімы прынялі падлеткі, што знаходзіліся ў Брэсцкай крэпасці. У падвале Цытадэлі разам з салдатамі 333-га стралковага палка змагаліся выхаванцы музыканцкіх узводаў. К. Новікаў і П. Клыпа хадзілі ў разведку па заданні лейтэнанта Патапава. Ім удалося знайсці склады са зброяй, прадуктамі харчавання. Дзяўчынкі, дзеці абаронцаў, разам з жанчынамі аказвалі медыцынскую дапамогу. Не менш важнай справай для падлеткаў было здабыццё вады з р. Мухавец для параненых салдат і кулямётаў. Усё гэта піянеры рабілі нягледзячы на загады камандзіра абароны І. Зубачова, яго намесніка палкавога камісара Я. Фаміна, кіраўніка абароны Усходняга форта П. Гаўрылава заставацца выключна ў падвалах, набіваць патронамі дыскі да кулямётаў, аўтаматаў, дапамагаць цяжка параненым [129, с.



Витебский государственный технологический университет

78]. Аднак загад не выконваўся абодвума бакамі, хаця старэйшыя імкнуліся яго прытрымлівацца. Падлеткі жадалі ўдзельнічаць у супрацьстаянні, паколькі іх выхоўвалі ў традыцыях рэвалюцыйнай героікі і барацьбы, а дарослыя камандзіры не маглі абысціся без дапамогі дзяцей: разведвальныя і пошукавыя функцыі не заўсёды маглі выканаць салдаты.

Фашысты стварылі невыносныя ўмовы для абаронцаў крэпасці. Недахоп ежы і вады, чыстага паветра, абстрэлы з боку ворага прымусілі кіраўнікоў абароны пайсці на крайнія меры. Жанчыны разам з дзецьмі па загадзе камандавання пакінулі крэпасць і здаліся ў палон. Трапілі ў палон і 5 выхаванцаў музаканцкага ўзвода: П. Кацельнікаў, П. Клыпа, В. Ізмайлаў, К. Новікаў, В. Казьмін. Гітлераўцы прыраўнялі іх да салдат і змясцілі ў лагер для ваеннапалонных Бела-Падляска, дзе яны прабылі 12 дзён, а затым перавялі ў Брэсцкую турму, з якой ім пашчасціла выбрацца. Па падліках даследчыцы А.А. Грабёнкінай, больш за 50 жонак, маці і дзяцей-падлеткаў камандзіраў Чырвонай Арміі Брэсцкага гарнізона знаходзіліся ў падвалах крэпасці [47, с. 170]. На наш погляд, гэтая лічба не канчатковая, бо да гэтай колькасці неабходна дадаць выхаванцаў 333-га палка, а таксама выхаванцаў іншых узводаў, пра далейшы лёс якіх нічога невядома.

Адзін з прыкладаў удзелу падлеткаў у антыфашысцкай барацьбе на пачатковым этапе вайны – гэта дапамога знішчальным батальёнам і атрадам народнага апалчэння (ствараліся адпаведна з дырэктывай СНК і ЦК КП(б)Б ад 23 чэрвеня 1941 г.). Так, пры знішчальным батальёне г. Жлобіна (створаны 27 чэрвеня 1941 г.) была сфарміравана група разведчыкаў з 13-14-гадовых падлеткаў. Яны шмат разоў хадзілі ў тыл нямецкіх войскаў і прыносілі камандаванню 63-га стралковага корпуса, які абараняў г. Жлобін, каштоўныя звесткі. Па ўспамінах аднаго з удзельнікаў абароны Рамізькі Я., “с группой ребят или один я ходил в Красный Берег. Я плакал и делал вид, что ищу мать, и в тоже время отмечал местонахождение блиндажей, складов оружия, штабов. Вся наша группа обучалась стрельбе из боевых винтовок” [231, арк. 2]. Камандаванне цаніла той факт, што падлеткі пранікалі ўсюды, куды не маглі трапіць дарослыя вопытныя разведчыкі [278, с. 167]. Усяго ў ліку 91 байца знішчальнага батальёна было 11 школьнікаў (12,09 %), большасць з якіх засталіся ў акупаваным горадзе і ўвайшлі ў склад падполля [Падлічана па: 278, с. 137 – 139].

Піянеры аказвалі дапамогу гомельскаму народнаму апалчэнню. Пры ім была створана спецыяльная “Косціна брыгада” у колькасці каля 300 падлеткаў. Яна займалася зборам пустых бутэлек, якія потым выкарыстоўвалі для падпальвання танкаў (так званы “кактэйль Молатава”). Усяго за два тыдні піянерамі было перададзена на прадпрыемства каля 24 тыс. бутэлек [273, с. 118]. Пра актыўную



Витебский государственный технологический университет

дапамогу дзяцей часцям Чырвонай Арміі сведчыць інфармацыйная запіска сакратара Палескага абкама КП(б)Б П.А. Лявіцкага ў ЦК КП(б)Б ад 13 ліпеня 1941 г., у якой ён адзначаў, што "ребятишки подносят ведрами для бойцов воду, дежурят на пути следования воинских частей и оказывают им всемерную помощь" [15, с. 188].

Прыведзеныя факты сведчаць пра тое, што дзеці не засталіся і не маглі застацца ў баку ад барацьбы з агрэсарам. Нягледзячы на несумяшчальнасць слоў "дзеці і вайна", на акупаванай тэрыторыі Беларусі меў месца беспрэцэдэнтны прыклад масавага гераізму дзяцей. Іх дзейнасць па выкананні тых функцый (дапамога ў ахове важных гаспадарчых аб'ектаў, калгаснай маёмасці, перагон калгаснай жывёлы, праца ў тыле), якія былі сфармуляваны ў Статуце піянерскай арганізацыі ў выпадку пачатку вайны, стала пераходным этапам да ўдзелу ў барацьбе разам з дарослымі.

Дырэктывы кіраўнікоў дзяржавы па разгортванні руху супраціўлення былі накіраваны на стварэнне невыносных умоў для германскай арміі. У дырэктыве ЦК КП(б)Б № 2 партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям па разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага ад 1 ліпеня 1941 г. партызанам была пастаўлена задача "широко привлечь детей и женщин в качестве разведчиков и связистов" [179, арк. 26]. Пералічаныя ў дакуменце функцыі, а таксама дзейнасць дзяцей па аказанні дапамогі атрадам народнага апалчэння акрэслілі іх месца і формы няўзброенага супраціўлення акупантам.

Уцягнутасць дзяцей у піянерскі рух напярэдадні вайны абумовіла прымальную для школьнікаў арганізацыйную форму барацьбы з ворагам. Піянерскі атрад меў унутраную структуру, а яго члены былі аб'яднаны агульнымі ідэаламі, мэтамі барацьбы, адчуваннем калектывізму і ўзаемадапамогі. Першыя піянерскія групы, як і першыя партызанскія атрады, падпольныя групы, узніклі ўжо ў ліпені 1941 г. Ствараліся яны па ініцыятыве саміх піянераў. Многія дзеці дзейнічалі спачатку невялікімі групамі, асабліва яскрава гэта бачна на прыкладзе збору і захавання зброі на месцах баёў. На пачатковым этапе (лета 1941 г.) піянерскае падполле не падпарадкоўвалася ні партыйным, ні партызанскім структурам, паколькі апошнія яшчэ не замацаваліся ў населеных пунктах, не мелі трывалых сувязяў з цэнтрам. Дадзены лозунг "Піянер павінен быць гатовым да абароны сваёй Радзімы" набыў рэальнае гучанне з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. На працэс стварэння падпольных піянерскіх атрадаў паўплываў гвалт, які чынілі гітлераўцы на тэрыторыі Беларусі, прыклад дарослых, асабліва партыйцаў і камсамольцаў, якія сталі арганізоўвацца ў невялікія групы ці вялі размовы пра тое, што змагацца з фашыстамі можна не толькі на перадавой. Бачачы такія дзеянні дарослых, падлеткі таксама ўключаліся

Витебский государственный технологический университет

ў барацьбу. Дапамога, якую яны аказвалі партызанам і падпольшчыкам, стала істотным укладам у агульную справу Перамогі.

Матэрыялы архіваў і перыядычнага друку даюць магчымасць больш падрабязна разгледзець дзейнасць двух падпольных піянерскіх атрадаў: барысаўскага і ў в. Карпаўцы Ваўкавыскага раёна. Звесткі пра атрады, што існавалі ў іншых населеных пунктах Беларусі, носяць фрагментарны характар.

Падпольная дзіцячая арганізацыя в. Карпаўцы Ваўкавыскага раёна Беластоцкай вобласці "Піянерскі тайнік" характарызавалася падпольным абкамам КП(б)Б як самая моцная камсамольска-піянерская арганізацыя ў раёне [228, арк. 60 – 62]. Узнікла ў жніўні 1941 г. і першапачаткова налічвала 15 чалавек, хаця ўжо ў канцы 1943 г. засталося толькі 7. Структура піянерскага атрада перыяду акупацыі ў некаторай ступені паўтарала даваенную. Існаваў савет атрада на чале з М. Сарокам, яго намеснікам абралі Н. Хамко. Група была створана па прыкладзе падпольнай камсамольскай арганізацыі, якой кіраваў старэйшы брат М. Сарокі В. Сарока. Факт роднасных сувязяў не адзінкавы: члены падпольных піянерскіх арганізацый мелі сваякоў у камсамольскіх і партыйных групах, партызанскіх атрадах, ад якіх і атрымлівалі заданні.

Напачатку арганізацыя в. Карпаўцы займалася зборам зброі. Пад выглядам пастушкоў яе члены цэлы дзень праводзілі ў лесе. Знойдзеную зброю надзейна хавалі. На адным з пасяджэнняў Савета атрада ў мэтах бяспекі было вырашана перадаць яе партызанам Ленінскай брыгады: 40 кг тола, 10 тыс. патронаў, ручны кулямёт, 7 вінтовак, гранаты [228, арк. 60 – 62].

У канцы 1941 – пачатку 1942 г. былі наладжаны сувязі са штабам партызанскага атрада імя Калініна і падпольным абкамам КП(б)Б Беластоцкай вобласці. Менавіта яны накіроўвалі і кантралявалі далейшую дзейнасць піянераў. Па ўспамінах кіраўніка камсамольскага падполля Т.М. Стрыжака, "члены гэтай дзіцячай арганізацыі былі нашымі разведчыкамі, яны шмат сабралі патронаў, паперы і г.д." [275, с. 248]. Унутры арганізацыі існаваў падзел заданняў адпаведна ўзросту. Малодшыя члены (пачынаючы з 9-ці гадоў) займаліся распаўсюджваннем зводак Саўінформбюро, падпольнай літаратуры, лістовак. Старэйшыя (13–15 -гадовыя) удзельнічалі непасрэдна ва ўзброенай барацьбе, хадзілі з партызанамі і камсамольцамі на баявыя заданні. Так, з удзелам членаў "Піянерскага тайніка" ў маі 1943 г. была ўзарвана турбіна на цагляным заводзе "Рось", у жніўні 1943 г. – топка на гэтым жа заводзе, у маі 1944 г. – замініраваны мост на дарозе Ваўкавыск – Рось [228, арк. 60 – 62]. У лютым 1944 г. пасля арышту шэрагу членаў падпольнай арганізацыі астатнія пайшлі ў партызанскі

Витебский государственный технологический университет

атрад імя Калініна, дзе працягвалі барацьбу да моманту злучэння з Чырвонай Арміяй.

Падобным чынам функцыянаваў піянерскі атрад у г. Барысаве. Ён узнік у першыя дні вайны. Першапачаткова гэта была група з двух школьнікаў: В.Пашкевіча (вучаня 6-га класа, камандзіра атрада) і А. Клімковіча. Агульнае кіраўніцтва дзеяннямі школьнікаў ажыццяўляў Л. Арлоў, айчым В. Пашкевіча, камуніст, адзін з членаў падпольнай патрыятычнай групы г. Барысава. У пасляваенны перыяд пры складанні спіса найбольш актыўных удзельнікаў барысаўскага гарадскога падполля ў яго былі ўключаны і члены піянерскага атрада [10, арк. 45]. Іх дзейнасць працягвалася да лета 1942 г., пакуль не ўзнікла пагроза выкрыцця арганізацыі. Дзяцей перапраўілі ў партызанскі атрад, а ў сакавіку 1943 г. – самалётам у савецкі тыл [289, с. 3].

Актыўная дзейнасць барысаўскіх піянераў праявілася ў зборы зброі. Скарыстаўшы дрэнную арганізацыю аховы нямецкіх складоў, яны з дапамогай партызан вынеслі 263 вінтоўкі, 25 аўтаматаў, 1 кулямёт, вялікую колькасць гранат, патронаў і толу, а таксама правялі наступныя дыверсіі: знішчылі склады з сенам (800 т), з нямецкім абмундзіраваннем, 37 эшалонаў з харчаваннем, падарвалі бензабак на нафтабазе [10, арк. 7].

Агляд дзейнасці падпольных піянерскіх арганізацый дазваляе выдзеліць некаторыя агульныя рысы, якія, на наш погляд, будуць характэрнымі і для іншых арганізацый, што дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі Беларусі:

Па-першае, яскрава прасочваецца партыйнае і камсамольскае кіраўніцтва дзіцячымі групамі. Разам з тым, пад кантроль яны былі ўзяты не на стадыі ўзнікнення (як правіла, гэта лета 1941 г.), а пазней, калі піянеры ўжо праводзілі некаторую самастойную антыфашысцкую дзейнасць, галоўным чынам па зборы зброі.

Па-другое, у большасці выпадкаў у кіраўніцтве піянерскім падполлем мелі месца роднасныя сувязі. Партыйцы і камсамольцы з'яўляліся блізкімі сваякамі (бацькамі ці братамі) школьнікаў.

Па-трэцяе, піянерскія групы ўзнікалі добраахвотна, па ініцыятыве саміх школьнікаў. Будаваліся яны па прынцыпах даваеннай піянерскай арганізацыі. Канешне, у адрозненне ад партыйнага падполля не існавала строгай канспірацыі, падлеткі ведалі адзін аднаго. Сувязь з цэнтрам (маюцца на ўвазе вышэйстаячыя падпольныя органы) ажыццяўляў кіраўнік групы, астатнія члены маглі не ведаць, адкуль і хто кіруе іх дзейнасцю.

Па-чацвёртае, у піянерскіх групах існавала дыферэнцыяцыя членаў па ўзросце. Дзеці малодшага школьнага ўзросту (да 10 – 12 гадоў) не ўдзельнічалі ва ўзброеным супрацьстаянні. Яны выконвалі разведвальныя функцыі, функцыі сувязных, распаўсюджвалі лістоўкі.



Витебский государственный технологический университет

Падлеткі і дзеці старэйшага школьнага ўзросту былі задзейнічаны як у дыверсійнай, так і ў іншых відах дзейнасці.

Неабходна адзначыць, што ў гады акупацыі пытаннем функцыянавання дзіцячых арганізацый, выхавання дзяцей і іншымі займаліся камсамольскія органы. Па дадзеных на 1943 г. у апараце ЦК ЛКСМБ меўся аддзел школ і піянераў [33, с. 91]. Улічваючы факт масавага ўдзелу дзяцей у партызанскім і падпольным руху і, як непазбежнасць, смяротнасць дзяцей пры выкрыцці патрыятычных груп, у лістападзе 1942 г. ЦК ЛКСМБ прыняў спецыяльны дакумент, адрасаваны абкамам камсамола і ўпаўнаважаным ЦК ЛКСМБ на акупаванай тэрыторыі, "Аб задачах, формах і метадах работы камсамольскіх арганізацый Беларусі сярод дзяцей у тыле ворага". Па нашых звестках, гэта быў адзіны дакумент, што рэгламентаваў і вызначаў дзейнасць камсамола па рабоце з дзецьмі. Згодна яму камсамольскае кіраўніцтва лічыла "недапушчальным узнаўленне піянерскіх арганізацый у тыле праціўніка, каб не дапусціць знішчэння дзяцей" [36, с. 14 – 15]. Асноўнай мэтай з'яўлялася захаванне жыцця дзяцей, узяцце пад кантроль дзейнасці падпольных піянерскіх груп, садзейнічанне дыферэнцыяцыі падлеткаў па ўзроставым крытэрыі: аддзяліць ў першую чаргу малодшую групу школьнікаў. Дзяцей старэйшага школьнага ўзросту, наадварот, уцягвалі ў барацьбу з ворагам у якасці сувязных, разведчыкаў партызанскіх атрадаў, распаўсюджвальнікаў літаратуры, зводак, збіральнікаў зброі, для аказання іншай дапамогі партызанам.

Ужо ў снежні 1942 г. пасля давядзення да ведама падпольных органаў гэтага дакумента інструктарамі ЦК ЛКСМБ былі праведзены праверкі дзейнасці камсамольскіх арганізацый, у тым ліку і на прадмет работы з дзецьмі, існавання піянерскіх атрадаў. У адной з такіх справаздач інструктара ЦК ЛКСМБ Т.І. Гаварэнь "Аб выніках праверкі дзейнасці камсамольскіх арганізацый у Расонскім, Асвейскім і Дрысенскім раёнах Віцебскай вобласці за лістапад – снежань 1942 г." заяўлялася пра адсутнасць піянерскіх атрадаў на тэрыторыі пералічаных раёнаў, аднак падкрэсліваўся ўдзел піянераў і школьнікаў у барацьбе з ворагам [184, арк. 147]. Такім чынам, дакумент ЦК ЛКСМБ не толькі ўстанавіў адказнасць камсамольскіх арганізацый за выхаванне падрастаючага пакалення ў традыцыях савецкай піянерыі, але і садзейнічаў усталяванню іх жорсткага кантролю за дзіцячым рухам з мэтай захавання жыцця падлеткаў наколькі гэта было магчымым ў гады вайны.

Падпольныя дзіцячыя групы дзейнічалі ў дзіцячых установах, што засталіся на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Яны стварaліся пад кіраўніцтвам выхавацеляў (напрыклад, дзетдом у Полацку, у Астрашыцкім Гарадку, у Гомеле і г.д.). Апошнія наладжвалі сувязі з



Витебский государственный технологический университет

патрыятычным падполлем, партызанамі, якія адначасова дапамагалі дзецям прадуктамі харчавання і давалі для выканання спецыяльныя заданні. Педагагічны персанал падтрымліваў сярод дзяцей традыцыі савецкай піянерскай арганізацыі, займаўся з імі па савецкіх праграмах, выхоўваў у нянавісці да ворага. Так, яшчэ летам-восенню 1941 г. выхаванцы дзетдома “Дразды” (Мінская вобласць) збіралі на месцах баёў зброю, патроны, некаторы час хавалі савецкіх чырвонаармейцаў, што ўцяклі з палону [305, с. 43]. Падлеткі – члены падпольнай групы, якая была створана пад кіраўніцтвам Шалака І.П. у 1942 г. у дзетдоме “Астрашыцкі Гарадок”, – хадзілі ў разведку ў Мінск, прыносілі з горада медыкаменты, шрыфты, паперу [285, с. 230]. Дзецям лягчэй было пранікнуць праз пасты ў горад, паколькі ім не патрэбны былі дакументы. Такое супрацоўніцтва падпольшчыкаў і дзяцей-выхаванцаў мела месца ў многіх дзетдамах. Акрамя Астрашыцка-Гарадоцкага дзетдома і дзетдома “Дразды”, можна адзначыць “Сёмкаў Гарадок”, Пустынкаўскі, Падлужскі, Чарэйкаўскі, Быкаўшчынскі дзетдамы [285, с. 57, 76, 99, 124]. Падпольную групу “За родную школу” стварылі настаўнікі і вучні Астрашыцка-Гарадоцкай сярэдняй школы. Яны складалі і распаўсюджвалі лістоўкі, здабывалі для партызан патрэбныя звесткі, удзельнічалі ў знішчэнні здраднікаў і паліцэйскіх. Школьнікі ў колькасці больш за 20 чалавек разам з 7 настаўнікамі пайшлі ў партызанскі атрад, калі ўзнікла пагроза выкрыцця арганізацыі [315, с. 64].

Нягледзячы на небяспеку, якая пагражала дзецям і выхавацелям за стварэнне піянерскіх арганізацый у дзіцячых установах і супрацоўніцтва з патрыётамі, яны ўсё ж дзейнічалі. Менавіта піянерыя была найбольш зручнай арганізацыйнай формай, што дазваляла накіроўваць падлеткаў у іх барацьбе супраць акупантаў. Так, піянерскі атрад Полацкага дзетдома налічваў 16 чалавек 1926 – 1932 г.н. [233, арк. 91]. Яны былі ўцягнуты ў падпольную работу членамі групы “Бясстрашныя”, што дзейнічала ў дзетдоме. Падлеткі займаліся зборам звестак пра полацкі гарнізон, рух на чыгунцы, распаўсюджвалі лістоўкі, хаця пра існаванне падпольнай групы з ліку выхавацеляў, як сведчыць яе кіраўнік і дырэктар дзетдома М.С. Фарынка, яны нічога не ведалі [283, с. 430].

Акрамя барысаўскай і ваўкавыскай, існавалі піянерскія арганізацыі ў іншых населеных пунктах Беларусі. Дакладную іх колькасць зараз вызначыць складана. Падлік ускладняецца тым, што ў архіўных дакументах яны праходзяць як камсамольскія ці патрыятычныя групы без указання ўзросту іх членаў; стварэнне і дзейнасць дзіцячых груп былі забаронены пастановамі партыйных органаў, таму пры складанні справаздач іх уключалі ў склад дзеючага партыйнага ці камсамольскага падполля.

Витебский государственный технологический университет

Лёс піянерскіх арганізацый і груп быў розным. Некаторыя былі раскрыты і знішчаны акупантамі (Ліда, Жлобін, Рагачоў, Орша і інш.) [273, с. 122], частка ўлілася ў склад падпольных груп ці партызанскіх атрадаў.

Па колькасці піянерскія падпольныя атрады значна саступалі колькасці партыйных і камсамольскіх падпольных груп і партызанскіх атрадаў. Хутчэй можна гаварыць пра тое, што дзеці прымалі актыўны ўдзел у дзейнасці падполля і партызан, што не было ніводнай адзінкі супраціўлення, у якой бы не змагаліся юныя патрыёты.

Шырокаму выкарыстанню дзяцей у якасці разведчыкаў, сувязных, распаўсюджвальнікаў нелегальнай літаратуры садзейнічалі ў некаторай ступені тыя негатыўныя фактары, якія прынесла грамадству акупацыя. Павелічэнне колькасці беспрытульных і безнаглядных дзяцей, з’явы бадзяжніцтва, выкарыстанне акупацыйнымі ўладамі дзяцей у якасці разносчыкаў газет, чысцільшчыкаў абутку, адсутнасць у дзяцей да 14 гадоў дакументаў, якія выдаваліся акупантамі,– вось галоўныя ўмовы, якія дазвалялі дзецям не выдзяляцца з натоўпу, не звяртаць на сябе ўвагі, спрыялі выкарыстанню падлеткаў у супраціўленні. Падрыхтоўка дзяцей для выканання заданняў, як правіла, была падобная: ствараўся вобраз падлетка-жабрака, бацькі якога загінулі, дзіцяці, якое думае выключна пра ўласнае выжыванне. Паводле ўспамінаў, юным удзельнікам барацьбы “прыходзілася рыцца на сметніках”, “хадзіць у рыззі”, “з метрыкамі на чужое імя” [300, с. 80, 193, 248].

Жаданне саміх дзяцей удзельнічаць у барацьбе з гітлераўцамі, жорсткасць акупацыйнага рэжыму, а таксама наяўнасць партыйных пастаноў, што рэгламентавалі ўдзел падлеткаў у супраціўленні, абумовілі масавасць дзіцячага руху. Сакратар ЦК ЛКСМБ М.В. Зімянін падкрэсліваў, што “ребята приносят и принесут неоценимую помощь партизанскому движению, разведке” [187, арк. 181]. Усё гэта пацвярджаецца дадзенымі архіўных дакументаў, у прыватнасці, справаздачамі падпольных камсамольскіх органаў. Так, сакратар Вілейскага АК ЛКСМБ Альшанскі адзначаў, што падпольшчыкі распаўсюджваюць лістоўкі праз сваіх агентаў, большасць з якіх падлеткі [186, арк. 39]. Адной з задач масава-палітычнай работы камсамольцаў Брэсцкай вобласці сярод моладзі з’яўлялася “ўцягванне і падрыхтоўка да справы распаўсюджвання нелегальнай літаратуры шырокіх колаў моладзі, дзяўчат, падлеткаў і школьнікаў” [188, арк. 248].

Акрамя ролі распаўсюджвальнікаў нелегальнай літаратуры, вялікая колькасць дзяцей была задзейнічана ў якасці сувязных і агентурных разведчыкаў. Па дадзеных БШПР на 1.10.1946 яны адпаведна складалі 9,56 % і 9,49 % ад агульнай колькасці партызан да 18 гадоў [254, арк. 8]. Усяго ў партызанскіх шэрагах на момант злучэння з Чырвонай Арміяй налічвалася 8,87 % ці 25003 чалавекі, што не



Витебский государственный технологический университет

дасягнулі прызыўнага ўзросту. Прыведзены ў дакуменце пералік у поўнай меры не адлюстроўвае ўвесь спектр форм барацьбы дзяцей. Яны былі не толькі сувязнымі і агентурнымі разведчыкамі, але і ўваходзілі ў падрыўныя групы, з'яўляліся шараговымі байцамі, кулямётчыкамі. Дзеці, як і дарослыя, мелі свае асабістыя рахункі па колькасці пушчаных пад адхон цягнікоў і забітых немцаў. Так, на рахунку аршанкі В.Дземеш было 7 цягнікоў і 24 фашысты. За яе галаву акупанты абяцалі зямлю, карову і 10 тыс. марак [2, с. 21]. Падрыўнікамі ў гады вайны былі таксама К.Гойшык (8 эшалонаў), Л. Косач (камандзір аддзялення групы падрыўнікоў, 12 эшалонаў, 23 аўтамашыны), В. Сітніца (камандзір падрыўной групы партызанскага атрада Г.А. Такуева 125-й партызанскай брыгады Палескай вобласці, 9 эшалонаў) і г.д.

Па заданні падпольных органаў і партызанскага камандавання падлеткі працавалі ў акупацыйных установах і адначасова займаліся падпольнай дзейнасцю: збіралі дадзеныя, выносілі чыстыя бланкі фашысцкіх дакументаў, шрыфты. Так, Л. Міхайлава працавала ў сельскагаспадарчай бухгалтэрыі па заданні Вілейскага падпольнага ГК ЛКСМБ [168, с. 342]; З. Нікалаева – у школе, дзе размясціліся немцы-чыгуначнікі, па заданні Жлобінскага падпольнага ГК ЛКСМБ; Л. Марозава – на віцебскім хлебазаводзе, праводзіла агітацыйныя размовы з немцамі, якія называлі яе "красная до мозга костей" [323, с. 23]; па даручэнні Гомельскага падпольнага гаркама З. Макарэвіч стварыла сваю групу з 8 чалавек рознага ўзросту, якая займалася прапагандай на Гомсельмашы [230, арк. 71]; Я. Петрыкаў – на нямецкай кухні па заданні партызан Жлобінскага раёна. Беспрэцэдэнтны подзвіг у гады Вялікай Айчыннай вайны здзейсніў Ц. Баран з в. Байкі Ружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Ён завёў групу гітлераўцаў у лясную глуш, адкуль выйсці яны не здолелі.

Асобную катэгорыю складалі дзеці, што дайшлі разам з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі да Берліна. Як правіла, гэта былі ўзятыя на выхаванне і забеспячэнне чырвонаармейцамі падлеткі, якія страцілі бацькоў. Траплялі яны ў шэрагі байцоў з партызанскіх атрадаў пасля вызвалення Беларусі. Сярод іх можна назваць В. Дончыка, Ж. Арцеменкава, Л. Кузубава, А. Астравумава і інш.

Узрост дзяцей, што змагаліся ў партызанскіх атрадах, быў таксама розным. У афіцыйным дакуменце, падрыхтаваным БШПР, у агульную колькасць партызан былі ўключаны дзеці ад 1925 – 1926 г.н., верхняя мяжа не акрэслівалася. Каб уявіць сітуацыю больш канкрэтна, разгледзем узрост юных партызан на прыкладзе асабовага складу партызанскага атрада "Непераможны" 3-й Мінскай партызанскай брыгады імя Будзёнага Мінскай вобласці. У атрадзе налічвалася 216 чалавек баявога саставу, у тым ліку 1927 г.н. – 5 чал. (2,31 %), 1928 г.н.



Витебский государственный технологический университет

– 4 чал. (1,85 %), 1929 і 1930 г.н. – па адным чалавекі (0,46 %) [235, арк. 1 – 20]. Усяго 11 дзяцей (5,1 %), запісаных радавымі, у атрад уступілі добраахвотна. Згодна спісу асабовага складу партызанскай брыгады імя Жукава, якая дзейнічала ў Баранавіцкай вобласці, дзеці 1927 г.н. і маладзейшыя за іх складалі 5,2 % (38 чалавек з 732 байцоў) [253, арк. 1 – 37], з'яўляліся шараговымі байцамі. Такім чынам, дзеці старэйшага школьнага ўзросту складалі найбольшую па колькасці групу. Перавага нарадзіўшыхся ў 1927 – 1928 гг. над іншымі ўзроставымі групамі тлумачыцца некалькімі фактарамі. 14 – 16-гадовыя падлеткі нярэдка прыходзілі ў атрады са сваёй зброяй, і камандаванне, кіруючыся рашэннямі пленума ЦК КП(б)Б (люты 1943 г.) пра ўцягванне ў партызанскія шэрагі ўсіх, хто можа насіць зброю і змагацца, прымала іх у атрад. Тым больш, што пераважная большасць падлеткаў была ўключана ў баявы склад у другой палове 1943 – 1944 гг.

Знойдзеныя фрагментарныя звесткі пра колькасць дзяцей у падпольных групах вельмі розныя. Так, напрыклад, у віцебскім гарадскім падполлі змагаліся 52 піянеры і школьнікі [276, с. 516], у гомельскім – 32 чалавекі (5,32 %) [Падлічана па: 277, с. 586 – 601]. У васілішкаўскім антыфашысцкім падполлі (Баранавіцкая вобласць) з 20 чалавек 8 былі падлеткамі (40 %), узроставыя групы наступныя: 1927 г.н. – 4 чал. (20 %), 1928 г.н. – 1 чал. (5 %), 1929 г.н. – 3 чал. (15 %) [190, арк. 205 – 205 зв.]. Складана назваць нават нейкую прыкладную лічбу дзяцей-удзельнікаў падпольнага руху. Тым больш, што многія дзеці з'яўляліся сувязнымі паміж падпольшчыкамі і партызанамі, але не былі аднесены ні да партызан, ні да падпольшчыкаў пры падліках у пасляваенны перыяд.

У кантэксце аналізу колькасці падлеткаў – удзельнікаў барацьбы – нельга не закрануць пытання смяротнасці сярод непаўналетніх барацьбітоў з фашызмам. Дзеці гінулі з першых месяцаў вайны. Так, 26 кастрычніка 1941 г. быў павешаны 14-гадовы піянер В. Шчэрбацэвіч за тое, што хаваў у сябе чырвонаармейца. Па матэрыялах БШПР, за гады акупацыі загінула 1218 (4,9 %) партызан да 18 гадоў, прапала без вестак 880 (7,55 %) [254, арк. 8]. Дадзеных па асобных партызанскіх атрадах нам выявіць не ўдалося. Некаторая статыстыка маецца па падпольных арганізацыях. Так, у Віцебскім гарадскім падполлі загінула 34,6 % піянераў і школьнікаў [276, с. 516], у Аршанскім – 29 чал. (7,9 %) [Падлічана па: 281, с. 322 – 343], у Полацкім – 10 чал. (5,9 %) [Падлічана па: 283, с. 676 – 681]. Як бачым, лічбы розныя, што абумоўлена асаблівасцямі рэгіёна, дзе дзейнічала патрыятычная група, колькасцю самой групы.

Унікальнай з'явай Вялікай Айчыннай вайны была сямейная разведка. Дапамогу падпольшчыкам і партызанам аказвалі цэлыя сем'і, у тым ліку і дзеці. Па ўспамінах М.С. Пруднікава, камандзіра



Витебский государственный технологический университет

партызанскай брыгады “Няўлоўныя”, “на нас, партызан, работалі бацькі, маці, дзеці, унукі. “Сямейная” разведка дазваляла збіраць звесткі з розных крыніц. Гэта былі вочы і вушы партызан” [296, с. 89]. Да ліку такіх сямей можна аднесці сям’ю Вялавых і Лынчанкаў (г. Віцебск), Базылевых (г. Магілёў). Падпольная група С.І. Вялава дзейнічала з верасня 1942 да кастрычніка 1943 г. У групу ўваходзілі, акрамя бацькі, трое яго дзяцей: 16-гадовая Васіліса (“Дзіна”), 14-гадовая Ганна (“Малая”) і 12-гадовы Алёша (“Малыш”). Дзве старэйшыя дачкі па заданні гарадскога падполля ўзарвалі будынак гарадской паліцыі і пашпартнага стала. Аляксей быў сувязным паміж падполлем і партызанамі, разносіў лістоўкі [276, с. 483]. Немцы далі сваю назву такой з’яве: “дамашнія партызаны”. Гэта былі патрыятычна настроеныя мясцовыя жыхары, якія збіралі для партызан зброю, неабходныя звесткі. Пры зручным моманце браліся за зброю, праводзілі дыверсіі, знішчалі гітлераўскіх салдат [173, с. 322]. Падобныя сямейныя групы можна прыраўняць да падпольных, што дзейнічалі пад кантролем партыйных органаў. Хаця напачатку, як і іншыя арганізацыйныя падпольныя структуры, яны ўзнікалі стыхійна, па ўласнай ініцыятыве, без падпарадкавання каму-небудзь. Потым, як правіла, мелі канспіратыўныя кватэры, распаўсюджвалі лістоўкі, збіралі неабходныя звесткі, ажыццяўлялі сувязь паміж падполлем і партызанамі. Пры небяспецы сыходзілі ў партызанскія атрады.

Змагаліся дзеці і ў гета. Вядома, што яўрэі, нягледзячы на страшэнныя ўмовы існавання, фізічную і маральную дыскрымінацыю з боку акупантаў, стваралі на тэрыторыі гета падпольныя групы, наладжвалі сувязі з падпольшчыкамі і партызанамі па-за яго межамі, распаўсюджвалі лістоўкі, прымалі радыёзводкі. Так, у мінскім гета дзейнічала 22 падпольныя групы. Адзін з кіраўнікоў Н. Маркевіч аб’яднаў вакол сябе 14 – 16-гадовых падлеткаў, якія жадалі дапамагчы ў барацьбе і самі выйсці з гета. Яны запісвалі зводкі з Масквы, збіралі зброю і перадавалі яе праз сувязных і падпольшчыкаў-беларусаў у яўрэйскія партызанскія атрады. У верасні 1943 г. групе з 13 падлеткаў пад кіраўніцтвам Ш. Феймана пры дапамозе сувязнога М. Прышчэпчыка ўдалося выйсці з гета і перабрацца ў партызанскі атрад № 106 Ш. Зорына [123, с. 188]. Барацьба ішла і ў іншых гета, аднак гэта пытанне патрабуе асобнага разгляду і вывучэння.

Такім чынам, дзеці прымалі ўдзел у супрацьстаянні з ворагам у складзе партызанскіх атрадаў, падполлі, змагаліся самастойна. Ва ўсіх выпадках яны рызыкавалі жыццём і гінулі разам з дарослымі. Складаныя абставіны акупацыі, неабходнасць прытрымлівацца канспіратыўных мер не дазвалялі патрыётам весці дакладны ўлік удзельнікаў супраціўлення. Таму афіцыйныя лічбы пра колькасць

Витебский государственный технологический университет

дзяцей, што супрацьстаялі ворагу, не ў поўнай меры адлюстроўваюць колькасны бок разглядаемага пытання.

Неабходна адзначыць, што, уступаючы ў шэрагі партызан і падпольшчыкаў, большасць прадстаўнікоў падрастаючага пакаленя кіравалася пачуццём доўгу, выконвала патрыятычны абавязак перад Радзімай. Гэтым кіраваліся дзеці школьнага ўзросту, калі станавіліся сувязнымі і разведчыкамі па просьбе бацькоў, якія з'яўляліся членамі падпольных груп. Дзеці дашкольнага ўзросту, якія не маглі свядома прыняць рашэнне пра свой удзел у супраціўленні, уцягваліся ў барацьбу па ініцыятыве бацькоў і выступалі для дарослых хутчэй у якасці фактара, які не так прываблівае ўвагу паліцыі. У сувязі з гэтым, абвастралася праблема адказнасці бацькоў за дзяцей, узрастанне рызыкі для жыцця апошніх. Дзеці па прычыне рэпрэсіўнай палітыкі акупантаў станавіліся заложнікамі ўдзелу дарослых у супраціўленні, падвяргаліся рэпрэсіям з боку фашыстаў разам з бацькамі. Нездарма гітлераўцы ўвялі і выкарыстоўвалі спецыяльны тэрмін "бандэн кіндэр" для вызначэння дзяцей партызан і падпольшчыкаў, тых дзяцей, што ўдзельнічалі ў антыфашысцкай барацьбе.

Для бацькоў малыя дзеці (малодшага школьнага ўзросту) былі памочнікамі. Дарослыя з дзецьмі, асабліва жанчыны, не так прываблівалі ўвагу паліцыі, карных органаў пры выкананні заданняў. Так, жонка магілёўскага падпольшчыка Ю. Мэтэ неаднаразова брала свайго сына-немаўлятку на заданне, захутвала дзіця ў прасцінкі і коўдру, паміж якімі знаходзіліся лістоўкі ці міны, і ішла на явачныя кватэры [292, с. 261]. Разам з тым, правал бацькоў, раскрыццё падпольнай сеткі азначалі і небяспеку для іх дзяцей. У лепшым выпадку яны маглі быць выкуплены і накіраваны ў дзіцячыя ўстановы, інакш іх расстрэльвалі разам з дарослымі. Так, ахвярамі нацыстаў сталі многія дзеці брэсцкіх падпольшчыкаў, сярод якіх В. Серафімовіч, В. Дацэвіч, Н. Вагенлейтнэр, Н. і С. Прохаравы (11- і 2-гадовыя), Л. і Г. Лабаковы, Э. Крашэннікаў [46, с. 196]. Па звестках даследчыцы А.А. Грабёнкінай, на станцыі Брэст-Палескі дзейнічала патрыятычная група з 43 чалавек, 23 з якіх былі расстраляны, у тым ліку 3 дзяцей; у партарганізацыі Мельнікава загінула 4 дзяцей, адным з якіх быў сын кіраўніка групы Юра [46, с. 124, 148, 215]. У дзіцячы прытулак г. Брэста з гарадской турмы трапілі 11-гадовая Н. Камсюк і яе 6-гадовы брат Глеб, дзеці падпольшчыцы А. Камсюк, жонкі афіцэра Чырвонай Арміі. Іх маці была расстраляна акупантамі ў турме [46, с. 47].

Фашысты выкарыстоўвалі розныя сродкі барацьбы з патрыётамі, у тым ліку захоп дзяцей як заложнікаў. Найбольш яскравы прыклад такога злачынства – расстрэл дзяцей М.Ф. Шмырова. Старэйшай Лізе было 14 гадоў, малодшаму Мішу – 3 гады. Іх узялі пад арышт 19 кастрычніка 1941 г., пратрымалі ў суражскай камендатуры да лютага

Витебский государственный технологический университет

1942 г. Калі стала зразумелым, што Шмыроў па дзяцей не прыйдзе, то іх расстралялі. У гэтым была асабістая трагедыя бацькі Міная: ён не змог дапамагчы дзецям, паколькі ведаў, што вораг не адпусціць жывымі ні яго, ні дзяцей [4, с. 18], а весці атрад на штурм умацаванага суражскага гарнізона было бессэнсоўна. У гады вайны абавязак перад Радзімай, абавязак камуніста аказваўся вышэйшым за бацькоўскія пачуцці. Вядомая падпольшчыца В. Харужая гаварыла ў сваіх успамінах, апублікаваных у 1959 г.: “Я должна оставить детей, потому что меня зовет война… И я это сделала. Нечеловеческая боль рвала мою душу, застилала пеленой глаза. Я люблю их [детей. – *В.Б.*] больше своей жизни, но я же не только мать, я коммунистка. За всех детей на свете отвечает коммунистка” [292, с. 178 – 179].

Не толькі бацькі рызыкавалі жыццём сваіх дзяцей. Падлеткі, якія былі задзейнічаны ў барацьбе, таксама ставілі пад удар свае сем’і, асабліва, калі больш ніхто з членаў сям’і не ўдзельнічаў у супраціўленні [288, с. 139].

Для гітлераўцаў факт узброенай і няўзброенай барацьбы дзяцей аказаўся нечаканым. Пра гэта сведчаць спецыяльныя пастановы пра ўстанаўленне крымінальнай адказнасці падлеткаў нараўне з дарослымі. У снежні 1941 г. генерал-лейтэнант 254-й германскай дывізіі фон Бешніт загадваў бургамістрам “о появляющихся чужих лицах, в особенности детях, немедленно сообщать местному коменданту, немедленно расстреливать всякое лицо, подозреваемое в шпионаже” [262, с. 250]. Вядомы загад “Аб барацьбе з бандамі” (ад 16.12.1942) абавязваў “применять любые средства, без ограничения, также против женщин и детей, если это только способствует успеху” [262, с. 347]. У справаздачах аб выніках правядзення карных аперацый супраць партызан і мясцовага насельніцтва вызначана такая катэгорыя, як “падазроныя ў бандытызме дзеці”. У ходзе адной з аперацый на тэрыторыі беларускага Палесся з 21 лютага па 20 красавіка 1943 г. былі захоплены ў палон дзеці ў колькасці 104 чалавекі, 58 з іх расстраляны і павешаны [238, арк. 161].

Нягледзячы на суровыя меры пакарання за супрацоўніцтва і дапамогу партызанам, дзеці ўсё роўна ішлі ў атрады, самастойна здабывалі зброю, каб быць залічанымі ў партызанскія шэрагі. Партызаны ўяўляліся дзецям мужнымі, адважнымі людзьмі, што не пабаяліся паўстаць супраць ворага. Яны і іх барацьба ў некаторай ступені рамантызаваліся. Многія падлеткі імкнуліся трапіць у партызаны: “Я как и все мальчишки и девчонки моего возраста [13 – 14 гадоў. – *В.Б.*] мечтала о борьбе с палачами, о мести им за все горе и страдания, причиненные нам” [79, арк. 1]. Натуральна, што вайна і звязаныя з ёй псіхалагічныя траўмы ўплывалі на асобу дзіцяці, на сістэму каштоўнасцяў і светаўспрыняцця. Побач з пачуццямі любові,

Витебский государственный технологический университет

павагі, гуманнасці ўзмацняюцца нянавісць, прага помсты, абясцэньванне чалавечага жыцця: “У гэты дзень Міхась упершыню за апошнія часы адчуў радасць: ён адпомсціў фашыстам” [257, с. 192]. Таму гераізм дзяцей, які так высока цаніўся ў краіне, быў адначасова і трагічным, бо ў шэрагу выпадкаў подзвіг здзяйсняўся цаной уласнага жыцця. Паняцце “чалавек” пераставала існаваць, яго замяніла паняцце “вораг”, “чужы”. Хаця камандзіры партызанскіх атрадаў імкнуліся абмежаваць удзел малых у дыверсіях ці ўзброеных аперацыях, давалі ім гаспадарчыя даручэнні, уступаць у адкрытае супрацьстаянне з ворагам усё ж прыходзілася. І забойствы пакідалі свой след у свядомасці дзіцяці: “Смерть человека от моей руки преследовала меня долго. Мне было тогда только 14 лет” [80, арк. 3]. Дзецям былі ўласцівыя натуральныя пачуцці, якія выходзілі на першы план ва ўмовах, што неслі пагрозу жыццю: “И я, отстреливаясь, вспомнил по-детски мать, отца, племянников, оставшихся дома” [81, арк. 4 зв.].

У барацьбе з партызанамі гітлераўцы выкарыстоўвалі не толькі рэпрэсіўныя метады. Яны практыкавалі вярбоўку падлеткаў у дыверсанты з наступнай засылкай іх у партызанскія атрады. У дакладзе кіраўніка СС і паліцыі ад 7 студзеня 1943 г. патрабавалася, каб для барацьбы з бандамі з ліку мясцовых жыхароў, у першую чаргу жанчын і дзяцей, вербаваліся асведамляльнікі для германскай арміі [182, арк. 33]. Так, гестапа арганізавала спецыяльныя курсы ў Сянно на 140 чал. для жанчын і дзяцей да 14 гадоў, у тым ліку безнадзорных з дзетдамоў [246, арк. 181]. Па дадзеных БШПР, фарміровачныя пункты для падрыхтоўкі шпіёнаў з выхаванцаў дзетдамоў існавалі таксама ў Магілёве, Быхаве, Рагачове [247, арк. 290 зв.], Мінску [248, арк. 35 зв.]. Падрыхтоўка праходзіла не толькі ў разведшколах, але і на спецыяльных курсах (адрозніваліся тэрмінам падрыхтоўкі) на працягу ўсяго перыяду акупацыі.

Для партызан дзеці-дыверсанты ўяўлялі крыніцу небяспекі, паколькі асноўнай мэтай іх дзейнасці было вызначэнне месцазнаходжання, асабовага складу атрада, яго баяздольнасці. Па справаздачах камандзіраў партызанскіх атрадаў можна меркаваць, што дзеці, якія не мелі бацькоў ці сваякоў у партызанскіх атрадах ці тых, хто мог за іх паручыцца, праходзілі спецыяльную праверку. Асаблівая ўвага звярталася на падлеткаў тады, калі падпольшчыкі перадавалі інфармацыю пра выпуск агентаў з разведшкол ці засылку спецыяльных груп у раён дыслакацыі партызанскіх фарміраванняў. Лёс такіх дзяцей пры іх раскрыцці быў розным: ад перасылкі ў савецкі тыл да прымянення смяротнага пакарання за здраду Радзіме да іх і іх сем’яў [248, арк. 35 зв.; 236, арк. 15].

Такім чынам, дзеці сталі аб’ектам маніпулявання з боку акупантаў, якія выкарыстоўвалі на сваю карысць бядотнае становішча



Витебский государственный технологический университет

дзяцей, а таксама факт сапраўднага масавага знаходжання дзяцей у партызанскіх шэрагах.

Ранняе сталенне дзяцей праявілася не толькі ў раўнапраўным з дарослымі ўдзеле ва ўзброенай і няўзброенай барацьбе (пра што сведчыць разнастайнасць форм супраціўлення), але і ў прыняцці ў камсамол тых, хто не дасягнуў 14-гадовага ўзросту, атрыманні дзяржаўных узнагарод за антыфашысцкую дзейнасць. Вядома, што ў гады вайны многія байцы як на фронце, так і ў партызанскіх атрадах перад заданнем пакідалі заявы аб прыняцці іх у камуністы. Такая ж з'ява была характэрна для піянераў і школьнікаў. Так, Дзем'яновіч В., 15-гадовы партызан, у сваёй заяве пісаў: "Я вступил в отряд, чтобы бить ненавистного врага. И если придется умереть, то хочу умереть со званием Ленинского комсомола!" [145, с. 199]. Прымалі ў камсамол часта нягледзячы на ўзрост, паколькі баявыя дасягненні падлеткаў, каму не было 14 гадоў, сведчылі, на думку камандзіраў партызанскіх атрадаў і кіраўнікоў камсамольскіх ячэек, пра іх палітычную і маральную спеласць. Напрыклад, у 13 гадоў у камсамол быў прыняты Г. Сабалеўскі, сувязны партызанскага атрада М. Зверава, члены піянерскай падпольнай арганізацыі "Піянерскі тайнік".

За баявыя заслугі і ўдзел у антыфашысцкай барацьбе дзеці, як і дарослыя, атрымлівалі дзяржаўныя ўзнагароды. Званне Героя Савецкага Саюза было пасмяротна прысвоена М. Казею (1927 г.н., БССР) у 1956 г. [290]. Не менш значнай узнагародай быў ордэн Чырвонай Зоркі (В. Пашкевіч, І. Ягораў, Ю. Нячаеў). Найбольш часта дзяцей узнагароджвалі медалямі "За адвагу", "За баявыя заслугі", "Партызану Айчыннай вайны" І і ІІ ступеняў, ордэн Айчыннай вайны І і ІІ ступеняў. Неабходна адзначыць, што захаванне сцягоў піянерскіх дружын дзецьмі ў час вайны параўноўвалася з подзвігам. Так, М. Галафаева за захаванне сцяга Добрушскай піянерскай арганізацыі была ўзнагароджана Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ.

Разгледзеўшы асноўныя накірункі і формы антыфашысцкай барацьбы дзяцей, зробім некаторыя абагульненні:

1. Падобных прыкладаў масавага ўдзелу дзяцей у барацьбе з ворагам да гэтага не мелася у гісторыі. Па афіцыйных дадзеных, у шэрагах партызан змагалася 25 тыс. падлеткаў, яшчэ каля 5,5 тыс. дашкольнікаў і малодшых школьнікаў знаходзіліся пад іх абаронай. Тым не менш, адлюстраваная вышэй статыстыка далёка не поўная. Многія дзеці не ўключаліся ў спісы асабовага складу атрадаў, падпольных груп, не пражывалі пастаянна на тэрыторыі партызанскіх зон, але выконвалі функцыі сувязных, разведчыкаў, збіральнікаў інфармацыі.

2. Асноўную ўзроставую групу дзяцей, што знаходзіліся ў партызанскіх атрадах і былі задзейнічаны ва ўзброенай барацьбе,

Витебский государственный технологический университет

складалі тыя, хто нарадзіўся ў 1927 – 1928 гг. Менавіта іх у першую чаргу бралі на баявыя заданні, выкарыстоўвалі ў якасці разведчыкаў, сувязных, падрыўнікоў. Працэнт дзяцей-партызан да 16 гадоў быў меншы, чым 16-18-гадовых. Так, дзяўчын-партызанак да 16 гадоў было 2,89 % ад агульнай колькасці партызан, а ад 16 да 18 гадоў – ужо 17,88 % [256, с. 69]. Дзеці малодшага школьнага, дашкольнага ўзросту знаходзіліся ў сямейных лагерах, выконвалі гаспадарчыя даручэнні, хаця былі выпадкі іх удзелу ў дыверсіях.

3. Вайна і антыфашысцкая барацьба дзяцей абумовілі іх ранняе сталенне як у псіхічным, так і ў фізічным плане. Па ўспамінах былога юнага партызана У. Малея ”каждый день для нас был равен году жизни. Мы сражались наравне со взрослыми, теряли друзей, терпели голод и холод. И вместе со старшими приближали Победу” [2, с. 21]. У пасляваенным жыцці ўдзел у вайне стаў для іх і справай жыцця, як для франтавікоў, і адначасова тым, што пазбавіла іх дзяцінства.

* * *

Барацьба з акупантамі патрабавала напружання ўсіх сіл краіны і яе грамадзян. Дзеці, якія не засталіся ў баку ад руху супраціўлення ў гады Вялікай Айчыннай вайны, прымалі самы актыўны ўдзел у дзейнасці падполля і партызан, стваралі свае падпольныя піянерскія атрады. У рамках узброенай барацьбы дзеці ўдзельнічалі ў баявых аперацыях і дыверсіях, няўзброенае супраціўленне рэалізоўвалася праз збор зброі, выкананне функцый сувязных і разведчыкаў, распаўсюджанне нелегальнай літаратуры, лістовак, агітацыйную дзейнасць. Выкананне гаспадарчых даручэнняў, праца, якую выконвалі дзеці ў партызанскіх зонах і сямейных лагерах па забеспячэнні жыццядзейнасці яго насельніцтва і партызан, таксама адносіцца да адной з форм няўзброенага супраціўлення акупантам. Ва ўсіх пералічаных выпадках падрастаючае пакаленне аказвала істотную дапамогу дарослым. Уклад дзяцей у Перамогу быў прызнаны і дзяржавай: 37 тыс. юнакоў і дзяўчат былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі за ўдзел у барацьбе з ворагам.

У гады вайны змянілася сацыяльнае становішча дзяцей. Яны сталі паўнапраўнымі членамі дарослага грамадства (выступалі ў якасці працоўнай адзінкі з 12 гадоў, атрымлівалі поўную норму хлеба ў выпадку гібелі бацькоў), самастойна забяспечвалі свае сем’і (у шэрагу выпадкаў з’яўляліся адзінай крыніцай забеспячэння). Дзеці аказаліся ў становішчы неадпаведнасці статуса, які ў даваенным грамадстве адпавядаў статусу школьніка і піянера, і ролі: былі яшчэ дзецьмі, але ўжо выконвалі функцыі дарослых. Такая неадпаведнасць непасрэдна ўплывала на іх ранняе сталенне, у першую чаргу ў псіхічным плане. Сяброўства сярод дзяцей, узаемападтрымка, чуласць дарослых сталі той



Витебский государственный технологический университет

асновай, на якой фарміраваліся даверлівыя адносіны дзяцей да акаляючага свету.

Клопат пра дзяцей праяўляла дзяржава праз падпольныя органы і партызанскае камандаванне: арганізоўваўся вываз у савецкі тыл, ствараліся (у партызанскіх зонах) дзіцячыя ўстановы і апекаваліся тыя, што знаходзіліся на падкантрольнай нацыстам тэрыторыі, захоўвалі савецкія школьныя традыцыі. Школьная і пазашкольная дзейнасць садзейнічала сацыялізацыі дзяцей у грамадства, што жыло па законах вайны, пераадоленню атрыманых псіхічных траўм. Прыцягненне падрастаючага пакалення да ўдзелу ў жыцці лагера акрэслівала мэту яго штодзённага існавання, садзейнічала працоўнаму навучанню падрастаючага пакалення і адначасова пакрывала недахоп дарослых працоўных рук, якія былі заняты ў барацьбе з ворагам.

Витебский государственный технологический университет

## Заключэнне

